ПОСТАНОВЛЕНИЕ МИНИСТЕРСТВА ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
27 июля 2017 г. № 92

Об утверждении учебных программ по учебным предметам для VIII, IX классов учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования

В соответствии с частью первой пункта 12 статьи 167 Кодекса Республики Беларусь об образовании Министерство образования Республики Беларусь ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Утвердить прилагаемые:

1.1. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.2. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.3. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для VIII класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.4. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература» для VIII класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.5. Учебную программу по учебному предмету «Иностранный язык (английский, немецкий, французский, испанский, китайский)» («Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.6. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.7. Учебную программу по учебному предмету «Информатика» («Інфарматыка») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.8. Учебную программу по учебному предмету «Всемирная история» («Сусветная гісторыя») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.9. Учебную программу по учебному предмету «История Беларуси» («Гісторыя Беларусі») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.10. Учебную программу по учебному предмету «География» («Геаграфія») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.11. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.12. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.13. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.14. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение (технический труд)» («Працоўнае навучанне (тэхнічная праца)») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.15. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение (обслуживающий труд)» («Працоўнае навучанне (абслуговая праца)») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.16. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» («Фізічная культура і здароўе») для VIII класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.17. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.18. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.19. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для IX класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.20. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература» для IX класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.21. Учебную программу по учебному предмету «Иностранные языки: английский, немецкий, французский, испанский, китайский» («Замежныя мовы: англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.22. Учебную программу по учебному предмету «Математика» («Матэматыка») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.23. Учебную программу по учебному предмету «Информатика» («Інфарматыка») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.24. Учебную программу по учебному предмету «Всемирная история» («Сусветная гісторыя») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.25. Учебную программу по учебному предмету «История Беларуси» («Гісторыя Беларусі») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.26. Учебную программу по учебному предмету «География» («Геаграфія») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.27. Учебную программу по учебному предмету «Биология» («Біялогія») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.28. Учебную программу по учебному предмету «Физика» («Фізіка») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.29. Учебную программу по учебному предмету «Химия» («Хімія») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.30. Учебную программу по учебному предмету «Обществоведение» («Грамадазнаўства») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.31. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение (технический труд)» («Працоўнае навучанне (тэхнічная праца)») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.32. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение (обслуживающий труд)» («Працоўнае навучанне (абслуговая праца)») для IX класса

учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.33. Учебную программу по учебному предмету «Черчение» («Чарчэнне») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания;

1.34. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» («Фізічная культура і здароўе») для IX класса учреждений общего среднего образования с русским (белорусским) языком обучения и воспитания.

2. Признать утратившими силу абзацы второй–четвертый, восемнадцатый – тридцать девятый приказа Министра образования Республики Беларусь от 22 августа 2012 г. № 663 «Об утверждении учебных программ для учреждений общего среднего образования».

3. Настоящее постановление вступает в силу через 15 рабочих дней после его подписания.

Министр **И.В.Карпенко**

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па беларускай мове падрыхтавана ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская мова». Асноўныя палажэнні Канцэпцыі грунтуюцца на тым, што беларуская мова з’яўляецца адной з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь і каштоўным сацыяльна-культурным скарбам нацыі.

Ва ўстановах адукацыі беларускую мову трэба вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі. Неабходна так наладжваць працэс навучання, каб адным з галоўных напрамкаў у працы настаўніка стала фарміраванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека. Патрэбна дапамагаць вучням назапашваць навыкі, неабходныя для самаадукацыі, самапазнання і выхавання, вучыць карыстацца імі ў штодзённым жыцці. У сістэме ўсіх навук надзвычай важнае значэнне мае логіка-лінгвістычны кампанент. Менавіта ён забяспечвае функцыянаванне навукі ў грамадстве. Хоць кожная з яе галін і мае сваю ўласную мову (слоўнікі, алфавіты, паняцці, тэрміны, формулы выражэння сэнсу), аднак усё гэта дапаўняецца і суправаджаецца ў практыцы навучання словам. А гэта азначае, што беларуская мова з’яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання.

Вывучэнне беларускай мовы не можа абмяжоўвацца запатрабаваннямі асобы ў лінгвістычных ведах, азнаямленнем вучняў з моўнымі адзінкамі і законамі. Абавязак устаноў адукацыі – навучыць сваіх выхаванцаў карыстацца беларускім словам, дапамагчы ім авалодаць маўленчай этыкай і культурай. Вучням трэба даць такую лінгвістычную адукацыю, якая дапаможа ім не толькі граматычна правільна ствараць і афармляць свае вусныя і пісьмовыя паведамленні, але выбіраць з багатага арсеналу выяўленчых моўных

сродкаў самыя трапныя, самыя дасканалыя і пераканальныя. У сувязі з гэтым неабходна штодзённа ўдасканальваць маўленчую практыку вучняў, якая наладжваецца ў форме гутаркі, пісьма, чытання, публічных выступленняў, слухання радыё- і тэлеперадач, вучэбных лекцый, дакладаў, паведамленняў. Гэтым сцвярджаецца думка, што да маўлення трэба падыходзіць як да адной з формаў пазнавальнай дзейнасці чалавека, спосабу яго грамадскай актыўнасці, сродку сацыялізацыі.

Менавіта на вырашэнне гэтых і іншых задач скіраваны змест і будова праграмы па беларускай мове. Адметнай яе асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў цэнтры ўвагі – вучань як суб'ект, зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і правіл карыстання ёй; яго запатрабаванні ў сферы маўлення як форме грамадскай дзейнасці і спосабе праяўлення ўласнай жыццёвай актыўнасці.

Мэта вывучэння прадмета «Беларуская мова» – сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне, навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіваць камунікатыўную, духоўна-маральную, грамадзянскую і мастацка-эстэтычную культуру вучняў.

Задачы:

засваенне сістэмы мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу), заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці (*моўная і маўленчая кампетэнцыі*);

фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (*маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя*);

усведамленне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы, валоданне нормамі маўленчага этыкету, культурай міжнацыянальных зносін; развіццё сродкамі мовы камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў (*лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі*).

Працэс развіцця асобы вучня пры навучанні беларускай мове павінен быць узаемазвязаным і садзейнічаць рэалізацыі наступных напрамкаў: ***моўнага*** (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), ***маўленчага*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), ***камунікатыўнага*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў), ***рытарычнага*** (авалоданне рознымі відамі публічных выступленняў, адпаведнымі рытарычнымі прыёмамі і сродкамі, якія забяспечваюць эфектыўныя зносіны), ***лінгвакультуралагічнага*** (усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры), ***сацыякультурнага*** (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў).

Навучанне беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага і сацыякультурнага падыходаў пры выкладанні ўсіх тэм і раздзелаў.

Сучасная адукацыя скіравана на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і

навыкі для рашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. Вынікам развіцця функцыянальнай пісьменнасці з'яўляецца авалоданне вучнямі сістэмай ключавых кампетэнцый, якія дазволяць эфектыўна прымяняць веды, уменні і навыкі ў практычнай дзейнасці, паспяхова выкарыстоўваць іх у працэсе сацыяльнай адаптацыі. Любы тып кампетэнцыі не фарміруецца без ведаў (каб умець, трэба ведаць), аднак веды самі па сабе не з'яўляюцца самакаштоўнасцю (веды па-за практычнай дзейнасцю, не скіраваныя на асобаснае развіццё чалавека, ператвараюцца ў дагматызм – аднабаковае, схематычнае мысленне). Сучасная адукацыя імкнецца пераарыентавацца з пазіцыі «ведаць, каб памятаць» на пазіцыю *«ведаць, каб умець і дзейнічаць».* У гэтым агульная сутнасць *кампетэнтнаснага падыходу.*

У адносінах да моўнай адукацыі кампетэнтнасны падыход звязаны з фарміраваннем у вучняў моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, рытарычнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый.

Сістэмна-функцыянальны падыход забяспечвае засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыю моўнага матэрыялу для авалодання *моўнай кампетэнцыяй.*

Вядома, што задачы навучання мове нельга зводзіць да апісання сістэмных адзінак і з'яў розных моўных узроўняў. Неабходна так наладжваць навучальны працэс, каб вучні асэнсоўвалі кожную моўную адзінку, арыентуючыся на асаблівасці яе ўжывання ў маўленні. Менавіта пры такім падыходзе можна забяспечыць асэнсаванне цеснай узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці ўсіх аспектаў і ўзроўняў моўнай сістэмы: фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу і стылістыкі. Такі падыход накіроўвае на тое, каб вучні:

на ўроках мовы не абмяжоўваліся аналізам моўных фактаў і з'яў, а шмат увагі аддавалі сінтэзу – складанню сказаў рознай будовы і функцыянальнага прызначэння, стварэнню звязных выказванняў;

пры вывучэнні марфалогіі вызначалі, якую сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю выконвае тая ці іншая часціна мовы; вучыліся адрозніваць часціны мовы і іх формы на аснове склонавых і сінтаксічных пытанняў;

сістэматычна і паслядоўна фарміравалі і развівалі арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход дае магчымасць рэальна забяспечыць дзейнасць вучняў у розных маўленчых сітуацыях, што з'яўляецца асновай фарміравання *маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.*

У сувязі з гэтым на першы план у моўнай падрыхтоўцы вучняў выходзіць удасканаленне іх маўленчай практыкі, якая наладжваецца ў форме суразмоўніцтва, пісьма, чытання, пераказу і абмеркавання радыё- і тэлеперадач, вучэбных лекцый, дакладаў, паведамленняў.

Рытарычны падыход накіраваны на фарміраванне ў вучняў ведаў аб правілах маўленчых зносін, авалоданне дыялагічнымі і маналагічнымі сродкамі маўленчага майстэрства, спосабамі ўзаемаразумення і г.д. і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *рытарычнай кампетэнцыі*.

Лінгвакультуралагічны падыход звязаны з усведамленнем мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі*.

Сацыякультурны падыход накіраваны на асэнсаванне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін, фарміраванне нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, выхаванне каштоўнасных адносін да беларускай мовы і культуры, павагі да культурных каштоўнасцей народаў свету і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *сацыякультурнай кампетэнцыі*.

Асноўныя прынцыпы адбору зместу навучання беларускай мове:

сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання ўсіх узроўняў моўнай сістэмы (фанетыка, лексіка, фразеалогія, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія, сінтаксіс, арфаграфія, пунктуацыя) і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню (роля, якую яны выконваюць у маўленні);

прынцып мінімізацыі моўнага і маўленчага тэарэтычнага матэрыялу патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач моўнай адукацыі;

камунікатыўна-рытарычны прынцып азначае, што працэс навучання патрэбна забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып тэкстацэнтрызму мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту: тэкст разглядаецца ў якасці мэты (камунікатыўныя ўменні пададзены ў мэце навучання), зместу (вучні авалодваюць уменнямі ствараць тэксты розных тыпаў, стыляў і жанраў) і выніку навучання (авалоданне мовай як сродкам зносін).

Лінгвістычны матэрыял падаецца ў праграме лінейна: у V класе вывучаюцца фанетыка і арфаэпія, графіка і арфаграфія, лексіка і фразеалогія; у VI класе – склад слова і словаўтварэнне, назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, у VII – дзеяслоў і яго формы (дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе), прыслоўе, службовыя часціны мовы і выклічнік. Сістэматычны курс сінтаксісу з'яўляецца прадметам вывучэння ў VIII–IX класах. Аднак першапачатковыя звесткі пра сінтаксіс і пунктуацыю ўводзяцца ўжо ў V класе. Гэта дазваляе на практыцы забяспечыць рэалізацыю такога метадычнага прынцыпу, як вывучэнне марфалогіі на сінтаксічнай аснове (пры вывучэнні часцін мовы выяўляецца іх сінтаксічная функцыя ў сказе). Акрамя таго, задоўга да вывучэння сістэматычнага курса сінтаксісу і пунктуацыі вучні знаёмяцца з асноўнымі сінтаксічнымі паняццямі, што дазваляе фарміраваць у іх пунктуацыйныя ўменні і навыкі, развіваць і ўдасканальваць граматычны лад маўлення, вучыць складаць словазлучэнні рознай будовы, сказы, тэксты і карыстацца імі ў практычнай маўленчай дзейнасці.

У кожным класе прадугледжваюцца ўводныя ўрокі, якія раскрываюць ролю і значэнне беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Гэтыя ўрокі даюць магчымасць фарміраваць лінгвістычны светапогляд і ствараюць эмацыянальны настрой, што садзейнічае павышэнню цікавасці да прадмета і паспяховага яго вывучэння. Веды, атрыманыя на гэтых уроках, падагульняюцца і сістэматызуюцца ў раздзеле «Агульныя звесткі пра мову», які завяршае сістэматычны курс беларускай мовы ў XI класе.

Значнае месца ў праграме адводзіцца паўтарэнню вывучанага. У V класе раздзел «Паўтарэнне вывучанага ў I–IV класах», з'яўляючыся неабходным звяном паміж I і II ступенямі агульнай сярэдняй адукацыі, скіраваны на вырашэнне наступных задач: узнавіць і актуалізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды, уменні і навыкі, набытыя ў пачатковых класах; у межах магчымага выявіць і ліквідаваць недахопы.

Работа па развіцці маўлення арганізуецца на кожным уроку, пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай мовы. Асобныя гадзіны на развіццё маўлення па гэтай прычыне не выдзяляюцца. Праграма адводзіць асобныя гадзіны толькі на пісьмовыя работы (напісанне пераказаў, перакладаў, сачыненняў, розных відаў дыктантаў).

У адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да моўнай і маўленчай падрыхтоўкі вучняў узмоцнена маўленчая накіраванасць курса беларускай мовы. Пры гэтым маўленчая тэорыя (маўленчыя паняцці: тэкст і яго будова, тып, стыль і жанр маўлення) набліжана да патрабаванняў практыкі, яна з'яўляецца асновай для свядомага фарміравання ўменняў і навыкаў камунікацыі. Апора на маўленчыя паняцці і правілы маўленчых паводзін садзейнічае свядомаму ўдасканаленню вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, павышэнню культуры маўленчых паводзін.

Вывучэнне сінтаксісу ў VIII–IX класе наладжваецца на аснове структурна-семантычнага падыходу, адметнай асаблівасцю якога з'яўляецца тое, што пры аналізе

моўных з’яў прымаецца пад увагу не адзін які-небудзь аспект, а некалькі. Найважнейшымі з іх з’яўляюцца будова, значэнне і функцыя.

Шмат увагі надаецца выпрацоўцы ўменняў, неабходных для таго, каб тая ці іншая моўная з’ява выкарыстоўвалася ў маўленчай практыцы. Пры такой арганізацыі навучання галоўным дыдактычным матэрыялам з’яўляюцца тэксты, на аснове якіх вырашаюцца задачы, накіраваныя на засваенне нормаў літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачаецца слоўнік вучняў, забяспечваецца іх выхаванне і развіццё. Выбар тэксту як дыдактычнай адзінкі стварае сінтаксічную аснову вывучэння моўных з’яў, якія па-за тэкстам не могуць раскрыць сваіх функцыянальных магчымасцей. Толькі ўступаючы ў граматыка-семантычныя адносіны ў тэксце, моўныя адзінкі здольныя перадаць змест выказвання. Тэкст на ўроках мовы з’яўляецца сродкам удасканалення камунікатыўных здольнасцей вучняў, забяспечвае магчымасць для развіцця маўленчых навыкаў слухання і разумення, чытання, гаварэння і пісьма.

Асноўная частка праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (тэарэтычны матэрыял), аперацыйнага (спосабы дзейнасці) і практычнага (уменні і навыкі), што ў сукупнасці і складае змест навучання.

(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень;
з іх 10 гадзін – на пісьмовыя работы)

Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры
(1 гадзіна)

Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах
(2 гадзіны)

Тэкст як сэнсава-граматычнае адзінства. Стылі і тыпы маўлення (паглыбленне).

Чытанне тэкстаў, вызначэнне іх тэмы, адрасата, мэтанакіраванасці і стылістычнай прыналежнасці.

Самастойныя і службовыя часціны мовы. Правапіс **не (ня), ні** з рознымі часцінамі мовы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Называць асноўныя прыметы тэксту, вызначаць яго стыль і тып. Выяўляць у тэксце самастойныя і службовыя часціны мовы, рабіць іх марфалагічны разбор, правільна ўжываць у маўленні.

Сінтаксіс і пунктуацыя
(1 гадзіна)

Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне
(4 гадзіны)

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Граматычнае значэнне словазлучэння (азнаямленне). Віды падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Непадзельныя словазлучэнні.

Класіфікацыя словазлучэнняў. Разгортванне словазлучэнняў, іх выкарыстанне пры апісаннях прадметаў, людзей, з’яў. Пераклад сказаў (тэкстаў) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі.

Паглыбленне вывучанага пра навуковы і афіцыйны стылі маўлення.

Вызначэнне апорных словазлучэнняў у тэкстах, выяўленне іх сэнсава-стылістычнай ролі.

Пераказ тэксту навуковага стылю з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Знаходзіць словазлучэнні ў тэксце; выяўляць галоўнае слова, групаваць словазлучэнні паводле будовы і значэння; ствараць і разгортваць словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі; перакладаць сказы (тэксты) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі; адрозніваць свабодныя словазлучэнні ад несвабодных; дакладна перадаваць змест прачытанага тэксту з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў, выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў.

ПРОСТЫ СКАЗ

Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(19 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Сказ як сінтаксічная адзінка, яго асноўная функцыя. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя сказы). Простыя і складаныя сказы. Развітыя і неразвітыя сказы.

Парадак слоў у сказе. Лагічны націск.

Чытанне маналагічных і дыялагічных тэкстаў; падзел дэфармаваных тэкстаў на сказы, вызначэнне тыпу сказаў па мэце выказвання і інтанацыі. Вызначэнне межаў сказаў.

Знаходжанне сказаў, якія выражаюць галоўную думку ў тэксце, і тых, якія яго паясняюць.

Падрыхтоўка паведамлення на маральна-этычную тэму на аснове дзвюх-трох крыніц.

Кантрольны дыктант.

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, сэнсава-граматычныя адносіны паміж імі.

Спосабы выражэння дзейніка. Спосабы выражэння выказніка (простага дзеяслоўнага, састаўнога дзеяслоўнага і састаўнога іменнага). Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным словазлучэннем. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў.

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць, іх граматычнае значэнне. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння.

Перабудова неразвітых двухсастаўных сказаў у развітыя.

Паглыбленне паняцця пра паслядоўную і паралельную сувязь сказаў у тэксце.

Чытанне і аналіз мастацкіх тэкстаў, вызначэнне ў іх сродкаў эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці; спосабаў і сродкаў сувязі частак і сказаў. Складанне двухсастаўных развітых сказаў на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій; напісанне тэкстаў на аснове складзеных сказаў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць двухсастаўныя неразвітыя сказы ў тэкстах; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных неразвітых сказаў.

Дзяліць дэфармаваны тэкст на сказы і абазначаць іх межы; вызначаць сказы, якія выражаюць галоўную думку ў тэксце, і тыя, якія яго паясняюць; правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы.

Адрозніваць развітыя сказы ад неразвітых, вызначаць мэтазгоднасць ужывання іх у тэксце; знаходзіць галоўныя і даданыя члены сказа; характарызаваць найбольш пашыраныя спосабы выражэння дзейніка і выказніка, вызначаць простыя дзеяслоўныя, састаўныя дзеяслоўныя і састаўныя іменныя выказнікі; ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных развітых сказаў.

Правільна далучаць выказнік да дзейніка; пераказваць змест радыё- і тэлеперадач. Складаць двухсастаўныя развітыя сказы на тэмы, звязаныя з працай людзей розных

прафесій, аб'ядноўваць іх у тэксты з дапамогай паслядоўнай і паралельнай сувязі; вызначаць у тэкстах сродкі эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці.

Рыхтаваць паведамленні на маральна-этычную тэму на аснове дзвюх–трох крыніц.

Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(5 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Аднасастаўныя сказы, іх віды: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, назыўныя сказы (азнаямленне).

Паглыбленне паняцця пра публіцыстычны стыль.

Знаходжанне ў тэкстах аднасастаўных развітых і неразвітых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання. Замена двухсастаўных сказаў сінанімічнымі аднасастаўнымі. Пераклад з рускай мовы на беларускую мастацкага тэксту з апісаннем з'яў прыроды.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту з дадатковымі заданнямі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы, адрозніваць іх па асноўных прыметах; ствараць вусныя і пісьмовыя разважанні з ужываннем аднасастаўных сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор аднасастаўных сказаў.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты з апісаннем з'яў прыроды; падрабязна пераказваць тэксты.

Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(2 гадзіны)

Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе.

Параўнальны аналіз маналагічных і дыялагічных тэкстаў, вызначэнне сродкаў моўнай выразнасці.

Абмеркаванне пэўнай падзеі ў форме дыялогу.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах няпоўныя сказы, вызначаць іх будову, мэтазгоднасць ужывання; адрозніваць няпоўныя двухсастаўныя сказы ад поўных аднасастаўных; карыстацца няпоўнымі сказамі ў маналагічным і дыялагічным маўленні; рабіць сінтаксічны разбор няпоўных сказаў; афармляць няпоўныя сказы на пісьме ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

УСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне

(9 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Паняцце пра ўскладнены сказ. Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, знакі прыпынку.

Паглыбленне паняцця пра апісанне як тып маўлення.

Чытанне і аналіз тэкстаў з апісаннямі. Вызначэнне ў іх сэнсава-стылістычнай ролі сказаў з аднароднымі членамі, у тым ліку з абагульняльнымі словамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання.

Водгук на празаічны або вершаваны твор.

Кантрольны дыктант.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вызначаць сказы з аднароднымі членамі, звязанымі спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі, у тым ліку сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, правільна афармляць іх на пісьме; выкарыстоўваць сказы з

аднароднымі членамі пры стварэнні пісьмовых тэкстаў; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з аднароднымі членамі.

Пісаць водгук на празаічны або вершаваны твор.

Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне

(8 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, устаўныя канструкцыі; знакі прыпынку.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту з дадатковымі заданнямі.

Чытанне лістоў знакамітых людзей, знаходжанне сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі. Вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання.

Напісанне віншаванняў, афіцыйных пісьмаў і сяброўскіх лістоў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вызначаць сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, правільна інтанаваць іх, ужываць пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў розных стыляў, афармляць на пісьме; карыстацца пабочнымі словамі як сродкам сувязі сказаў і частак тэксту; рабіць сінтаксічны разбор сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі і выклічнікамі.

Пераказваць апавядальныя тэксты з элементамі разважання; пісаць лісты, у тым ліку афіцыйныя пісьмы.

Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне

(13 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Паняцце пра адасабленне. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні.

Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, знакі прыпынку.

Аналіз і пераказ мастацкіх тэкстаў на гістарычную тэму. Вызначэнне сэнсава-стылістычнай ролі адасобленых членаў сказа, абгрунтаванне мэтазгоднасці іх ужывання. Выяўленне ў іх апісання гістарычнай падзеі. Пераклад з рускай мовы на беларускую мову тэкстаў гістарычнай тэматыкі з элементамі апісання.

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі, знакі прыпынку.

Сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры).

Кантрольная тэставая работа.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах сказы з адасобленымі членамі, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з адасобленымі членамі. Карыстацца сказамі з адасобленымі членамі ў вусных і пісьмовых выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую мову тэксты гістарычнай тэматыкі; ствараць сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры).

Сказы з параўнальнымі зваротамі

(2 гадзіны)

Параўнальны зварот. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.

Выяўленне ў сказах і тэкстах параўнальных зваротаў, вызначэнне іх ролі ў маўленні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вызначаць сказы з параўнальнымі зваротамі, ужываць іх пры стварэнні вусных і пісьмовых выказванняў, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; адрозніваць параўнальныя звароты ад аманімічных сінтаксічных канструкцый.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(2 гадзіны)

Рэзервовыя гадзіны
(2 гадзіны)

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацаваны ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Навучанне беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмнага, аксіялагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага, культуралагічнага і культуратворчага падыходаў пры выкладанні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай літаратуры.

Ва ўмовах рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў сучаснай адукацыі вынікам дасягнення мэт і задач літаратурнай адукацыі становяцца прадметныя кампетэнцыі: *літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, маўленчая, камунікатыўная, культуралагічная і культуратворчая.* Рэалізацыя такога падыходу прадугледжвае ўзмацненне дзейнасна-практычнага кампанента літаратурнай адукацыі.

Сістэмны падыход забяспечвае засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру як сістэму, сфарміраваных у выглядзе паняццяў і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці, што з’яўляецца асновай фарміравання *літаратурнай кампетэнцыі*.

Такі падыход накіроўвае на тое, каб вучні:

на ўроках беларускай літаратуры сістэматычна і паслядоўна авалодвалі гісторыка- і тэарэтыка-літаратурнымі ведамі [веды па тэорыі літаратуры – мастацкі твор, яго структура, сістэма вобразаў, аўтарская пазіцыя і інш.; тыпы літаратурнай творчасці (паэзія, проза); літаратурныя роды і жанры; асноўныя мастацкія кірункі і плыні і інш.];

[веды гісторыка-літаратурныя – звесткі пра шляхі і галоўныя этапы развіцця беларускай літаратуры ва ўзаемасувязі з сусветнай, найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, пра гісторыю напісання твораў і інш.];

ажыццяўлялі чытацкую дзейнасць – чытанне мастацкіх твораў, вало

данне тэхнікай і культурай чытання, неабходнай для ўспрымання, аналізу і інтэрпрэтацыі мастацкага твора; логіка-паняційная, аналітыка-сінтэтычная і ацэначная дзейнасць, накіраваная на індывідуальна-асобаснае прачытанне, успрыманне і засваенне мастацкага твора, яго родава-жанравых, кампазіцыйных асаблівасцей, маральна-эстэтычных вартасцей, грамадскага значэння, сувязі з эпохай.

Аксіялагічны падыход прадугледжвае фарміраванне ў вучняў сродкамі беларускай літаратуры сістэмы духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, гуманістычнага погляду на свет, выхаванне павагі да агульначалавечых культурных каштоўнасцей і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі*.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход вызначае такую накіраванасць зместу навучання, пры якой засваенне яго адбываецца шляхам фарміравання ўсіх структурных кампанентаў маўленча-камунікатыўнай дзейнасці, і вучань разглядаецца як суб'ект дзейнасці і зносін, што з'яўляецца асновай фарміравання *маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый.*

Выхаванне маўленчай культуры, фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў, што забяспечваюць эфектыўнасць зносін у розных сферах чалавечай дзейнасці, – неабходная ўмова сацыялізацыі навучэнцаў. Развітое маўленне вучня – шлях да актыўнага самавыражэння і прызнання маўленчай асобы як у міжсуб'ектнай камунікацыі (у штодзённых стасунках з бацькамі, сябрамі, знаёмымі), так і ў дзелавой сферы (пры стварэнні вучэбных выказванняў на абсалютнай большасці ўрокаў па розных прадметах; у далейшай прафесійнай дзейнасці тых выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія стануць прадстаўнікамі шэрага спецыяльнасцей з павышанай камунікатыўнай адказнасцю – сфера дзейнасці «чалавек – чалавек»).

У адносінах да літаратурнай адукацыі камунікатыўна-дзейнасны падыход звязаны з самавыяўленнем вучняў у розных відах маўленчай практыкі, авалоданнем імі жанрамі мастацкай літаратуры (казка, загадка, верш, байка, невялікая п'еса, пейзажныя і партрэтныя замалёўкі; пераклады мастацкіх тэкстаў); публіцыстычнымі жанрамі (нататка ў газету, інтэрв'ю, рэпартаж, водгук, рэцэнзія на прачытаны літаратурны твор, на твор жывапісу, музыкі, кінафільм або тэлеперадачу); літаратурна-крытычнымі жанрамі (праблемнае сачыненне, прадмова / пасляслоўе да прачытанай кнігі, анатацыя, эсэ, даклад, рэферат на літаратурную тэму); вучэбна-традыцыйнымі жанрамі (характарыстыкі – індывідуальныя, параўнальныя, групавыя – літаратурных герояў, сачыненні на літаратурную тэму, сачыненні на аснове асабістых назіранняў, уражанняў, разважанняў аб розных з'явах жыцця).

Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення рэалізуецца праз разнастайнасць метадычных формаў і прыёмаў, захаванне сістэматычнасці, пераемнасці і практычнай накіраванасці гэтай працы ў розных узроставых групах.

Культуралагічны падыход звязаны з усведамленнем вучнямі літаратуры як феномена культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай літаратуры ў адзінстве з сусветнай мастацкай культурай, прадугледжвае развіццё здольнасці карыстацца культуразнаўчай інфармацыяй для патрэб камунікацыі і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *культуралагічнай кампетэнцыі.*

Мэтай і вынікам рэалізацыі ў навучанні літаратуры *культуратворчага падыходу* з'яўляецца *культуратворчая кампетэнцыя*. Фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі вучняў у працэсе навучання беларускай літаратуры – гэта фарміраванне не асобных базавых ведаў, літаратурна-творчых уменняў і навыкаў, а сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, г. зн. навучанне ў дзейнасці праз уключэнне ў гэтую дзейнасць. Адукацыйны працэс трэба наладжваць так, каб на кожным уроку пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм вучэбнага прадмета «Беларуская

літаратура» вучні авалодвалі вопытам літаратурна-творчай дзейнасці. Рэалізацыя гэтай задачы адбываецца праз шырокае выкарыстанне відаў прадметна-творчай дзейнасці, якія рэалізуюць практыка-арыентаваны характар літаратурнай адукацыі. Вучэбны матэрыял, звязаны з фарміраваннем культуратворчай кампетэнцыі, пададзены ў раздзелах «Асноўныя віды вучэбнай дзейнасці вучняў па літаратуры» і «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Аснову зместу беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета складаюць чытанне і тэкстуальнае вывучэнне высокамастацкіх твораў нацыянальнай класікі і вядомых майстроў слова. Гэтыя творы вызначаюцца багатым пазнавальным і выхаваўчым патэнцыялам, з'яўляюцца даступнымі для вучняў пэўнага ўзросту. Цэласнае ўспрыманне і разуменне літаратурных твораў, фарміраванне ўменняў аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі тэкст магчыма толькі пры адпаведнай эмацыянальна-эстэтычнай рэакцыі чытача.

Курс V класа ў сістэме адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі навучэнцаў займае асобае месца як пераходны ад пачатковага этапа навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне).

Прапедэўтычны курс літаратуры мае на мэце сфарміраваць у вучняў уяўленне пра літаратуру як чалавеказнаўства і як мастацтва слова, якому ўласцівыя адметныя спосабы вобразнага адлюстравання жыцця. Усведамленне вучнямі чалавеказнаўчага аспекту літаратуры – пазнання свету і чалавека праз мастацкае, эстэтычнае іх адлюстраванне і ўспрыманне, праз маральна-эстэтычную ацэнку рэчаіснасці, жыццёвых з'яў і падзей – асноўнае ў курсе літаратуры V класа. Галоўным аб'ектам на ўроку літаратуры з'яўляецца мастацкі твор, яго жыццёва-пазнавальныя, мастацка-эстэтычныя, каштоўнасна-ацэначныя якасці.

Асноўная задача настаўніка на ўроках літаратуры ў V класе заключаецца ў тым, каб зацікавіць вучняў чытаннем, скіраваць іх увагу на пазнанне мастацкай прыроды фальклорных і літаратурных твораў, навучыць успрымаць літаратуру як мастацтва слова.

Напрамак вывучэння літаратуры ў V класе і прынцыпы структуравання зместу вызначаны ў адпаведнасці з логікай чытацкага ўспрымання мастацкага твора, калі асваенне жыццёвага матэрыялу (зместу) у яго вобразным увасабленні натуральна спалучаецца з пазнаннем і ўсведамленнем галоўных асаблівасцей літаратуры як мастацтва. Матэрыял пададзены сістэмна, згрупаваны ў адпаведныя тэматычныя блокі, для таго каб вучні авалодвалі параўнальным падыходам у працэсе аналізу мастацкіх твораў і іх кампанентаў. У выніку такога структуравання зместу кожны асобны твор выступае як адметная мастацкая з'ява, а ўсе тэксты, разам узятыя, дазваляюць убачыць ідэйна-тэматычную разнастайнасць літаратуры, яе эстэтычнае багацце. Пры гэтым настаўнік у працэсе асэнсавання твора дапамагае вучням назапашваць неабходныя літаратурныя веды на аснове засваення сутнасці канкрэтных тэарэтычных паняццяў. Па тэорыі літаратуры адабраны асобныя, даступныя ўзросту вучняў паняцці, звязаныя з мастацкім творам і яго кампанентамі (тэма, сюжэт, літаратурны герой у мастацкім творы; моўныя вобразныя сродкі – эпітэт, параўнанне), а таксама звесткі пра фальклор і некаторыя яго жанры.

У адпаведнасці з узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі пяцікласнікаў, іх жыццёвым і чытацкім вопытам быў вызначаны змест курса літаратуры – фальклорныя і літаратурныя творы, больш складаныя (у параўнанні з IV класам) і разнастайныя па тэматыцы і жанрах, мастацкіх асаблівасцях, якія даюць магчымасць шырокага «агляду» жыцця. Паколькі ў падлеткавым узросце фарміруецца сістэма каштоўнасных адносін да жыцця, адбываецца працэс самаўсведамлення асобы, яе духоўнага станаўлення, вялікая ўвага надаецца творам гераічнага, рамантычнага зместу, якія выяўляюць найважнейшыя грамадзянскія, маральна-этычныя якасці ў характары і паводзінах чалавека, яго адносінах да Радзімы, яе мінулага і сучаснага, да сваёй культуры і мовы, да захавання прыроды і г. д.

Такім чынам, у курсе літаратуры V класа дамінуе жанрава-тэматычны падыход, а ў цэнтры знаходзіцца мастацкі твор і яго будова.

Навучанне беларускай літаратуры ў VI класе з'яўляецца працягам прапедэўтычнага курса, распачатага ў V класе, які будуецца з улікам пераемнасці з папярэднімі этапамі

навучання і паступова, мэтанакіравана падводзіць вучняў да ўспрымання літаратуры на больш высокім узроўні ў наступных класах. Праграма прапануе творы больш складаныя па змесце і разнастайныя па сваіх мастацкіх асаблівасцях, працягвае знаёмства вучняў з жанрамі і тэматыкай фальклорных і літаратурных твораў, найважнейшымі прыёмамі і сродкамі вобразнага адлюстравання свету.

Пры вывучэнні твораў асаблівая ўвага ўдзяляецца паўнавартаснаму ўспрыманню вучнямі зместу і сэнсу прачытанага, пашырэнню іх чалавеказнаўчых, жыццёвых і эмацыянальна-вобразных уяўленняў. Па-ранейшаму вядучай застаецца ўстаноўка на ўсведамленне глыбіні і непаўторнасці мастацкага слова. Вывучэнне літаратурных твораў адбываецца ў адпаведнасці з логікай спасціжэння мастацтва слова: першаснае ўспрыманне – аналіз – абагульненне. У аснове зместу праграмы ляжыць ідэя Радзімы, родных вытокаў, а таксама агульны прынцып уладкавання Сусвету: я – мой род – народ – родная зямля – чалавецтва. Падабраны тэкставы матэрыял заключае ў сабе вялікі пазнавальны змест, мае несумненнае грамадска-выхаваўчае значэнне, дае вучням уяўленні пра літаратуру як чалавеказнаўства і мастацтва слова, асноўныя тэмы і вобразы літаратурнай творчасці, садзейнічае абуджэнню фантазіі, інтэлектуальнаму развіццю і эстэтычнаму ўзбагачэнню асобы.

Уводзіны ў свет міфатворчасці даюць першапачатковыя звесткі пра ўзнікненне вобразнага мастацкага слова, закліканы абудзіць у малодшых падлеткаў цікавасць да прыгожых і таямнічых поглядаў на свет нашых продкаў, даць уяўленне пра выкарыстанне міфалагічных вобразаў у літаратурных тэкстах.

Духоўнаму сталенню асобы, больш глыбокаму ўспрыманню нацыянальных каштоўнасцей і традыцый беларускага народа паспрыяе разгляд жанраў вусна-паэтычнай творчасці і літаратурнай песні, бо песня з'яўляецца багаццем душы чалавека і яднае народ. Вывучэнне лірычных твораў мае на мэце паглыбіць эстэтычны падыход да ўспрымання паэтычнага слова, адчування яго мілагучнасці, вобразнай яркасці і маляўнічасці на прыкладзе аналізу мастацкіх тропаў.

Празаічныя творы, асабліва вялікія па аб'ёме, вымагаюць папярэдняга самастойнага прачытання. Аднак перад гэтым пажадана звярнуць увагу вучняў на асноўныя моманты зместу і ключавыя пытанні, якія будуць разглядацца ў працэсе аналізу мастацкага тэксту. Вывучэнне аб'ёмных твораў прозы будзе эфектыўным толькі пры ўмове паўторнага чытання іх фрагментаў у класе, аналізу твора з удзелам настаўніка, які ставіць пытанні, прапануе заданні і робіць каментарыі. Празаічныя тэксты даюць магчымасць для больш шырокага ахопу жыццёвых з'яў і маральных праблем, далучаюць юных чытачоў да разумення характараў герояў і матываў іх учынкаў, адносін да іншых людзей, мінулага і сучаснага, прыроды і Радзімы. Вучні спасцігаюць пазіцыю і канцэпцыю аўтара-апавядальніка, яго ацэнкі і погляды на чалавека і свет. На матэрыяле прозы паглыбляюцца навыкі аналізу мастацкага тэксту, вуснага і пісьмовага пераказу, выразнага чытання. Падлеткі назапашваюць першапачатковыя веды пра асаблівасці эпічнага роду і асобных празаічных жанраў.

Вывучэнне чалавеказнаўчага зместу мастацкай літаратуры і яе аналіз як мастацтва слова павінны быць падпарадкаваны галоўнай задачы – абуджэнню цікавасці да чытання, да беларускай кнігі і роднага слова.

Навучанне беларускай літаратуры ў VII класе накіравана на выхаванне ўдумлівага, дасведчанага чытача, які разбіраецца ў асноўных вартасцях мастацкіх твораў, умее ацэньваць іх змест, мае добрае адчуванне і разуменне спецыфікі літаратуры, дастатковы чытацкі вопыт, уласны эстэтычны густ.

Вучні, якія ў папярэдніх класах пазнаёміліся з разнастайнасцю жанраў і тэматыкі літаратурных твораў, вобразаў, асноўнымі тропамі, працягваюць спасцігаць сутнасць слоўнага мастацтва, спецыфічныя законы яго функцыянавання. У VII класе ўвядзенне ў свет мастацкай літаратуры працягваецца праз параўнальны разгляд двух асноўных відаў (тыпаў) мастацкай творчасці – паэзіі і прозы, а таксама шляхам супастаўлення мастацкіх твораў з творамі публіцыстычнай, навуковай літаратуры.

Галоўнае ў VII класе – даць уяўленне пра літаратуру як мастацкую з'яву ў сістэме яе сувязей з іншымі відамі мастацтва, праз увагу да майстэрства пісьменніка, яго мастацкага таленту, з боку яе ўнутранай мастацка-эстэтычнай дыферэнцыяцыі (паэзія – проза); праз суадносіны з такімі не мастацкімі, але блізкімі да літаратуры па сваіх чалавеказнаўчых функцыях з'явамі, як публіцыстыка, гуманітарныя навукі (гісторыя).

У вучняў VII класа павінна быць сфарміравана ўяўленне пра тое, што паэзія – гэта не толькі рытмічная мова, але і мастацкая творчасць, якая абуджае моцныя перажыванні, пачуцці, выклікае асаблівую настроенасць душы пры ўспрыманні з'яў навакольнай рэчаіснасці. Проза – гэта слоўна-мастацкая творчасць, якой уласцівы шырокі агляд жыцця, аналіз жыццёвых з'яў у іх канкрэтным і вельмі разнастайным праяўленні; гэты від літаратуры пабуджае да разважанняў, пошуку ўласных адказаў на складаныя пытанні і праблемы.

Літаратурны матэрыял у VII класе падаецца асобнымі цыкламі-блокамі, якія аб'ядноўваюць творы, падобныя па сваіх ідэйна-тэматычных і мастацкіх якасцях, выяўляюць пэўныя спецыфічныя асаблівасці літаратуры. Такі падыход да структуравання матэрыялу ў працэсе навучання дае вучню магчымасць паглыбіцца ў мастацка-эстэтычную атмасферу, атрымаць сістэмнае ўяўленне пра суадносіны жанраў, тэм і г. д.

Курс VIII класа засяроджвае ўвагу вучняў на розных спосабах паказу рэчаіснасці і чалавека ў літаратуры, г. зн. на літаратурных родах і адпаведных ім жанрах, жанравых формах з уласцівымі ім вобразна-выяўленчымі асаблівасцямі і сродкамі.

У праграме відавочна павышаюцца патрабаванні да авалодання паэтыкай мастацкага твора. Дзякуючы сістэмнай арганізацыі літаратурнага матэрыялу, мэтанакіраванай падачы яго адпаведнымі блокамі ствараюцца такія дыдактычныя ўмовы і сітуацыі, калі вучань на працягу некалькіх урокаў «пагружаецца» ў пэўную родава-жанравую сістэму і натуральна спасцігае асаблівасці гэтага віду твораў і тыя літаратуразнаўчыя паняцці, якія з імі звязаны. Такі спосаб структуравання зместу забяспечвае дастатковую гатоўнасць вучняў да аналізу мастацкага твора і падводзіць да засваення прадмета ў гісторыка-храналагічным аспекце ў наступных класах.

6-хвілінны бег	1360	1300	1270	1240	1220	1190	1150	1120	1100	1080 і менш
Дзяўчаты										
Бег 30 м (с)	5,1	5,3	5,4	5,5	5,6	5,8	6,0	6,2	6,5	6,7 і больш
Чаўночны бег 4 × 9 м (с) або	10,1	10,3	10,4	10,6	10,8	11,1	11,4	11,8	12,1	12,4 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хв (разоў)	131	126	118	112	109	100	91	86	80	76 і менш
Скачок у даўжыню з месца (см) або	184	180	175	170	165	155	146	136	126	117 і менш
Кідок набіўнога мяча з-за галавы двума рукамі з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку (см)	480	460	420	400	390	360	325	300	280	270 і менш

Падыманне тулава за 1 хв (разоў) або	52	50	48	46	44	41	37	33	30	26 і менш
Падыманне і апусканне прамых ног за 1 хв (разоў)	33	30	27	25	21	17	14	10	6	3 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см) або	16	15	13	12	10	7	4	1	–2	–5 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	13	12	10	8	7	5	4	1	0	–2 і менш
Бег 1000 м (хв, с) або	4,41	4,52	5,04	5,15	5,27	5,30	6,13	6,36	6,59	7,21 і больш
Хадзьба 1500 м (хв, с)	12,30	12,40	12,50	13,10	13,45	14,30	15,10	16,00	16,50	17,20 і больш
або 6-хвілінны бег (хлопчыкі)	1190	1160	1100	1080	1050	1000	930	900	870	840 і менш

10-БАЛЬНЫЯ ШКАЛЫ АЦЭНКІ ВУЧЭБНЫХ НАРМАТЫВАЎ ПА ЗАСВАЕННІ ЎМЕННЯЎ, НАВЫКАЎ, РАЗВІЦЦЮ РУХАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ ВУЧНЯЎ VIII КЛАСА

Кантрольныя практыкаванні	**Балы**									
	10	**9**	**8**	**7**	**6**	**5**	**4**	**3**	**2**	**1**
Хлопчыкі										
Бег 60 м (с)	9,1	9,4	9,7	10,0	10,2	10,4	10,7	11,0	11,3	11,4 і больш
Бег 1500 м (хв, с)	6,20	6,30	6,40	7,00	7,15	7,20	7,40	7,50	8,00	8,01 і больш
Скачок у даўжыню (см)	390	380	370	360	350	330	310	290	270	269 і менш
Скачок у вышыню (см)	120	115	–	–	110	105	–	100	95	90 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	42	39	36	33	31	29	26	23	20	19 і менш
Бег на лыжах 2 км (хв, с)	12,40	13,00	13,20	13,40	14,00	14,10	14,20	14,30	14,40	14,41 і больш
Плаванне 25 м (хв, с); 50, 25 м – без уліку часу	45,0	50,0	–	–	50 м	–	–	25 м	–	10 м і менш
Крос 2000 м (хв, с)	10,20	10,30	10,40	10,50	11,00	11,10	11,20	11,30	11,40	11,41 і больш
Дзяўчаты										
Бег 60 м (с)	9,6	9,8	10,0	10,2	10,4	10,6	10,9	11,2	11,5	11,6 і больш
Бег 1500 м (хв, с)	6,35	6,45	6,55	7,15	7,25	7,35	7,55	8,05	8,15	8,16 і больш
Скачок у даўжыню (см)	330	320	310	300	290	273	256	240	224	223 і менш
Скачок у вышыню (см)	110	105	–	–	100	95	–	90	85	80 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	26	24	22	20	19	18	17	16	15	14 і менш
Падцягванне на нізкай перакладзіне (разоў)	21	19	17	16	15	13	12	11	10	9 і менш
Бег на лыжах 2 км (хв, с)	13,50	14,00	14,10	14,20	14,30	14,40	14,50	15,00	15,10	15,11 і больш
Плаванне 25 м (хв, с); 50, 25 м – без уліку часу	57,0	1,07,0	–	–	50 м	–	–	25 м	–	10 м і менш
Крос 2000 м (хв, с)	11,10	11,30	11,50	12,10	12,30	12,50	13,10	13,30	13,50	13,51 і больш

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ

(навучальны матэрыял для V–IX класаў)

АЭРОБІКА СПАРТЫЎНАЯ

Тэарэтычныя звесткі

Аэробіка спартыўная – выкананне практыкаванняў у аэробном рэжыме працы пад музычнае суправаджэнне. Аздараўленчая і прафілактычная накіраванасць аэробікі. Аэробіка высокай і нізкай інтэнсіўнасці. Гігіенічныя патрабаванні да адзення, у якім займаюцца аэробікай. Збалансаванае харчаванне пры занятках аэробікай. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, спартыўнага абсталявання і інвентару. Прафілактыка траўматызму. Аказанне першай даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Практычны матэрыял

Разнавіднасці прыстаўнога кроку ўбок, асноўнага кроку, скрыжаванага кроку, крокаў ногі паасобку – ногі разам. Камбінацыі з засвоеных крокаў у спалучэнні з рухамі рукамі (рукі ў бакі, уверх, наперад, направа, налева, кругі рукамі, кругі перадплеччамі, кругі плячыма, згінанні і разгінанні рук).

Падскокі нагу ўперад, убок, назад. Падскокі ногі паасобку – ногі разам. Падскокі на месцы на дзвюх нагах у спалучэнні з рознымі рухамі рук; папераменна на левай, правай і на дзвюх нагах у спалучэнні з рознымі рухамі рук. Спалучэнне падскокаў ногі паасобку – ногі разам з розным становішчам рук.

Пачарговае шматразовае падыманне каленяў. Пачарговае падыманне каленяў з падскокам.

Выпады ўперад, убок, з падскокамі.

Махі нагамі ўперад, у бакі, уперад і ў бакі з падскокамі.

Паўшпагат на правую нагу, на левую нагу. Хвалі з зыходнага становішча «стоячы», «седзячы на пятках на падлозе».

Павароты на 180° і 360° стоячы на адной назе, другая прыціснута да галенастопу. Раўнавага: стоячы на насках, рукі ўверх; стоячы на адной назе, другую нагу ўбок, рукі ўверх або ў бакі. Трыманне раўнавагі пасля прызямлення, скачкоў або падскокаў.

БАСКЕТБОЛ

Тэарэтычныя звесткі

Баскетбол – алімпійскі від спорту. Гігіенічныя патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку баскетбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні гульцоў у нападзенні і абароне. Правілы спаборніцтваў па баскетболе. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках баскетболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне першай даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя баскетбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Высокая, сярэдняя і нізкая стойка баскетбаліста. Скачкі штуршком адной і дзвюма нагамі. Спыненне крокам і скачком. Павароты на месцы, развароты.

Перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей, дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча, стоячы на месцы і ў руху.

Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей, дзвюма рукамі пры паралельным і сустрэчным руху, у скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнем і паваротамі.

Спалучэнне прыёмаў «лоўля-перадача-паварот».

Вядзенне мяча са змяненнем вышыні адскоку і напрамку, з абвядзеннем перашкод, па крузе; са спыненнем, паваротамі, перадачамі па сігнале.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей, адной рукой ад пляча, з адскокам і без адскоку ад шчыта, пад вуглом да шчыта ў руху, штрафныя кідкі.

Спалучэнне прыёмаў «перадача-лоўля-вядзенне-кідок».

Захоп мяча-вырыванне. Вырыванне і выбіванне мяча ў гульца, які спыніўся пасля вядзення. Накрыванне мяча. Перахопліванне мяча ў становішчы стоячы збоку, з-за спіны пры перадачы, выкананай папярок пляцоўкі. Перахопліванне перадачы, выкананай уздоўж пляцоўкі.

Тактычныя дзеянні гульца без мяча: выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру, убок ад партнёра з мячом.

Вызначэнне гульнявой сітуацыі, мэтазгоднай для прымянення вядзення, перадачы, кідка па кальцы. Выбар спосабу вядзення мяча і кідка па кальцы.

Прымяненне спалучэнняў вывучаных прыёмаў у гульнявых сітуацыях.

ВАЛЕЙБОЛ

Тэарэтычныя звесткі

Валейбол – алімпійскі від спорту, яго разнавіднасці: валейбол, валейбол пляжны. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку валейбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні гульцоў у абароне і нападзенні. Расстаноўка гульцоў, гульня «лібера». Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па валейболе.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках валейболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя валейбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Перамяшчэнне прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад, з выскокваннем і прызямленнем на абедзве нагі. Скачок уверх штуршком адной і дзвюма нагамі.

Шматразовыя перадачы мяча зверху і знізу дзвюма рукамі над сабой, з адскокам ад сценкі, у парах і тройках, з пераменай месц, праз сетку ў становішчы стоячы на месцы.

Прыём мяча знізу дзвюма рукамі пасля падачы. Прыём мяча, які адскочыў ад сеткі. Гульня нагой і іншымі часткамі цела.

Атакуючы ўдар у скачку штуршком дзвюма нагамі з другой, трэцяй і чацвёртай зон.

Ніжняя прамая і ніжняя бакавыя падачы з пападаннем у першую, пятую і шостую зоны.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, падманныя перадачы, выбар напрамку перадачы; узаемадзеянні гульцоў першай і другой ліній паміж сабой для заканчэння атакі.

Тактыка абароны: узаемастрахоўка свабодных зон. Выкарыстанне ў гульні «лібера».

Выкарыстанне вывучаных прыёмаў у вучэбнай гульні.

ГАНДБОЛ

Тэарэтычныя звесткі

Гандбол – алімпійскі від спорту. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку гандбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні гульцоў у нападзенні і абароне. Тактыка-тэхнічныя дзеянні варатара. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па гандболе.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках гандболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя гандбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Перамяшчэнне скрыжаваным, прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад. Спыненне адной і дзвюма нагамі. Бег з паскарэннем на кароткіх адрэзках, бег з выскокваннем і прызямленнем на адну і абедзве нагі. Скачок убок штуршком адной нагой. Падзенне на рукі, на сцягно і тулава з месца і з разгону.

Лоўля мяча дзвюма рукамі збоку (без павароту тулава), стоячы на месцы, у руху, у скачку. Лоўля мяча адной рукой з захопам і без захопу. Лоўля мяча на вялікай хуткасці перамяшчэння, у скачку пры непасрэднай блізкасці абаронцы.

Перадачы мяча адной рукой (хлёстам, штуршком, кісцевая) на блізкую адлегласць у розных напрамках з месца, з разбегу ў адзін, два і тры крокі, у скачку, пасля спынення, пасля лоўлі мяча з паўадскоку, пасля лоўлі ў непасрэднай блізкасці абаронцы. Перадача мяча адной і дзвюма рукамі ў адзін дотык. Дальняя перадача адной рукой хлёстам партнёру ў руху.

Вядзенне мяча: аднаўдарнае без зрокавага кантролю, шматударнае на высокай хуткасці перамяшчэння з праследам. Вядзенне на вялікай хуткасці з рэзкім спыненнем і змяненнем напрамку руху, з паваротам кругом.

Кідкі мяча па варотах адной рукой хлёстам зверху і збоку, з нахілам тулава ўлева і ўправа, у апорным становішчы, у скачку, з рознымі спосабамі бегу, з рознай траекторыяй (гарызантальнай, сыходзячай, узыходзячай, навеснай) палёту мяча, з далёкай і блізкай адлегласці.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку кідка; узаемадзеянне гульцоў другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі, узаемадзеянне з лінейным гульцом, з крайнім гульцом, узаемадзеянне крайняга гульца з лінейным. Камандныя дзеянні: пазіцыйнае нападзенне па сістэме расстаноўкі 4 : 2, нападзенне 6 : 0 з выхадам.

Тактыка абароны: зонная абарона па сістэме расстаноўкі 3 : 3, абарона ў меншасці 5 : 6 і 4 : 6.

Тактыка гульні варатара: выбар пазіцыі ў варотах і ў зоне варатара, стойкі варатара, узаемадзеянне варатара з абаронцамі і нападальнікамі.

Выкарыстанне вывучаных прыёмаў у вучэбнай гульні.

ГІМНАСТЫКА АТЛЕТЫЧНАЯ

Правілы бяспечных паводзін у трэнажорнай зале, пры выкананні практыкаванняў з абцяжараннямі і на трэнажорах.

Практыкаванні для фарміравання правільнай паставы: хадзьба з прадметам на галаве па лініі на падлозе, па гімнастычнай лаўцы; хадзьба па гімнастычнай лаўцы з гімнастычнай палкай за спінай, за галавой, над галавой, прыстаўнымі крокамі, з паваротамі, прысяданнямі на двух і адной назе.

Практыкаванні для фарміравання рэльефу розных груп мышцаў:

для мышцаў галёнкі: пад'ёмы на наскі без уцяжарванняў, з гантэлямі ў руках, з грыфам ад штангі на плячах;

для мышцаў спіны: нахілы наперад са штангай за галавой; у становішчы лежачы цяга штангі да грудзей; цяга Т-падобнай штангі да грудзей у нахіле; падцягванне на перакладзіне ў вісе звычайным, сярэднім і шырокім хопам;

для мышцаў грудзей: згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (далоні на шырыні плячэй, шырэй плячэй); жым штангі вузкім хопам; развядзенне і звядзенне рук з гантэлямі ў становішчы лежачы на нахіленай лаўцы; жым гантэлей і штангі ў становішчы лежачы на нахіленай лаўцы;

для мышцаў плечавога пояса: жым гантэлей і штангі стоячы і седзячы; цяга блочнай прылады дзвюма рукамі стоячы, седзячы і ў нахіле; развядзенне рук з гантэлямі седзячы на нахіленай лаўцы; пад'ём гантэлі па чарзе правай і левай рукой у становішчы седзячы на нахіленай лаўцы;

для мышцаў рук: згінанне і разгінанне рук з гантэлямі седзячы на лаўцы пад вуглом 45°; хопам зверху разгінанне рук са штангай з-за галавы ў становішчы стоячы, лежачы на нахіленай лаўцы;

для мышцаў брушнога прэса: у вісе падцягванне каленяў да грудзей; стоячы нахілы тулава ў бакі; кругавыя рухі тулавам з гантэлямі за галавой;

для мышцаў сцягна: частковыя прысяданні (практыкаванне выконваецца на чвэрць, палову або тры чвэрці амплітуды) са змяненнем тэмпу і колькасці паўтораў.

Практыкаванні, комплексы і гульні для развіцця каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцяў вучняў: кросавы бег ад 10 да 30 хвілін з частатой пульсу 120–140 уд./хв; гульня ў футбол, баскетбол, гандбол; агульнаразвіццёвыя практыкаванні з уцяжарваннем ўласнага цела, з рознымі эспандарамі; практыкаванні на гімнастычнай перакладзіне, брусах, трэнажорах; комплексы практыкаванняў кругавой трэніроўкі, якія ўключаюць да 8–12 станцый.

КАНЬКАБЕЖНЫ СПОРТ

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспекі заняткаў на ўроках па канькабежным спорце. Падрыхтоўка канькоў і адзення да заняткаў на лёдзе. Правілы папярэджання траўм і абмаражэнняў.

Практычны матэрыял

Спосабы перамяшчэння: хадзьба ў каньках па снезе; стаянне на каньках на лёдзе; адштурхоўванне па чарзе правай і левай нагой; слізганне на двух каньках па краі лядовай пляцоўкі; слізганне на адным каньку з прыстаўленнем другога канька, на двух каньках «змейкай»; адштурхоўванне і слізганне на двух каньках па прамой, на павароце ўправа і ўлева. Павароты на двух каньках дугой і прыстаўным крокам. Тармажэнне «паўплугам» і «плугам». Старт. Бег па прамой, паварот. Бег з махавымі рухамі дзвюх рук. Фінішаванне. Бег на каньках 100–200–300–500 м без уліку часу. Рухавыя гульні на лёдзе.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

Тэарэтычныя звесткі

Разнавіднасці і дыстанцыі бегу. Разнавіднасці і спосабы скачкоў. Разнавіднасці кіданняў і штурханняў. Лёгкаатлетычныя мнагабор'і. Лёгкая атлетыка ў Дзяржаўным фізкультурна-аздараўленчым комплексе Рэспублікі Беларусь.

Практычны матэрыял

Бег. Са змяненнем хуткасці, са зменай напрамку, з павелічэннем і памяншэннем даўжыні кроку, з выскокваннямі ўверх штуршком правай і левай нагой. Эстафетны бег з адрэзкамі 30, 60, 100 м. Чаўночны бег 3 × 10 м, 4 × 9 м, 10 × 5 м. Бег з раўнамернай і зменнай хуткасцю, кросавы бег.

Скачкі. З месца штуршком дзвюма нагамі. Мнагаскокі на дзвюх нагах. Выскокванне ўверх з даставаннем рукой прадмета. У даўжыню з разбегу на далёкасць. У вышыню з разбегу вывучаным спосабам.

Кіданне. Тэніснага мяча на далёкасць з месца, з чатырох-шасці крокаў і з поўнага разбегу на далёкасць, у гарызантальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 10–25 м, на далёкасць адскоку ад сцяны.

ЛЫЖНЫЯ ГОНКІ

Тэарэтычныя звесткі

Умовы захоўвання і асаблівасці падрыхтоўкі лыжнага інвентару, адзення і абутку да заняткаў. Спосабы папярэджання абмаражэнняў пры перамяшчэнні на лыжах. Аказанне першай дапамогі пры траўмах, абмаражэннях. Уплыў заняткаў лыжнымі гонкамі на ўмацаванне здароўя. Гісторыя развіцця лыжнага спорту ў Рэспубліцы Беларусь. Лыжныя гонкі ў Дзяржаўным фізкультурна-аздараўленчым комплексе Рэспублікі Беларусь.

Практычны матэрыял

Павароты пераступаннем на месцы і ў руху. Павароты махам на месцы праз лыжу ўперад і праз лыжу назад.

Папераменны двухкрокавы і адначасовы аднакрокавы ход. Пераход з папераменнага ходу на адначасовы. Чаргаванне папераменнага двухкрокавага з адначасовым аднакрокавым ходам. Адначасовы двухкрокавы і папераменны чатырохкрокавы ход. Чаргаванне папераменных і адначасовых хадоў. Каньковы ход. Чаргаванне каньковага ходу з адначасовым і папераменным лыжным хадамі. Бяскрокавы ход. Перамяшчэнне па слабаперасечанай мясцовасці з чаргаваннем адначасовых, папераменных і бяскрокавага хадоў.

Пад'ём «паўелачкай», «елачкай» і «лесвічкай». Спуск прама і наўскос у асноўнай стойцы. Спуск прама ў нізкай стойцы.

Тармажэнне «плугам», «упорам». Тармажэнне бакавым саслізгваннем.

Пераадоленне перашкод на лыжах спосабамі пераступанне, пераскокванне, пералажанне. Пераадоленне бугроў (30–50 см вышынёй) і упадзін пры перамяшчэнні ў нізкай стойцы.

Праходжанне вучэбных дыстанцый з выкарыстаннем вывучаных спосабаў перамяшчэння. Праходжанне вучэбных дыстанцый з пераадоленнем спускаў і пад'ёмаў.

ПЛАВАННЕ

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспечных паводзін вучняў у басейне. Падрыхтоўка купальных прыналежнасцей да заняткаў плаваннем. Правілы асабістай і грамадскай гігіены пры наведванні басейна. Правілы бяспечнага купання ў адкрытых вадаёмах.

Спосабы спартыўнага плавання. Уплыў заняткаў плаваннем на здароўе вучняў. Загартоўваючы эфект плавання. Самакантроль падчас заняткаў плаваннем.

Лепшыя плыўцы свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Практыкаванні на сушы. Актыўныя і пасіўныя практыкаванні для развіцця рухомасці ступні, плечавых, тазабедраных і галёнкаступнёвых суставаў. Практыкаванні для развіцця сілавой трываласці мышцаў рук, ног, брушнога прэса, спіны. Імітацыйныя практыкаванні для развіцця каардынацыі рухаў рук і ног пры плаванні абраным стылем. Спецыяльныя практыкаванні для адпрацоўкі павароту.

Практыкаванні ў вадзе. Практыкаванні для фарміравання тэхнікі рухаў рук, ног і дыхання пры плаванні абраным стылем. Плаванне ў поўнай каардынацыі абраным стылем. Практыкаванні для адпрацоўкі тэхнікі паваротаў пры плаванні абраным стылем. Практыкаванні для адпрацоўкі тэхнікі старту. Праплыванне да 100 м любым спартыўным спосабам.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на грудзях»: імітацыя грабка рукамі на сушы; плаванне з дошкай на нагах, плаванне на руках, узгадненне рухаў рук, ног і дыхання; з зыходнага становішча лежачы на грудзях, рукі ўверсе, праплыванне адрэзкаў 5–6 м, выконваючы грабок толькі левай рукой, толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі, выкарыстоўваючы для падтрымкі ног плавальныя дошкі, надзіманыя кругі і да т. п.; тое ж, але з актыўнымі рухамі нагамі і поўным цыклам дыхання; плаванне спосабам «кроль на грудзях» у поўнай каардынацыі дыхання з рухамі рук і ног. Плаванне 25 м без уліку часу.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на спіне»: імітацыя грабка рукамі на сушы; з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверсе, праплыванне адрэзкаў 5–6 м, выконваючы грабок толькі левай рукой, толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі, выкарыстоўваючы для падтрымкі ног дошкі, надзіманыя кругі і да т. п.; тое ж, але з актыўнымі рухамі нагамі і поўным цыклам дыхання; плаванне спосабам «кроль на спіне» ў поўнай каардынацыі дыхання з работай рук і ног. Плаванне 25 м без уліку часу.

Скачкі ў ваду. Скачкі ў ваду з борціка нагамі ўніз. Спад галавой уніз з зыходных становішчаў седзячы на борціку і седзячы на тумбачцы. Стартавы скачок у ваду з тумбачкі.

Развіццё хуткасных, хуткасна-сілавых, сілавых, каардынацыйных здольнасцяў, гібкасці, трываласці з акцэнтам на развіццё аэробнай трываласці.

ТЭНІС НАСТОЛЬНЫ

Тэарэтычныя звесткі

Тэніс настольны – алімпійскі від спорту. Тэніс настольны ў адзінай спартыўнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку тэнісіста. Харчаванне спартсмена пры занятках тэнісам. Відазмяненне тэхнікі гульні ў настольны тэніс. Удасканаленне абсталявання і інвентару. Правілы гульні. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Лепшыя спартсмены свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Практычны матэрыял

Бег: 10, 30, 60 м, бег з паскарэннем; чаўночны бег 4 × 9 м, 6 × 20 м, 10 × 5 м; чаўночны бег з вар’іраваннем звычайнага бегу з бегам спінай уперад; бег з максімальнай хуткасцю 5 × 30 м, 10 × 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 хв.

Скачкі трайныя і пяцярныя з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Прысяданні па чарзе на правай і левай назе. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180° у правы і левы бок. Паскарэнні пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок з пружыністымі прысяданнямі. Пераскокванне праз

гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем сцёгнаў («кенгуру»).

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні захопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока-нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, аб сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, з перакладваннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя удараў: з ракеткай і без ракеткі з абцяжаральнікам у руцэ; адзіночных, серыйных удараў, удараў з перамяшчэннем управа і ўлева, наперад і назад; падачы мяча з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай; удараў у розным тэмпе перад люстэркам; удараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальна хуткага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сценку і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня дзвюма ракеткамі, «негульнявой» рукой. Гульня двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух чалавек.

Падача з элементамі вывучаемага ўдару. Удар на стале па дыяганалі. Змяненне напрамку палёту мяча па шырыні стала. Змяненне траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змяненне даўжыні палёту мяча. Удар па мячы са зменным прыходным кручэннем.

Змяненне тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаемым ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з палавіны стала, з дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаемым ударам па кароткіх і доўгіх прыходзячых мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць пападання ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні ўправа-ўлева, наперад-назад. Гульня штуршком злева доўга-коратка. Гульня па ўзыходзячым, сыходзячым мячы, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Падрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай управа ў пазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская і з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Тактыка гульні ў сучасны настольны тэніс (на прыкладзе дэманстрацыі запісу гульні з паказам і разборам асноўных варыянтаў тактычных дзеянняў).

Прымяненне вывучаных элементаў у вучэбнай гульні.

ФУТБОЛ

Тэарэтычныя звесткі

Футбол – алімпійскі від спорту. Разнавіднасці футбола: футбол, міні-футбол, футбол у залах, пляжны футбол. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку футбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні гульцоў у нападзенні, паўабароне,

абароне. Тэхніка-тактытычныя дзеянні варатара. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па футболе.

Самакантроль на занятках футболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя футбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Агульнападрыхтоўчыя, спецыяльнападрыхтоўчыя практыкаванні і эстафеты з футбольным мячом. Рухавыя гульні і эстафеты з вядзеннем мяча, з абводкай стоек, з прыёмам і спыненнем мяча, ўдарамі па варотах, у «лабірынт» (з мячом і без мяча), на збліжэнне з сапернікам, з двума і трыма нападальнікамі на пляцоўцы для міні-футбола, з абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), шматпланавыя гульні для развіцця каардынацыйных, хуткасных здольнасцяў. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы, удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом, гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гульнявой трываласці, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча, фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні, спрошчаныя гульні 3 на 3, на 4, 5 на 5 гульцоў, гульні для каманд з 7 чалавек, тэсты на гульнявыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалавек з улікам падзелу поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагой па нерухомым мячы і мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском. Практыкаванні ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак: «вядзенне-перадача», «прыём-перадача», «прыём-вядзенне-перадача».

Удары па мячы на далёкасць і дакладнасць, абвядзенне-адбор мяча, абвядзенне-адбор-удар па варотах, перахопліванне мяча, гульня галавой, камбінацыі ў тройках з мячом, дзеянні без мяча (адкрыванне, адцягванне, стварэнне колькаснай перавагі), узаемадзеянне двух нападальнікаў супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападальніка, гульнявыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т. п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцяў, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў. Гульні з бегам, скачкамі, перадачамі мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнявой трываласці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннямі, рыўкамі, скачкамі), хуткасна-сілавых якасцяў, сілы.

ПРЫКЛАДНЫЯ ДАМАШНІЯ ЗАДАННІ

Для вучняў VIII–IX класаў.

Комплекс ранішняй гімнастыкі з 10–12 практыкаванняў у чаргаванні з гімнастычнай палкай, скакалкай, гантэлямі. Раўнамерны бег да 2 км (дзяўчынкі) і 3–4 км (хлопчыкі). Язда на веласіпедзе 8–10 км. Хадзьба на лыжах 3–5 км. Паўторны бег з высокім падыманнем сцягна і максімальнай частатой рухаў. Віс на сагнутых руках, падцягванне ў вісе стоячы на нізкай перакладзіне (дзяўчынкі). Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне, рукі за галавой. Падыманне і апусканне прамых ног са становішча лежачы на спіне з дакрананнем да падлогі за галавой. Падыманне і апусканне, адвядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1–3 кг. З гантэлямі ў руках прысяданні па чарзе на правай і левай нагах. Прысяданні з выскокваннем уверх. Раўнавага на адной назе (стойка «Фламінга»). Скачкі праз кароткую скакалку да 5 хв. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы і ва ўпоры седзячы ззаду. Падрыхтоўка і ўдзел у школьных і раённых фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах, днях здароўя, спартыўных спаборніцтвах.

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЁ»

Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[15]

[15] К постановлению Министерства образования Республики Беларусь от 14.07.2014 № 105.

Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики							
№ п/п	**Наименование**	**Единица измерения**	**Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.):**				**Примечания**
			до 220	**до 440**	**до 880**	**свыше 880**	
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–
2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг
7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазания диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–
11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							
28	Брусок деревянный 5Ч5Ч10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–
30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1	1	1	2	от 1 до 100
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–

33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–
Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–
44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–
46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–		приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						
58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–
58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–
60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–

61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–
62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–
74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемый за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей							
Технические средства обучения							
87	Видеокамера	штука	1	1	1	1	–
88	Компьютер	штука	1	1	1	1	–
89	Мегафон	штука	1	1	2	3	–
90	Микрофон	штука	1	1	1	2	–
91	Музыкальный центр	штука	1	1	1	1	–
92	Проектор мультимедийный	штука	1	1	1	1	–
93	Телевизор	штука	1	1	1	1	–
94	Усилитель с колонками	штука	1	1	1	1	–
95	Шнур (удлинитель) электрический	штука	1	1	1	1	до 50 м
96	Экран переносной	штука	1	1	1	1	–
Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование							
97	Веревочка с грузом	штука	2	3	4	6	до 5 м
98	Тренажер (операционный или многофункциональный)	штука	2	4	4	6	–
99	Штанга	штука	1	2	2	3	–
100	Эспандер	штука	6	8	10	15	–
101	Гантели разборные	пара	4	8	10	12	до 10 кг
Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования							
102	Костюм спортивный	штука	10	18	20	20	–
103	Майка, полурукавка, футболка спортивная	штука	10	18	20	20	–
104	Трусы спортивные	штука	10	18	20	20	–
105	Кроссовки спортивные	пара	10	18	20	30	–

Дадатак 2

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 1000, 1500 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Старт – групавы. Вучням, якія парушылі правілы спаборніцтваў па бегу, а таксама не фінішавалі, у пратакол выканання кантрольных практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 с.

6-хвілінны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне размячаецца кожныя 10 ці 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па заканчэнні 6 хвілін настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе іх застаў сігнал. Затым настаўнік кожнаму вучню індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе ён перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама не фінішавалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 м.

Хадзьба 1500, 2000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна. Рэкамендуецца выконваць тэставае практыкаванне асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Пры невялікай напаўняльнасці класа дапускаецца выкананне практыкавання адначасова ўсімі вучнямі. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на бег, чаргаваць бег з хадзьбой, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, якія не фінішавалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Час пераадолення дыстанцыі вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 с.

Падцягванне на перакладзіне выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хватам зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца згінанні тулава і ног у каленных суставах, развядзенне, скрыжаванне і іншыя рухі нагамі, рыўкі, махі і разгойдванне, перахопліванні рук. Падцягванне залічваецца, калі падбародак вучня знаходзіцца вышэй за ўзровень перакладзіны, а пры апусканні рукі поўнасцю выпрамляюцца ў локцевых суставах.

Падыманне тулава за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваны перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, ступні ног зафіксаваны. Вугал у каленным суставе складае 90 градусаў.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дакрананні локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дакрананнем лапаткамі да гімнастычнага мата.

Падыманне і апусканне прамых ног за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі за галавой, прамыя ногі разам. Настаўнік ці другі вучань размяшчаецца з боку галавы тэсціруемага і ўтрымлівае яго за локцевыя суставы. Па сігнале настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань падымае прамыя ногі да вугла 90 градусаў да дакранання галёнкай да гімнастычнай палкі, загадзя замацаванай у нерухомым становішчы або ўтрымліваемай настаўнікам. Затым падыспытны апускае ногі да дакранання пяткамі да гімнастычнага мата. Залічваецца колькасць поўных цыклаў (падыманне і апусканне) на працягу 1 хвіліны.

Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы. Вучань прымае зыходнае становішча ўпор лежачы, кісці рук на шырыне плячэй, ногі разам. Захоўваючы прамое становішча тулава і ног, вучань згінае рукі ў локцевых суставах да вугла не менш за 90 градусаў і, выпрамляючы рукі, вяртаецца ў зыходнае становішча. Не дапускаецца згінаць ногі і

тулава, дакранацца да падлогі каленямі і грудзьмі. Залічваецца колькасць згінанняў і разгінанняў рук без парушэння ўказаных патрабаванняў.

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага ці нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў у бегу (фальстарт), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 с

Чаўночны бег 4 × 9 метраў выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу – не больш за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца дзве спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту ў напрамку да пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць два брускі 50 × 50 × 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.



Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па аднаму бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (ці за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся на лініі. Падбегшы да лініі, бяруць другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы хуткасці, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 с. Залічваецца лепшы вынік з двух спроб.

Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хвіліну выконваюцца на цвёрдым пакрыцці (у спартыўнай зале, на гульнявой пляцоўцы або бегавой дарожцы стадыёна). Кручэнне скакалкі выконваецца толькі наперад. Скачкі выконваюцца з абавязковай апорай на абедзве нагі адначасова. Дапускаецца выкарыстоўваць любыя скакалкі прамысловай вытворчасці або самаробныя (напрыклад, з турысцкага фала). Забараняецца выкарыстоўваць на скакалцы ўстаўкі-ўцяжарвальнікі. Пры памылцы ў час скачкоў секундамер не спыняецца, а вучань працягвае выконваць скачкі. Залічваецца сумарная колькасць скачкоў на працягу 30 секунд або 1 хвіліны.

Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы або на дарожцы стадыёна з прызямленнем пасля трэцяга скачка ў скачковую яму. Скачкі выконваюцца штуршком дзвюма нагамі злітна без затрымак і спыненняў. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі выконваецца ў спартыўнай зале з зыходнага становішча седзячы, ногі паасобку, пяткі на кантрольнай лініі. Выкарыстоўваецца мяч вагой 1 кг. Вучань утрымлівае мяч дзвюма рукамі над галавой, затым згінае рукі ў локцевых суставах, апускае мяч за галаву і рэзкім рухам кідае яго ўперад-уверх. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе. Вучань садзіцца на падлогу з боку знака «-» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі «ОВ» упіраюцца ва ўпоры для ног, ступні вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі ў каленных суставах.



Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі ўздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на тры секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы. Для ацэнкі выніку выкарыстоўваецца вымяральная лінейка, прымацаваная вертыкальна да гімнастычнай лаўкі. Вучань прымае зыходнае становішча, пяткі і наскі ног разам. Наскі не выходзяць за край гімнастычнай лаўкі. Тэсціруемы кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на тры секунды. Не дапускаецца згінанне ног у каленных суставах. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра

Дадатак 3

ГАДЗІНА ЗДАРОЎЯ І СПОРТУ

(35 вучэбных гадзін)

VIII клас

БАСКЕТБОЛ

Вучэбны матэрыял

Правілы спаборніцтваў і судзейства гульні. Фалы (тэхнічны, неспартыўны, дысквалiфікацыйны). Размяшчэнне гульцоў на пляцоўцы згодна з гульнявога амплуа. Штрафны кідок (размяшчэнне гульцоў). Судзейская брыгада. Жэсты суддзяў.

Характарыстыка баскетбола на сучасным этапе. Спаборніцтвы па баскетболе на сучасным этапе; развіццё баскетбола ў свеце, Рэспубліцы Беларусь, вобласці, горадзе і школе.

Паўтарэнне пройдзенага матэрыялу: перамяшчэнні гульца (хада, бег, скачкі, павароты, прыпынкі); лоўля мяча адной і дзвюма рукамі; вядзенне мяча без зрокавага кантролю са зменай напрамку і хуткасці; перадачы мяча на месцы і ў руху; кідкі мяча па кальцу з месца адной рукой ад пляча з блізкай і сярэдняй дыстанцыі, кідкі адной рукой у руху сходу і пасля вядзення, прыпынку крокам і скачком пасля вядзення і перадач мяча; апека гульца з мячом і без мяча.

Перадача мяча пры сустрэчным руху: у калонах, у парах рознымі спосабамі (адной і дзвюма рукамі); па паветры і з адскокам ад падлогі.

Кідок адной рукой ад пляча: з месца, з сярэдняй дыстанцыі з розных кропак, пасля перамяшчэнняў.

Штрафны кідок: пасля нагрузкі (паскарэнняў, скачкоў); серыі кідкоў.

Кідкі ў руху, пасля вядзення і адразу.

Апека гульца: з напрамкам, шчыльная апека гульца, які валодае мячом і без мяча.

Выбіванне і вырыванне мяча: у парах выбіванне зверху (знізу); выбіванне падчас вядзення; вырыванне мяча з розных становішчаў.

Персанальная абарона: размяшчэнне гульцоў на пляцоўцы (выконваючы прынцып «трохвугольніка»); прымяненне развучанай абароны ў гульні «тры на тры».

ВАЛЕЙБОЛ

Вучэбны матэрыял

Правілы спаборніцтваў і судзейства гульні. Судзейская брыгада. Жэсты суддзяў. Жоўтая і чырвоная карткі. Гульнявыя амплуа і размяшчэнне гульцоў на пляцоўцы згодна з гульнявога амплуа.

Характарыстыка валейбола на сучасным этапе. Спаборніцтвы па валейболе на сучасным этапе; развіццё валейбола ў свеце, у Рэспубліцы Беларусь, у вобласці, у горадзе і школе.

Паўтарэнне пройдзенага матэрыялу: практыкаванні, рухавыя гульні і эстафеты з жангляваннем, кідкамі, перадачамі, лоўляй, катаннем мяча з розных зыходных становішчаў, практыкаванні выконваюцца на месцы і ў руху; стойкі; перамяшчэнні (хада, прыстаўныя крокі, двайны крок, скок, бег, скачкі, прыпынкі пасля перамяшчэнняў); перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы і пасля перамяшчэнняў, з змяненнем напрамкі; перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы і пасля перамяшчэнняў, са змяненнем напрамку; падача ніжняя прамая на дакладнасць; падача верхняя прамая на дакладнасць.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы: з розных зыходных становішчаў (седзячы, з прыседу), пасля розных практыкаванняў (упор прысеўшы-упор лежачы-выскачыць), з ударам аб сцяну, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху пасля перамяшчэнняў: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі, у пары, у пары з адскокам ад падлогі, над сабой (з адскокам ад падлогі і без), групавыя практыкаванні: з пераменай месцаў.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы: з розных зыходных становішчаў, (седзячы, з прыседу), пасля розных практыкаванняў (паварот на 360), з ударам аб сцяну, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу пасля перамяшчэнняў: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі, у пары, у пары з адскокам ад падлогі, над сабой (з адскокам ад падлогі і без), групавыя практыкаванні: з пераменай месцаў.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху са змяненнем напрамку: перадача ў тройках, чацвёрках, па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу, са змяненнем напрамку: перадача ў тройках, чацвёрках, па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху праз сетку (на месцы): перадачы ў розных спалучэннях (пасля перадачы над сабой зверху (знізу) – партнёру, пасля павароту на 360, пасля дотыку сеткі), з рознай адлегласці ад сеткі (кароткая, доўгая).

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу праз сетку (на месцы): перадачы ў розных спалучэннях (пасля перадачы над сабой зверху (знізу) – партнёру, пасля павароту на 360, пасля дотыку сеткі), з рознай адлегласці ад сеткі (кароткая, доўгая).

Падача верхняя прамая: спаборніцтвы на выкананне ўстаноўленай настаўнікам колькасці падач, падачы ў бліжнюю частку пляцоўкі, падачы ў далёкую частку пляцоўкі, падачы ў левую частку пляцоўкі, падачы ў правую частку пляцоўкі, падачы на дакладнасць у зону, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат.

Падача ніжняя прамая: спаборніцтвы на выкананне ўстаноўленай настаўнікам колькасці падач, падачы ў бліжнюю частку пляцоўкі, падачы ў далёкую частку пляцоўкі, падачы ў левую частку пляцоўкі, падачы ў правую частку пляцоўкі, падачы на дакладнасць у зону, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат.

Прыём мяча з падачы: у парах на бакавых лініях, прыём падачы, пары размешчаны праз сетку ў трох метрах ад сеткі, у шасці метрах ад сеткі, прыём мяча ў парах, адзін (два, тры гульцы) размешчаны на задняй лініі, насупраць размешчаны гулец, які выконвае падачу з месца падачы. Змяненне напрамку перадач: перадача ў тройках па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Падача ва ўстаноўлены квадрат, у пэўную зону пляцоўкі: падачы на дакладнасць у зону, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат.

Узаемадзеянне паміж гульцамі пярэдняй лініі: гулец зоны 3, выконвае перадачу ў зону 4 ці 2, калі злучны будзе знаходзіцца ў зоне 2.

Узаемадзеянне паміж гульцамі пярэдняй і задняй лініі: гулец, які прымае падачу (нападальны ўдар) накіроўвае мяч гульцу ў зону 3, які выконвае перадачу ў зону 4 або 2.

Выбар месца пры прыёме падачы: выхад пад мяч у залежнасці ад кірунку палёту мяча.

Выбар спосабу прыёму падачы: у залежнасці ад траекторыі і хуткасці палёту мяча прыём падачы выконваць двума рукамі зверху, альбо двума рукамі знізу.

Узаемадзеянне гульцоў, якія прымаюць падачу, са злучным гульцом: гулец, які прымае падачу (нападальны ўдар) накіроўвае мяч гульцу ў зону 3, калі злучны будзе знаходзіцца ў зоне 2, то гулец, які прымае падачу (нападальны ўдар), павінен выканаць даводку мяча ў зону 2. Прыём мяча з падачы ў зону 3 для перадачы: які размяшчаецца ў зоне 6 (5, 1), падачай мяч накіроўваюць гульцу, які павінен выканаць даводку ў зону 3.

Пры правядзенні навучальных гульняў ўжываць вывучаныя тэхніка-тактычныя дзеянні.

ГАНДБОЛ

Вучэбны матэрыял

Сістэмы правядзення спаборніцтваў па гандболе. Алімпійская сістэма спаборніцтваў, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Колькасць гуляючых каманд. Жараб'ёўка. Парадак і паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Кругавая сістэма, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Жараб'ёўка. Узаемасувязь колькасці гульнявых дзён і колькасці каманд, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. Паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Змешаная сістэма, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Жараб'ёўка. Узаемасувязь колькасці гульнявых дзён і колькасці каманд, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. Паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Правілы гульні ў гандбол. Функцыі і абавязкі суддзяў да пачатку і пасля заканчэння гульні. Склад судзейскай брыгады, абавязкі і паўнамоцтвы кожнага члена судзейскай брыгады. Судзейскі пратакол і асаблівасці яго запаўнення.

Паводзіны гульцоў: спартыўныя паводзіны, сумленная гульня, парушэнне правілаў гульні і санкцыі, жоўтая і чырвоная судзейскія карткі.

Гульнявы час, дадатковы час, час матчу.

Гульнявыя дзеянні: памылкі пры гульні з мячом і без мяча, парушэнні правілаў у адзінаборствах за мяч, штрафны і сямімятровы кідок, дазвол на ўвядзенне мяча ў гульню. Перасячэнне мячом бакавой і пярэдняй ліній гульнявой пляцоўкі.

Жангліраванне мячом адной рукой, папераменна правай і левай рукой; вядзенне мяча папераменна правай і левай рукой у высокім тэмпе і з паскарэннем па прамой, змейкай, васьмеркай, чаўнаком; перадача мяча правай і левай рукой пры паралельным і сустрэчным руху; перадачы мяча левай і правай рукой з апоры; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай рукой з наступнай перадачай; лоўля мяча адной рукой з наступным кідком па варотам; лоўля мяча дзвюма рукамі ў скачку; кідкі правай і левай рукой па нерухомым і мячы, які коціцца; кідкі па варотах з левага кута, правага кута.

ФУТБОЛ

Вучэбны матэрыял

Сістэмы правядзення спаборніцтваў па футболе. Алімпійская сістэма, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Колькасць гуляюючых каманд. Жараб'ёўка. Парадак і паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Кругавая сістэма правядзення спаборніцтваў, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Жараб'ёўка. Узаемасувязь колькасці гульнявых дзён і колькасці каманд, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. Паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Змешаная сістэма правядзення спаборніцтваў, яе асаблівасці, перавагі і недахопы. Жараб'ёўка. Узаемасувязь колькасці гульнявых дзён і колькасці каманд, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. Паслядоўнасць гульняў. Падвядзенне вынікаў, вызначэнне пераможцы і прызераў. Падлік ачкоў у кожнай каманды.

Методыка судзейства гульні ў футбол. Узаемадзеянне суддзі ў полі і бакавых суддзяў. Абавязкі суддзі ў полі і бакавых суддзяў. Судзейскі свісток і судзейскі сцяжок. Выкарыстанне свістка і сцяжка падчас гульні. Узаемадзеянне суддзі ў полі і бакавых суддзяў з выкарыстаннем жэстаў і перагаворных прылад. Размяшчэнне суддзяў падчас гульні. Жэсты суддзі ў полі і бакавых суддзяў. Паўнамоцтвы суддзі ў полі, бакавых суддзяў, памочніка суддзі ў полі.

Правілы гульні. Функцыі і абавязкі суддзяў да пачатку і пасля заканчэння гульні. Склад судзейскай брыгады, абавязкі і паўнамоцтвы кожнага члена судзейскай брыгады. Афіцыйныя жэсты суддзяў. Судзейскі пратакол і асаблівасці яго запаўнення.

Паводзіны гульцоў: спартыўныя паводзіны, сумленная гульня, парушэнні правілаў гульні і санкцыі, жоўтая і чырвоная судзейскія карткі.

Гульнявы час, дадатковы час, час матчу.

Гульнявыя дзеянні: памылкі пры гульні з мячом і без мяча, парушэнні правілаў у адзінаборствах за мяч, штрафны і вольны ўдар, дазвол на ўвядзенне мяча ў гульню. Перасячэнне мячом бакавой і пярэдняй ліній гульнявога поля. Становішча «па-за гульні».

Жангліраванне мячом адной нагой, папераменна правай і левай нагамі, па чарзе нагой і галавой.

Вядзенне мяча папераменна правай і левай нагой ў высокім тэмпе і з паскарэннем па прамой, змейкай, васьмеркай, чаўнаком.

Перадачы мяча правай і левай нагой пры паралельным і сустрэчным руху.

Перадача галавой мяча, які ляціць.

Спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагой з наступнай пера-дачай.

Спыненне нагой мяча, які ляціць, з наступным ударам па варотах.

Спыненне грудзьмі мяча, які ляціць.

Удары правай і левай нагамі па нерухомым і мячы, які коціцца, серадзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском з пападаннем у вароты з сярэдняй і далёкай дыстанцыі.

Удар па варотах галавой пасля падачы са штрафнога і вуглавога ўдару.

Тэхніка-тактычныя звязкі ў парах, тройках, чацверках: вядзенне-перадача, прыем-перадача, прыем-вядзенне-перадача, вядзенне-удар па варотах, прыем-удар па варотах, спыненне-перадача.

Гульня варатара: лоўля і адбіванне мяча рукамі стоячы на месцы і ў руху, лоўля мяча рукамі ў падзенні, увядзенне мяча ў гульню кідком адной рукой, ударам нагой па нерухомым мячы і пасля накідвання.

Эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча ў максімальна хуткім тэмпе.

Увядзенне мяча ў гульню кідком дзвюма рукамі з-за бакавой лініі.

Гульня ў футбол 6 на 6, 8 на 8 гульцоў і поўнымі складамі.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па беларускай мове падрыхтавана ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская мова». Асноўныя палажэнні Канцэпцыі грунтуюцца на тым, што беларуская мова з'яўляецца адной з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь і каштоўным сацыяльна-культурным скарбам нацыі.

Ва ўстановах адукацыі беларускую мову трэба вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі. Неабходна так наладжваць працэс навучання, каб адным з галоўных напрамкаў у працы настаўніка стала фарміраванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека. Патрэбна дапамагаць вучням назапашваць навыкі, неабходныя для самаадукацыі, самапазнання і выхавання, вучыць карыстацца імі ў штодзённым жыцці. У сістэме ўсіх навук надзвычай важнае значэнне мае логіка-лінгвістычны кампанент. Менавіта ён забяспечвае функцыянаванне навукі ў грамадстве. Хоць кожная з яе галін і мае сваю ўласную мову (слоўнікі, алфавіты, паняцці, тэрміны, формулы выражэння сэнсу), аднак усё гэта дапаўняецца і суправаджаецца ў практыцы навучання словам. А гэта азначае, што беларуская мова з'яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання.

Вывучэнне беларускай мовы не можа абмяжоўвацца запатрабаваннямі асобы ў лінгвістычных ведах, азнаямленнем вучняў з моўнымі адзінкамі і законамі. Абавязак устаноў адукацыі – навучыць сваіх выхаванцаў карыстацца беларускім словам, дапамагчы ім авалодаць маўленчай этыкай і культурай. Вучням трэба даць такую лінгвістычную адукацыю, якая дапаможа ім не толькі граматычна правільна ствараць і афармляць свае вусныя і пісьмовыя паведамленні, але выбіраць з багатага арсеналу выяўленчых моўных сродкаў самыя трапныя, самыя дасканалыя і пераканальныя. У сувязі з гэтым неабходна штодзённа ўдасканальваць маўленчую практыку вучняў, якая наладжваецца ў форме гутаркі, пісьма, чытання, публічных выступленняў, слухання радыё- і тэлеперадач, вучэбных лекцый, дакладаў, паведамленняў. Гэтым сцвярджаецца думка, што да маўлення трэба падыходзіць як да адной з формаў пазнавальнай дзейнасці чалавека, спосабу яго грамадскай актыўнасці, сродку сацыялізацыі.

Менавіта на вырашэнне гэтых і іншых задач скіраваны змест і будова праграмы па беларускай мове. Адметнай яе асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў цэнтры ўвагі – вучань як суб'ект, зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і правіл карыстання ёй; яго запатрабаванні ў сферы маўлення як форме грамадскай дзейнасці і спосабе праяўлення ўласнай жыццёвай актыўнасці.

Мэта вывучэння прадмета «Беларуская мова» – сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне, навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіваць камунікатыўную, духоўна-маральную, грамадзянскую і мастацка-эстэтычную культуру вучняў.

Задачы:

засваенне сістэмы мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу), заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы, развіццё ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці (*моўная і маўленчая кампетэнцыі*);

фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (*маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя*);

усведамленне мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы, валоданне нормамі маўленчага этыкету, культурай міжнацыянальных зносін; развіццё сродкамі мовы камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў (*лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі*).

Працэс развіцця асобы вучня пры навучанні беларускай мове павінен быць узаемазвязаным і садзейнічаць рэалізацыі наступных напрамкаў: ***моўнага*** (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), ***маўленчага*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), ***камунікатыўнага*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў), ***рытарычнага*** (авалоданне рознымі відамі публічных выступленняў, адпаведнымі рытарычнымі прыёмамі і сродкамі, якія забяспечваюць эфектыўныя зносіны), ***лінгвакультуралагічнага*** (усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры), ***сацыякультурнага*** (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў).

Навучанне беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага і сацыякультурнага падыходаў пры выкладанні ўсіх тэм і раздзелаў.

Сучасная адукацыя скіравана на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для рашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. Вынікам развіцця функцыянальнай пісьменнасці з’яўляецца авалоданне вучнямі сістэмай ключавых кампетэнцый, якія дазволяць эфектыўна прымяняць веды, уменні і навыкі ў практычнай дзейнасці, паспяхова выкарыстоўваць іх у працэсе сацыяльнай адаптацыі. Любы тып кампетэнцыі не фарміруецца без ведаў (каб умець, трэба ведаць), аднак веды самі па сабе не з’яўляюцца самакаштоўнасцю (веды па-за практычнай дзейнасцю, не скіраваныя на асобаснае развіццё чалавека, ператвараюцца ў дагматызм – аднабаковае, схематычнае мысленне). Сучасная адукацыя імкнецца пераарыентавацца з пазіцыі «ведаць, каб памятаць» на пазіцыю *«ведаць, каб умець і дзейнічаць»*. У гэтым агульная сутнасць *кампетэнтнаснага падыходу*.

У адносінах да моўнай адукацыі кампетэнтнасны падыход звязаны з фарміраваннем у вучняў моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, рытарычнай, лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый.

Сістэмна-функцыянальны падыход забяспечвае засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыю моўнага матэрыялу для авалодання моўнай кампетэнцыяй.

Вядома, што задачы навучання мове нельга зводзіць да апісання сістэмных адзінак і з'яў розных моўных узроўняў. Неабходна так наладжваць навучальны працэс, каб вучні асэнсоўвалі кожную моўную адзінку, арыентуючыся на асаблівасці яе ўжывання ў маўленні. Менавіта пры такім падыходзе можна забяспечыць асэнсаванне цеснай узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці ўсіх аспектаў і ўзроўняў моўнай сістэмы: фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу і стылістыкі. Такі падыход накіроўвае на тое, каб вучні:

на ўроках мовы не абмяжоўваліся аналізам моўных фактаў і з'яў, а шмат увагі аддавалі сінтэзу – складанню сказаў рознай будовы і функцыянальнага прызначэння, стварэнню звязных выказванняў;

пры вывучэнні марфалогіі вызначалі, якую сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю выконвае тая ці іншая часціна мовы; вучыліся адрозніваць часціны мовы і іх формы на аснове склонавых і сінтаксічных пытанняў;

сістэматычна і паслядоўна фарміравалі і развівалі арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход дае магчымасць рэальна забяспечыць дзейнасць вучняў у розных маўленчых сітуацыях, што з'яўляецца асновай фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

У сувязі з гэтым на першы план у моўнай падрыхтоўцы вучняў выходзіць удасканаленне іх маўленчай практыкі, якая наладжваецца ў форме суразмоўніцтва, пісьма, чытання, пераказу і абмеркавання радыё- і тэлеперадач, вучэбных лекцый, дакладаў, паведамленняў.

Рытарычны падыход накіраваны на фарміраванне ў вучняў ведаў аб правілах маўленчых зносін, авалоданне дыялагічнымі і маналагічнымі сродкамі маўленчага майстэрства, спосабамі ўзаемаразумення і г.д. і садзейнічае фарміраванню ў вучняў рытарычнай кампетэнцыі.

Лінгвакультуралагічны падыход звязаны з усведамленнем мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы і садзейнічае фарміраванню ў вучняў лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі.

Сацыякультурны падыход накіраваны на асэнсаванне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін, фарміраванне нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, выхаванне каштоўнасных адносін да беларускай мовы і культуры, павагі да культурных каштоўнасцей народаў свету і садзейнічае фарміраванню ў вучняў сацыякультурнай кампетэнцыі.

Асноўныя прынцыпы адбору зместу навучання беларускай мове:

сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання ўсіх узроўняў моўнай сістэмы (фанетыка, лексіка, фразеалогія, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія, сінтаксіс, арфаграфія, пунктуацыя) і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню (роля, якую яны выконваюць у маўленні);

прынцып мінімізацыі моўнага і маўленчага тэарэтычнага матэрыялу патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач моўнай адукацыі;

камунікатыўна-рытарычны прынцып азначае, што працэс навучання патрэбна забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып тэкстацэнтрызму мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту: тэкст разглядаецца ў якасці мэты (камунікатыўныя ўменні пададзены ў мэце навучання), зместу (вучні

авалодваюць уменнямі ствараць тэксты розных тыпаў, стыляў і жанраў) і выніку навучання (авалоданне мовай як сродкам зносін).

Лінгвістычны матэрыял падаецца ў праграме лінейна: у V класе вывучаюцца фанетыка і арфаэпія, графіка і арфаграфія, лексіка і фразеалогія; у VI класе – склад слова і словаўтварэнне, назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, у VII – дзеяслоў і яго формы (дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе), прыслоўе, службовыя часціны мовы і выклічнік. Сістэматычны курс сінтаксісу з'яўляецца прадметам вывучэння ў VIII–IX класах. Аднак першапачатковыя звесткі пра сінтаксіс і пунктуацыю ўводзяцца ўжо ў V класе. Гэта дазваляе на практыцы забяспечыць рэалізацыю такога метадычнага прынцыпу, як вывучэнне марфалогіі на сінтаксічнай аснове (пры вывучэнні часцін мовы выяўляецца іх сінтаксічная функцыя ў сказе). Акрамя таго, задоўга да вывучэння сістэматычнага курса сінтаксісу і пунктуацыі вучні знаёмяцца з асноўнымі сінтаксічнымі паняццямі, што дазваляе фарміраваць у іх пунктуацыйныя ўменні і навыкі, развіваць і ўдасканальваць граматычны лад маўлення, вучыць складаць словазлучэнні рознай будовы, сказы, тэксты і карыстацца імі ў практычнай маўленчай дзейнасці.

У кожным класе прадугледжваюцца ўводныя ўрокі, якія раскрываюць ролю і значэнне беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Гэтыя ўрокі даюць магчымасць фарміраваць лінгвістычны светапогляд і ствараюць эмацыянальны настрой, што садзейнічае павышэнню цікавасці да прадмета і паспяховага яго вывучэння. Веды, атрыманыя на гэтых уроках, падагульняюцца і сістэматызуюцца ў раздзеле «Агульныя звесткі пра мову», які завяршае сістэматычны курс беларускай мовы ў XI класе.

Значнае месца ў праграме адводзіцца паўтарэнню вывучанага. У V класе раздзел «Паўтарэнне вывучанага ў I–IV класах», з'яўляючыся неабходным звяном паміж I і II ступенямі агульнай сярэдняй адукацыі, скіраваны на вырашэнне наступных задач: узнавіць і актуалізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды, уменні і навыкі, набытыя ў пачатковых класах; у межах магчымага выявіць і ліквідаваць недахопы.

Работа па развіцці маўлення арганізуецца на кожным уроку, пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай мовы. Асобныя гадзіны на развіццё маўлення па гэтай прычыне не выдзяляюцца. Праграма адводзіць асобныя гадзіны толькі на пісьмовыя работы (напісанне пераказаў, перакладаў, сачыненняў, розных відаў дыктантаў).

У адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да моўнай і маўленчай падрыхтоўкі вучняў узмоцнена маўленчая накіраванасць курса беларускай мовы. Пры гэтым маўленчая тэорыя (маўленчыя паняцці: тэкст і яго будова, тып, стыль і жанр маўлення) набліжана да патрабаванняў практыкі, яна з'яўляецца асновай для свядомага фарміравання ўменняў і навыкаў камунікацыі. Апора на маўленчыя паняцці і правілы маўленчых паводзін садзейнічае свядомаму ўдасканаленню вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, павышэнню культуры маўленчых паводзін.

Вывучэнне сінтаксісу ў VIII–IX класе наладжваецца на аснове структурна-семантычнага падыходу, адметнай асаблівасцю якога з'яўляецца тое, што пры аналізе моўных з'яў прымаецца пад увагу не адзін які-небудзь аспект, а некалькі. Найважнейшымі з іх з'яўляюцца будова, значэнне і функцыя.

Шмат увагі надаецца выпрацоўцы ўменняў, неабходных для таго, каб тая ці іншая моўная з'ява выкарыстоўвалася ў маўленчай практыцы. Пры такой арганізацыі навучання галоўным дыдактычным матэрыялам з'яўляюцца тэксты, на аснове якіх вырашаюцца задачы, накіраваныя на засваенне нормаў літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачаецца слоўнік вучняў, забяспечваецца іх выхаванне і развіццё. Выбар тэксту як дыдактычнай адзінкі стварае сінтаксічную аснову вывучэння моўных з'яў, якія па-за тэкстам не могуць раскрыць сваіх функцыянальных магчымасцей. Толькі ўступаючы ў граматыка-семантычныя адносіны ў тэксце, моўныя адзінкі здольныя перадаць змест выказвання. Тэкст на ўроках мовы з'яўляецца сродкам удасканалення камунікатыўных здольнасцей вучняў, забяспечвае магчымасць для развіцця маўленчых навыкаў слухання і разумення, чытання, гаварэння і пісьма.

Асноўная частка праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (тэарэтычны матэрыял), аперацыйнага (спосабы дзейнасці) і практычнага (уменні і навыкі), што ў сукупнасці і складае змест навучання.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень; з іх 10 гадзін – на пісьмовыя работы)

Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету

(1 гадзіна)

Паўтарэнне вывучанага ў V–VIII класах

(4 гадзіны)

Паўтарэнне вывучанага пра тэкст, стылі і тыпы маўлення.

Чытанне тэкстаў, вызначэнне яго асноўных прымет (тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць).

Падзел тэкстаў на сказы і лагічныя часткі. Вызначэнне сказаў, якія выражаюць асноўны сэнс паведамлення і якія яго пашыраюць. Разгортванне сэнсу частак шляхам далучэння самастойна складзеных сказаў. Увядзенне ў тэкст новых частак.

Вызначэнне тэмы, адрасата і мэтанакіраванасці выказванняў, знаходжанне ў іх апорных слоў і словазлучэнняў.

Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі. Тыпы простых сказаў па мэце выказвання, інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя) і будове (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя, ускладненыя).

Чытанне і аналіз тэкстаў розных стыляў і жанраў, выяўленне ў іх двухсастаўных, аднасастаўных, няпоўных і ўскладненых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Знаходзіць у тэкстах сказы, якія выражаюць асноўную думку паведамлення, разгортваць словазлучэнні і сказы. Ставіць знакі прыпынку ў сказах ускладненай будовы. Вызначаць тып тэкстаў, выяўляць у іх апорныя словы і словазлучэнні, сродкі сувязі сказаў і лагічных частак; ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў, пашыраць тэксты; рабіць сінтаксічны разбор простых сказаў.

Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне

(4 гадзіны, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Паняцце пра складаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў.

Аналіз тэкстаў-разважанняў публіцыстычнага стылю. Вызначэнне адрасата, тэмы, асноўнай думкі, асаблівасцей будовы і стылістычных прымет, падзел на лагічныя часткі, знаходжанне ў іх складаных сказаў, вызначэнне сродкаў сінтаксічнай сувязі граматычных частак.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту з дадатковымі заданнямі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; вызначаць тэксты-разважанні публіцыстычнага стылю, выяўляць іх адрасата і мэтанакіраванасць, дзяліць на лагічныя часткі; ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; ствараць складаныя сказы розных тыпаў.

Рабіць падрабязны пераказ тэксту.

Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(6 гадзін)

Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

Пераклад тэкстаў лінгвістычнай тэматыкі з рускай мовы на беларускую.

Перабудова простых сказаў з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаных – у простыя. Інтанаванне тэкстаў са складаназлучанымі сказамі. Вызначэнне ролі складаназлучаных сказаў у тэкстах.

Падрыхтоўка вусных і пісьмовых паведамленняў на лінгвістычную тэму з апісаннем моўных з'яў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць складаназлучаныя сказы ў тэкстах, правільна інтанаваць, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; складаць складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваць іх у самастойных вусных і пісьмовых выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаныя – у простыя; рабіць сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў.

Перакладаць тэксты лінгвістычнай тэматыкі з рускай мовы на беларускую. Рыхтаваць вусныя і пісьмовыя выступленні з дакладным апісаннем моўных з'яў.

Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(17 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Паняцце пра складаназалежны сказ.

Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснымі часткамі месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнымі, параўнальнымі, спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку).

Чытанне тэкстаў, назіранне за парадкам частак у складаназалежных сказах, вызначэнне межаў галоўнай і даданай частак, месца даданай часткі адносна галоўнай, інтанаванне і пастаноўка знакаў прыпынку.

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі.

Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак (азнаямленне), знакі прыпынку ў іх.

Аналіз публіцыстычных тэкстаў, вызначэнне іх жанру (нататка, інтэрв'ю, рэпартаж, нарыс), адрасата, мэтанакіраванасці, будовы, стылістычных прымет. Перабудова простых сказаў з адасобленымі даданымі членамі ў складаназалежныя. Падрабязны пераказ тэксту.

Пераклад з рускай мовы на беларускую тэксту публіцыстычнага стылю.

Кантрольны дыктант.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданай часткі; складаць складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць простыя сказы з адасобленымі даданымі членамі ў складаназалежныя; рабіць сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты публіцыстычнага стылю.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
(13 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Складанне бяззлучнікавых складаных сказаў рознай тэматыкі, іх інтанаванне, уключэнне ў тэксты ўласных паведамленняў. Перабудова бяззлучнікавых складаных сказаў у простыя, складаназлучаныя і складаназалежныя, складаназлучаных і складаназалежных – у бяззлучнікавыя.

Аналіз мастацкіх тэкстаў: вызначэнне адрасата і адрасанта, тэмы паведамлення, мэтанакіраванасці, характарыстыка выяўленчых моўных сродкаў; абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання бяззлучнікавых складаных сказаў.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту з дадатковымі заданнямі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі, інтанаваць сказы ў адпаведнасці з сэнсам, ставіць знакі прыпынку; ужываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні; выконваць сінанімічныя замены сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор бяззлучнікавага складанага сказа.

Пераказваць тэкст, дакладна перадаючы яго змест, будову і моўнае афармленне.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

Знаходжанне складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у тэкстах, складанне сказаў і ўвядзенне іх у тэкст. Перабудова складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у простыя, складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя.

Аналіз біяграфій беларускіх пісьменнікаў ці лінгвістаў. Вызначэнне паслядоўнасці развіцця думкі ў залежнасці ад жанру і стылю тэкстаў. Абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання выяўленчых моўных сродкаў, у тым ліку сказаў з рознымі відамі сувязі частак. Напісанне заявы, аўтабіяграфіі.

Кантрольны дыктант.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах складаныя сказы з некалькімі відамі сувязі частак, абгрунтоўваць мэтазгоднасць іх ужывання, складаць новыя сказы, карыстацца імі ў маўленні, ставіць знакі прыпынку; перабудоўваць сказы з рознымі відамі сувязі частак у сказы іншай граматычнай структуры; рабіць сінтаксічны разбор сказа з рознымі відамі сувязі частак.

Пісаць заяву, аўтабіяграфію.

Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне
(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Спосабы перадачы чужой мовы.

Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

Маналог. Дыялог, яго афармленне на пісьме.

Сказы з ускоснай мовай.

Аналіз публіцыстычных, мастацкіх і навуковых тэкстаў, вызначэнне ў іх чужой мовы, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання і спосабаў перадачы. Замена ў тэкстах простай мовы на ўскосную і наадварот. Стварэнне тэкстаў (маналогаў і дыялогаў), іх інтанаванне.

Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме. Эпіграф.

Падрыхтоўка тэкстаў дыскусійных выступленняў з цытаваннем першакрыніц.

Кантрольная тэставая работа.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Выяўляць у тэкстах канструкцыі з простай і ўскоснай мовай, інтанаваць іх, вызначаць асаблівасці будовы, выкарыстоўваць у маўленні, ставіць знакі прыпынку; карыстацца цытатамі ў адпаведнасці з мэтай і характарам выказвання; замяняць простую мову ўскоснай і наадварот.

Рыхтаваць тэксты дыскусійных выступленняў з цытаваннем першакрыніц.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(6 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго асноўныя адзінкі і іх характарыстыка. Узаемасувязь сінтаксісу, лексікі і марфалогіі.

Нормы літаратурнага вымаўлення. Паўтарэнне складаных пытанняў арфаграфіі і пунктуацыі.

Пераклад з рускай мовы на беларускую навукова-папулярных тэкстаў.

Складанне плана паведамлення, тэзісаў, канспекта; выступленне з дакладам; абмеркаванне выступленняў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Рыхтаваць на аснове дзвюх-трох крыніц паведамленне на лінгвістычную тэму: складаць план, тэзісы, канспект, выступаць перад аўдыторыяй; аналізаваць уласнае і чужое выказванне; перакладаць навукова-папулярныя тэксты з рускай мовы на беларускую.

Рэзервовыя гадзіны
(2 гадзіны)

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацаваны ў адпаведнасці з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай

аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Навучанне беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмнага, аксіялагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага, культуралагічнага і культуратворчага падыходаў пры выкладанні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай літаратуры.

Ва ўмовах рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў сучаснай адукацыі вынікам дасягнення мэт і задач літаратурнай адукацыі становяцца прадметныя кампетэнцыі: *літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, маўленчая, камунікатыўная, культуралагічная і культуратворчая*. Рэалізацыя такога падыходу прадугледжвае ўзмацненне дзейнасна-практычнага кампанента літаратурнай адукацыі.

Сістэмны падыход забяспечвае засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру як сістэму, сфарміраваных у выглядзе паняццяў і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці, што з'яўляецца асновай фарміравання *літаратурнай кампетэнцыі*.

Такі падыход накіроўвае на тое, каб вучні:

на ўроках беларускай літаратуры сістэматычна і паслядоўна авалодвалі гісторыка- і тэарэтыка-літаратурнымі ведамі [веды па тэорыі літаратуры – мастацкі твор, яго структура, сістэма вобразаў, аўтарская пазіцыя і інш.; тыпы літаратурнай творчасці (паэзія, проза); літаратурныя роды і жанры; асноўныя мастацкія кірункі і плыні і інш.]; [веды гісторыка-літаратурныя – звесткі пра шляхі і галоўныя этапы развіцця беларускай літаратуры ва ўзаемасувязі з сусветнай, найбольш важныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, пра гісторыю напісання твораў і інш.];

ажыццяўлялі чытацкую дзейнасць – чытанне мастацкіх твораў, валоданне тэхнікай і культурай чытання, неабходнай для ўспрымання, аналізу і інтэрпрэтацыі мастацкага твора; логіка-паняційная, аналітыка-сінтэтычная і ацэначная дзейнасць, накіраваная на індывідуальна-асобаснае прачытанне, успрыманне і засваенне мастацкага твора, яго родава-жанравых, кампазіцыйных асаблівасцей, маральна-эстэтычных вартасцей, грамадскага значэння, сувязі з эпохай.

Аксіялагічны падыход прадугледжвае фарміраванне ў вучняў сродкамі беларускай літаратуры сістэмы духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, гуманістычнага погляду на свет, выхаванне павагі да агульначалавечых культурных каштоўнасцей і садзейнічае фарміраванню ў вучняў *каштоўнасна-светапоглядной кампетэнцыі*.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход вызначае такую накіраванасць зместу навучання, пры якой засваенне яго адбываецца шляхам фарміравання ўсіх структурных кампанентаў маўленча-камунікатыўнай дзейнасці, і вучань разглядаецца як суб'ект дзейнасці і зносін, што з'яўляецца асновай фарміравання *маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый*.

Выхаванне маўленчай культуры, фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў, што забяспечваюць эфектыўнасць зносін у розных сферах чалавечай дзейнасці, – неабходная ўмова сацыялізацыі навучэнцаў. Развітое маўленне вучня – шлях да актыўнага самавыражэння і прызнання маўленчай асобы як у міжсуб'ектнай камунікацыі (у штодзённых стасунках з бацькамі, сябрамі, знаёмымі), так і ў дзелавой сферы (пры стварэнні вучэбных выказванняў на абсалютнай большасці ўрокаў па розных прадметах; у далейшай прафесійнай дзейнасці тых выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія стануць прадстаўнікамі шэрага спецыяльнасцей з павышанай камунікатыўнай адказнасцю – сфера дзейнасці «чалавек – чалавек»).

У адносінах да літаратурнай адукацыі камунікатыўна-дзейнасны падыход звязаны з самавыяўленнем вучняў у розных відах маўленчай практыкі, авалоданнем імі жанрамі

мастацкай літаратуры (казка, загадка, верш, байка, невялікая п'еса, пейзажныя і партрэтныя замалёўкі; пераклады мастацкіх тэкстаў); публіцыстычнымі жанрамі (нататка ў газету, інтэрв'ю, рэпартаж, водгук, рэцэнзія на прачытаны літаратурны твор, на твор жывапісу, музыкі, кінафільм або тэлеперадачу); літаратурна-крытычнымі жанрамі (праблемнае сачыненне, прадмова / пасляслоўе да прачытанай кнігі, анатацыя, эсэ, даклад, рэферат на літаратурную тэму); вучэбна-традыцыйнымі жанрамі (характарыстыкі – індывідуальныя, параўнальныя, групавыя – літаратурных герояў, сачыненні на літаратурную тэму, сачыненні на аснове асабістых назіранняў, уражанняў, разважанняў аб розных з'явах жыцця).

Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення рэалізуецца праз разнастайнасць метадычных формаў і прыёмаў, захаванне сістэматычнасці, пераемнасці і практычнай накіраванасці гэтай працы ў розных узроставых групах.

Культуралагічны падыход звязаны з усведамленнем вучнямі літаратуры як феномена культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай літаратуры ў адзінстве з сусветнай мастацкай культурай, прадугледжвае развіццё здольнасці карыстацца культуразнаўчай інфармацыяй для патрэб камунікацыі і садзейнічае фарміраванню ў вучняў культуралагічнай кампетэнцыі.

Мэтай і вынікам рэалізацыі ў навучанні літаратуры *культуратворчага падыходу з'яўляецца культуратворчая кампетэнцыя*. Фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі вучняў у працэсе навучання беларускай літаратуры – гэта фарміраванне не асобных базавых ведаў, літаратурна-творчых уменняў і навыкаў, а сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, г. зн. навучанне ў дзейнасці праз уключэнне ў гэтую дзейнасць. Адукацыйны працэс трэба наладжваць так, каб на кожным уроку пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» вучні авалодвалі вопытам літаратурна-творчай дзейнасці. Рэалізацыя гэтай задачы адбываецца праз шырокае выкарыстанне відаў прадметна-творчай дзейнасці, якія рэалізуюць практыка-арыентаваны характар літаратурнай адукацыі. Вучэбны матэрыял, звязаны з фарміраваннем культуратворчай кампетэнцыі, пададзены ў раздзелах «Асноўныя віды вучэбнай дзейнасці вучняў па літаратуры» і «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Аснову зместу беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета складаюць чытанне і тэкстуальнае вывучэнне высокамастацкіх твораў нацыянальнай класікі і вядомых майстроў слова. Гэтыя творы вызначаюцца багатым пазнавальным і выхаваўчым патэнцыялам, з'яўляюцца даступнымі для вучняў пэўнага ўзросту. Цэласнае ўспрыманне і разуменне літаратурных твораў, фарміраванне ўменняў аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі тэкст магчыма толькі пры адпаведнай эмацыянальна-эстэтычнай рэакцыі чытача.

Курс V класа ў сістэме адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі навучэнцаў займае асобае месца як пераходны ад пачатковага этапа навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне).

Прапедэўтычны курс літаратуры мае на мэце сфарміраваць у вучняў уяўленне пра літаратуру як чалавеказнаўства і як мастацтва слова, якому ўласцівыя адметныя спосабы вобразнага адлюстравання жыцця. Усведамленне вучнямі чалавеказнаўчага аспекту літаратуры – пазнання свету і чалавека праз мастацкае, эстэтычнае іх адлюстраванне і ўспрыманне, праз маральна-эстэтычную ацэнку рэчаіснасці, жыццёвых з'яў і падзей – асноўнае ў курсе літаратуры V класа. Галоўным аб'ектам на ўроку літаратуры з'яўляецца мастацкі твор, яго жыццёва-пазнавальныя, мастацка-эстэтычныя, каштоўнасна-ацэначныя якасці.

Асноўная задача настаўніка на ўроках літаратуры ў V класе заключаецца ў тым, каб зацікавіць вучняў чытаннем, скіраваць іх увагу на пазнанне мастацкай прыроды фальклорных і літаратурных твораў, навучыць успрымаць літаратуру як мастацтва слова.

Напрамак вывучэння літаратуры ў V класе і прынцыпы структуравання зместу вызначаны ў адпаведнасці з логікай чытацкага ўспрымання мастацкага твора, калі асваенне жыццёвага матэрыялу (зместу) у яго вобразным увасабленні натуральна спалучаецца з пазнаннем і ўсведамленнем галоўных асаблівасцей літаратуры як

мастацтва. Матэрыял пададзены сістэмна, згрупаваны ў адпаведныя тэматычныя блокі, для таго каб вучні авалодвалі параўнальным падыходам у працэсе аналізу мастацкіх твораў і іх кампанентаў. У выніку такога структуравання зместу кожны асобны твор выступае як адметная мастацкая з'ява, а ўсе тэксты, разам узятыя, дазваляюць убачыць ідэйна-тэматычную разнастайнасць літаратуры, яе эстэтычнае багацце. Пры гэтым настаўнік у працэсе асэнсавання твора дапамагае вучням назапашваць неабходныя літаратурныя веды на аснове засваення сутнасці канкрэтных тэарэтычных паняццяў. Па тэорыі літаратуры адабраны асобныя, даступныя ўзросту вучняў паняцці, звязаныя з мастацкім творам і яго кампанентамі (тэма, сюжэт, літаратурны герой у мастацкім творы; моўныя вобразныя сродкі – эпітэт, параўнанне), а таксама звесткі пра фальклор і некаторыя яго жанры.

У адпаведнасці з узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі пяцікласнікаў, іх жыццёвым і чытацкім вопытам быў вызначаны змест курса літаратуры – фальклорныя і літаратурныя творы, больш складаныя (у параўнанні з IV класам) і разнастайныя па тэматыцы і жанрах, мастацкіх асаблівасцях, якія даюць магчымасць шырокага «агляду» жыцця. Паколькі ў падлеткавым узросце фарміруецца сістэма каштоўнасных адносін да жыцця, адбываецца працэс самаўсведамлення асобы, яе духоўнага станаўлення, вялікая ўвага надаецца творам гераічнага, рамантычнага зместу, якія выяўляюць найважнейшыя грамадзянскія, маральна-этычныя якасці ў характары і паводзінах чалавека, яго адносінах да Радзімы, яе мінулага і сучаснага, да сваёй культуры і мовы, да захавання прыроды і г. д.

Такім чынам, у курсе літаратуры V класа дамінуе жанрава-тэматычны падыход, а ў цэнтры знаходзіцца мастацкі твор і яго будова.

Навучанне беларускай літаратуры ў VI класе з'яўляецца працягам прапедэўтычнага курса, распачатага ў V класе, які будуецца з улікам пераемнасці з папярэднімі этапамі навучання і паступова, мэтанакіравана падводзіць вучняў да ўспрымання літаратуры на больш высокім узроўні ў наступных класах. Праграма прапануе творы больш складаныя па змесце і разнастайныя па сваіх мастацкіх асаблівасцях, працягвае знаёмства вучняў з жанрамі і тэматыкай фальклорных і літаратурных твораў, найважнейшымі прыёмамі і сродкамі вобразнага адлюстравання свету.

Пры вывучэнні твораў асаблівая ўвага ўдзяляецца паўнавартаснаму ўспрыманню вучнямі зместу і сэнсу прачытанага, пашырэнню іх чалавеказнаўчых, жыццёвых і эмацыянальна-вобразных уяўленняў. Па-ранейшаму вядучай застаецца ўстаноўка на ўсведамленне глыбіні і непаўторнасці мастацкага слова. Вывучэнне літаратурных твораў адбываецца ў адпаведнасці з логікай спасціжэння мастацтва слова: першаснае ўспрыманне – аналіз – абагульненне. У аснове зместу праграмы ляжыць ідэя Радзімы, родных вытокаў, а таксама агульны прынцып уладкавання Сусвету: я – мой род – народ – родная зямля – чалавецтва. Падабраны тэкставы матэрыял заключае ў сабе вялікі пазнавальны змест, мае несумненнае грамадска-выхаваўчае значэнне, дае вучням уяўленні пра літаратуру як чалавеказнаўства і мастацтва слова, асноўныя тэмы і вобразы літаратурнай творчасці, садзейнічае абуджэнню фантазіі, інтэлектуальнаму развіццю і эстэтычнаму ўзбагачэнню асобы.

Уводзіны ў свет міфатворчасці даюць першапачатковыя звесткі пра ўзнікненне вобразнага мастацкага слова, закладзены абудзіць у малодшых падлеткаў цікавасць да прыгожых і таямнічых поглядаў на свет нашых продкаў, даць уяўленне пра выкарыстанне міфалагічных вобразаў у літаратурных тэкстах.

Духоўнаму сталенню асобы, больш глыбокаму ўспрыманню нацыянальных каштоўнасцей і традыцый беларускага народа паспрыяе разгляд жанраў вусна-паэтычнай творчасці і літаратурнай песні, бо песня з'яўляецца багаццем душы чалавека і яднае народ. Вывучэнне лірычных твораў мае на мэце паглыбіць эстэтычны падыход да ўспрымання паэтычнага слова, адчування яго мілагучнасці, вобразнай яркасці і маляўнічасці на прыкладзе аналізу мастацкіх тропаў.

Празаічныя творы, асабліва вялікія па аб'ёме, вымагаюць папярэдняга самастойнага прачытання. Аднак перад гэтым пажадана звярнуць увагу вучняў на асноўныя моманты зместу і ключавыя пытанні, якія будуць разглядацца ў працэсе аналізу мастацкага тэксту.

Вывучэнне аб'ёмных твораў прозы будзе эфектыўным толькі пры ўмове паўторнага чытання іх фрагментаў у класе, аналізу твора з удзелам настаўніка, які ставіць пытанні, прапануе заданні і робіць каментарыі. Празаічныя тэксты даюць магчымасць для больш шырокага ахопу жыццёвых з'яў і маральных праблем, далучаюць юных чытачоў да разумення характараў герояў і матываў іх учынкаў, адносін да іншых людзей, мінулага і сучаснага, прыроды і Радзімы. Вучні спасцігаюць пазіцыю і канцэпцыю аўтара-апавядальніка, яго ацэнкі і погляды на чалавека і свет. На матэрыяле прозы паглыбляюцца навыкі аналізу мастацкага тэксту, вуснага і пісьмовага пераказу, выразнага чытання. Падлеткі назапашваюць першапачатковыя веды пра асаблівасці эпічнага роду і асобных празаічных жанраў.

Вывучэнне чалавеказнаўчага зместу мастацкай літаратуры і яе аналіз як мастацтва слова павінны быць падпарадкаваны галоўнай задачы – абуджэнню цікавасці да чытання, да беларускай кнігі і роднага слова.

Навучанне беларускай літаратуры ў VII класе накіравана на выхаванне ўдумлівага, дасведчанага чытача, які разбіраецца ў асноўных вартасцях мастацкіх твораў, умее ацэньваць іх змест, мае добрае адчуванне і разуменне спецыфікі літаратуры, дастатковы чытацкі вопыт, уласны эстэтычны густ.

Вучні, якія ў папярэдніх класах пазнаёміліся з разнастайнасцю жанраў і тэматыкі літаратурных твораў, вобразаў, асноўнымі тропамі, працягваюць спасцігаць сутнасць слоўнага мастацтва, спецыфічныя законы яго функцыянавання. У VII класе ўвядзенне ў свет мастацкай літаратуры працягваецца праз параўнальны разгляд двух асноўных відаў (тыпаў) мастацкай творчасці – паэзіі і прозы, а таксама шляхам супастаўлення мастацкіх твораў з творамі публіцыстычнай, навуковай літаратуры.

Галоўнае ў VII класе – даць уяўленне пра літаратуру як мастацкую з'яву ў сістэме яе сувязей з іншымі відамі мастацтва, праз увагу да майстэрства пісьменніка, яго мастацкага таленту, з боку яе ўнутранай мастацка-эстэтычнай дыферэнцыяцыі (паэзія – проза); праз суадносіны з такімі не мастацкімі, але блізкімі да літаратуры па сваіх чалавеказнаўчых функцыях з'явамі, як публіцыстыка, гуманітарныя навукі (гісторыя).

У вучняў VII класа павінна быць сфарміравана ўяўленне пра тое, што паэзія – гэта не толькі рытмічная мова, але і мастацкая творчасць, якая абуджае моцныя перажыванні, пачуцці, выклікае асаблівую настроенасць душы пры ўспрыманні з'яў навакольнай рэчаіснасці. Проза – гэта слоўна-мастацкая творчасць, якой уласцівы шырокі агляд жыцця, аналіз жыццёвых з'яў у іх канкрэтным і вельмі разнастайным праяўленні; гэты від літаратуры пабуджае да разважанняў, пошуку ўласных адказаў на складаныя пытанні і праблемы.

Літаратурны матэрыял у VII класе падаецца асобнымі цыкламі-блокамі, якія аб'ядноўваюць творы, падобныя па сваіх ідэйна-тэматычных і мастацкіх якасцях, выяўляюць пэўныя спецыфічныя асаблівасці літаратуры. Такі падыход да структуравання матэрыялу ў працэсе навучання дае вучню магчымасць паглыбіцца ў мастацка-эстэтычную атмасферу, атрымаць сістэмнае ўяўленне пра суадносіны жанраў, тэм і г. д.

Курс VIII класа засяроджвае ўвагу вучняў на розных спосабах паказу рэчаіснасці і чалавека ў літаратуры, г. зн. на літаратурных родах і адпаведных ім жанрах, жанравых формах з уласцівымі ім вобразна-выяўленчымі асаблівасцямі і сродкамі.

У праграме відавочна павышаюцца патрабаванні да авалодання паэтыкай мастацкага твора. Дзякуючы сістэмнай арганізацыі літаратурнага матэрыялу, мэтанакіраванай падачы яго адпаведнымі блокамі ствараюцца такія дыдактычныя ўмовы і сітуацыі, калі вучань на працягу некалькіх урокаў «пагружаецца» ў пэўную родава-жанравую сістэму і натуральна спасцігае асаблівасці гэтага віду твораў і тыя літаратуразнаўчыя паняцці, якія з імі звязаны. Такі спосаб структуравання зместу забяспечвае дастатковую гатоўнасць вучняў да аналізу мастацкага твора і падводзіць да засваення прадмета ў гісторыка-храналагічным аспекце ў наступных класах.

Праграма ўлічвае індывідуальныя творчыя магчымасці васьмікласнікаў, іх жыццёвы і чытацкі вопыт, агульнае і літаратурнае развіццё. Яна прапануе больш складаныя (у параўнанні з папярэднімі класамі) па змесце і форме творы, замацоўвае і паглыбляе

звесткі па тэорыі літаратуры, знаёміць са спецыфікай адлюстравання рэчаіснасці і чалавека ў лірыцы, эпасе і драме, развівае ўвагу да мастацкага слова, выпрацоўвае адпаведную моўную культуру, фарміруе чытацкія інтарэсы і прыярытэты.

Праграмай прадугледжана вывучэнне літаратуры ў суаднесенасці з іншымі відамі мастацтва: музыкай, жывапісам, тэатрам, кіно, тэлебачаннем; гэта спрыяе ўспрыманню літаратуры як мастацтва, фарміраванню каштоўнасных арыентацый вучня.

Чалавеказнаўчы аспект прадмета – пазнанне свету і чалавека праз іх мастацкае адлюстраванне і ўспрыманне, праз маральна-эстэтычную каштоўнасную ацэнку рэчаіснасці – забяспечваецца падборам твораў, якія даюць магчымасць шырокага агляду жыцця, пранікнення ў самыя разнастайныя яго сферы. Параўнальны спосаб прэзентацыі матэрыялу, які прадугледжвае супастаўленне блізкіх або кантрасных па змесце і форме твораў, садзейнічае спасціжэнню галоўных асаблівасцей літаратуры і іншых відаў мастацтва, узмацняе развіццёвую скіраванасць курса.

У васьмікласнікаў мэтанакіравана фарміруюцца эстэтычны падыход да мастацкага твора, свядомыя адносіны да яго ўспрымання і ацэнкі. Эфектыўнасць літаратурнага навучання дасягаецца ў працэсе аналізу зместу і формы, спасціжэння аўтарскай канцэпцыі свету і чалавека, асэнсавання канфлікту, характараў герояў, матываў іх паводзін і ўчынкаў. Выхаваўчае ўздзеянне твора на чытачоў ажыццяўляецца ўсёй яго цэласнай мастацкай прыродай. Этычнае і эстэтычнае разглядаюцца ў гарманічным адзінстве.

Па тэорыі літаратуры вылучаны тэрміны і паняцці, звязаныя з літаратурнымі родамі і жанрамі.

Праграма складаецца з пяці раздзелаў, у кожнага з іх – свае пазнавальныя, дыдактычныя, выхаваўчыя задачы. Параўнальны аналіз твораў, прадстаўленых у першым раздзеле, тэматычна блізкіх, але розных у мастацкіх адносінах (верш, апавяданне, драма), дасць вучням эмпірычнае ўяўленне пра спосабы адлюстравання рэчаіснасці ў лірыцы, эпасе, ліра-эпасе, драме. Наступныя раздзелы дапамогуць усвядоміць асаблівасці кожнага літаратурнага роду, яго фальклорныя вытокі, удасканаліць навыкі аналізу твораў розных жанраў з улікам іх родавай спецыфікі. Вывучэнне лірычных твораў спрыяе паглыбленню эстэтычнага ўспрымання вучняў, абвастрае адчуванне паэтычнага слова, яго яркасці, вобразнасці, мілагучнасці. Эпічныя, ліра-эпічныя і драматычныя творы дапамагаюць спасцігнуць жыццёвыя рэаліі і маральныя праблемы, зразумець характары герояў, матывы іх паводзін і ўчынкаў, усвядоміць аўтарскую пазіцыю пісьменніка, даведацца пра мінулае і сучаснае.

Асноўная мэта навучання беларускай літаратуры ў IX класе – сфарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне пра беларускую літаратуру ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя, дапамагчы асэнсаваць ідэйна-мастацкі змест лепшых твораў беларускага мастацкага слова. На гэтым этапе навучання інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў вучэбную праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Гісторыка-храналагічны прынцып канструявання зместу літаратурнай адукацыі ў IX класе паспрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. У працэсе навучання ў IX класе паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

У IX класе вядзецца работа па актуалізацыі, паглыбленні і сістэматызацыі ведаў і ўменняў, атрыманых у папярэдніх класах. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання з'яўляецца сарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца агульныя і ўласна мастацкія здольнасці. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў.

Для развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў пры навучанні беларускай літаратуры мэтазгодна прадугледжваць рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Руская літаратура», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)», «Гісторыя Беларусі». Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

У адукацыйнай практыцы могуць выкарыстоўвацца як традыцыйныя, так і электронныя сродкі навучання, якія павінны быць скіраваны на дасягненне мэт і задач літаратурнай адукацыі.

Літаратуры ў сістэме адукацыі і выхавання належыць асаблівая культуратворчая роля: яна здольная пераўтвараць унутраны свет асобы і ўплываць на духоўнае ўзбагачэнне жыцця, рабіць яго па-сапраўднаму цікавым, змястоўным, насычаным. З гэтай прычыны неабходна імкнуцца ўключыць вучняў у працэс пазакласнай работы і выхавання.

Факультатыўныя заняткі, праца літаратурных гурткоў, сістэматычны выпуск насценных і радыёгазет, бюлетэняў, часопісаў і альбомаў; падрыхтоўка спецыяльных літаратурных стэндаў, тэматычных выставак, аглядаў сучаснай літаратуры; правядзенне літаратурных ранішнікаў, вечароў, віктарын, алімпіяд і свят, сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры і мастацтва – усё гэта спрыяе стварэнню ў класе атмасферы творчасці, духоўнасці, павагі да кнігі, да мастацкага слова.

Для арганізацыі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры ў V–IX класах распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбныя праграмы, дапаможнікі для вучняў і дапаможнікі для настаўнікаў.

На вывучэнне літаратуры ў V–VI класах адведзена па 70 гадзін (з іх адпаведна 62 гадзіны – на вывучэнне твораў, 4 гадзіны – на творчыя работы, 4 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання), у VII–VIII класах – 53 гадзіны (з іх 47 гадзін – на вывучэнне твораў, 4 гадзіны – на творчыя работы, 2 гадзіны – на ўрокі па творах для

дадатковага чытання). У IX класе таксама 53 гадзіны (з іх 48 гадзін – на вывучэнне твораў, 4 гадзіны – на творчыя работы, 1 гадзіна – на ўрок па творах для дадатковага чытання).

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.[16]

[16] Творы, прапанаваныя ў спісе для дадатковага чытання, можна знайсці ў кнігах серыі «Школьная бібліятэка», якія знаходзяцца ў бібліятэчным фондзе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Рэзерв вучэбнага часу настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарна-тэматычным планам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(53 гадзіны)

Уводзіны

(1 гадзіна)

Літаратура як частка сусветнай культуры. Нацыянальнае і агульначалавечае ў мастацтве слова. Асноўныя напрамкі, стылі, жанры мастацкай літаратуры.

Міфалогія – фальклор – літаратура

(1 гадзіна)

Узнікненне мастацтва слова. Міфалогія як першапачатковая «навуковая» карціна свету. Спецыфіка фальклору як мастацтва слова. Беларуская народная творчасць як крыніца станаўлення і ўзбагачэння літаратуры (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Якуб Колас і інш.). «Вечныя вобразы» ў фальклоры і літаратуры. Водгукі ідэй, вобразаў, сюжэтаў антычнасці ў беларускай літаратуры, наследаванні антычных матываў беларускімі паэтамі, традыцыі антычнага эпасу (паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», Максім Багдановіч. «Калі звалiў дужы Геракл у пыл Антэя...», «Пентаметры»; Якуб Колас. «Новая зямля» і інш.).

Тэорыя літаратуры. Агульнае паняцце пра антычную літаратуру. Паняцце пра «вечны вобраз».

Мастацтва[1]**.** Музыка: А. Лядаў. Сімфанічныя паэмы «Баба Яга», «Чароўнае возера»; Ю. Семяняка. Аперэта «Сцяпан – вялікі пан». А. Хачатуран. Балет «Спартак».

[1] Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца ў першую чаргу з апорай на вядомае і на выбар настаўніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Літаратура эпохі Сярэднявечча

(3 гадзіны)

Агульная характарыстыка літаратуры Сярэднявечча

(1 гадзіна)

Пачатковы перыяд развіцця славянскай пісьменнасці (XI–XII стст.); тэматычная і жанравая разнастайнасць перакладной і арыгінальнай літаратуры. Кірыла Тураўскі – пісьменнік і прамоўца.

«Жыціе Еўфрасінні Полацкай» (1 гадзіна).

Адлюстраванне жыцця і дзейнасці беларускай асветніцы. Духоўны подзвіг Еўфрасінні Полацкай. Рэальныя і гістарычныя факты ў творы. Адметнасць кампазіцыі «Жыція...».

Беларускі летапіс («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1430–1446 гг.» і інш.) (урывак «Пахвала Вітаўту») (1 гадзіна).

Беларускія летапісы як вытокі мастацкай прозы. Адлюстраванне гістарычнага мінулага ў летапісных творах, іх патрыятычны пафас. Адметнасць жанру і кампазіцыі твора. Услаўленне ў старажытным беларускім летапісе міжнароднага аўтарытэту князя Вітаўта, яго гераічных подзвігаў.

Тэорыя літаратуры. Агульнае паняцце пра жанры старажытнай літаратуры (жыціе, хаджэнне, летапіс).

Мастацтва. Архітэктура: Сафійскі сабор у Кіеве (XI ст.); Сафійскі сабор у Ноўгарадзе (XII ст.); Сафійскі сабор у Полацку (XII ст.); Каложская царква ў Гродна (XII ст.). Скульптура: помнік Кірылу Тураўскаму (Тураў. Скульптар М. Інькоў, архітэктар М. Лук'янчык); М. Інькоў. «Кірыла Тураўскі»; І. Пратасеня. «Кірыла Тураўскі». Жывапіс: М. Басалыга. «Бітва на Нямізе ў 1067 годзе»; Я. Драздовіч. «Усяслаў Чарадзей пад Гародняй»; А. Кашкурэвіч. «Еўфрасіння Полацкая – асветніца»; П. Сергіевіч. «Усяслаў Полацкі». Музыка: А. Мдывані, В. Елізар'еў. Балет «Страсці».

Літаратура эпохі Адраджэння

(5 гадзін)

Агульная характарыстыка літаратуры эпохі Адраджэння (XIV–XVI стст.). Пашырэнне гуманістычнага светаўспрымання і светаадчування. Чалавек як мера каштоўнаснага і прыгожага ў мастацтве (1 гадзіна).

Францыск Скарына. Прадмовы да кніг «Псалтыр», «Юдзіф» (1 гадзіна).

Францыск Скарына – першадрукар і асветнік, яго жыццё і творчая дзейнасць. Імкненне Францыска Скарыны наблізіць кнігу да народа (прадмовы, старабеларуская мова, тлумачэнні). Сцвярджэнне ідэй патрыятызму, вернасці грамадзянскаму абавязку, духоўнай моцы і трываласці ў прадмове да кнігі «Юдзіф».

Агульнаславянскае і еўрапейскае значэнне дзейнасці Францыска Скарыны.

Сымон Будны і Васіль Цяпінскі як прадаўжальнікі традыцый Францыска Скарыны (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць асветнікаў. Дэмакратычная і патрыятычная скіраванасць іх творчасці. Васіль Цяпінскі пра навучанне на беларускай мове. Развіццё кнігадруку ў Беларусі і яго роля ў культурным прагрэсе.

Мікола Гусоўскі. Паэма «Песня пра зубра» (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

«Песня пра зубра» як выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння. Жанр, сюжэт і кампазіцыя паэмы. Сістэма вобразаў у творы. Сімвалічнае значэнне вобраза зубра. Увасабленне рэнесансавых ідэй у вобразе Вітаўта. Беларуская прырода ў адлюстраванні паэта. Тэма вайны і міру. Мікола Гусоўскі як паэт-гуманіст.

Паэма ў перакладзе на сучасную беларускую мову Язэпа Семяжона.

Тэорыя літаратуры. Агульнае паняцце пра эпоху Адраджэння. Гуманізм, агульначалавечыя каштоўнасці ў літаратуры.

Мастацтва. Архітэктура: універсітэт у Падуі (XV ст.); Карлаў мост у Празе (XIII–XV стст.). Скульптура: З. Азгур. «Францыск Скарына»; А. Глебаў. Помнік Ф. Скарыну ў Полацку; помнік С. Буднаму (Нясвіж. Скульптар С. Гарбунова, архітэктар Ю. Казакоў); А. Шатэрнік. «Мікола Гусоўскі». Жывапіс: І. Ахрэмчык. «Францыск Скарына»; М. Басалыга. «Мікола Гусоўскі»; Г. Вашчанка. «Роднае слова. Францыск Скарына»; А. Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да «Песні пра зубра»; Я. Кулік. Ілюстрацыі да кнігі «Песня пра зубра»; Л. Шчамялёў. «Францыск Скарына. Вяртанне». Музыка:

Д. Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: «Я, Францыск Скарына» (рэж. Б. Сцяпанаў).

Барока. Класіцызм. Асветніцтва
(1 гадзіна)

Асаблівасці стылю барока. Праявы барока ў беларускай літаратуры і мастацтве. Неадпаведныя ўмовы для развіцця класіцызму і іншых мастацкіх напрамкаў у беларускай літаратуры. Асветніцкі рэалізм. Свецкая сатырычная літаратура («Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча»). Вершаскладанне на беларускай мове (Андрэй Рымша, Сімяон Полацкі, ананімныя творы). Станаўленне беларускага тэатра (батлейка, школьныя драмы і інтэрмедыі).

Тэорыя літаратуры. Агульнае паняцце пра барока, класіцызм, асветніцтва ў літаратуры.

Мастацтва. Архітэктура: Мірскі замак; Нясвіжскі палац. Жывапіс: партрэты Юрыя Радзівіла (XVI ст.), Януша Радзівіла (XVII ст.), Ежы Радзівіла (XVII ст.). Музыка: М. Агінскі. Паланэз «Развітанне з Радзімай»; І. С. Бах. «Брандэнбургскія канцэрты». Кінамастацтва: «Ветрык арэляў» (рэж. С. Гайдук); «Паланэз Агінскага» (рэж. Л. Голуб).

Ад старажытнай да новай беларускай літаратуры
(1 гадзіна)

Беларуская літаратура ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя. Пераважна ананімны характар бытавання твораў. Узнікненне камічных, бурлескных твораў (паэма «Энеіда навыварат»). Станаўленне новай беларускай літаратуры і яго асноўныя фактары (цікавасць да фальклору, народнага побыту, гістарычнага мінулага і традыцый). Беларускія і беларуска-польскія пісьменнікі: Ян Чачот, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Вінцэсь Каратынскі, Аляксандр Ельскі (асноўныя постаці на выбар).

Тэорыя літаратуры. Травесційная літаратура. Бурлеск.

Рамантызм як вядучы літаратурны напрамак
(4 гадзіны)

Рамантызм як вядучы літаратурны напрамак у канцы XVIII – першай палове XIX ст. (1 гадзіна).

Перадумовы ўзнікнення рамантызму. Пошукі ідэалу ў мінулым, у фантазіях пра будучыню, у экзатычных землях. Асаблівая ўвага да індывідуальнага свету чалавека.

Адам Міцкевіч. Паэма «Гражына» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Адам Міцкевіч і Беларусь. Паэма «Гражына». Паэтычнае асэнсаванне народнай легенды, гісторыі беларускага народа. Рамантызацыя вобраза Гражыны. Вобразы Рымвіда і Літавура. Здрада ідэалу і духоўны крах асобы. Выяўленне ў творы рамантычнага светаўспрымання. Ідэя вернасці ў творы.

Ян Баршчэўскі. Апавяданні «Шляхціц Завальня», «Плачка» (са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях») (на выбар) (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Галоўны літаратурны твор пісьменніка «Шляхціц Завальня» – зборнік фантастычных апавяданняў. Цесная сувязь кнігі з беларускай міфалогіяй і фальклорам. Роля вобраза Завальні ў творы. Увага да ўнутранага свету герояў. Павучальнасць зместу апавяданняў. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць. Сімволіка вобразаў.

Тэорыя літаратуры. Паняцце пра рамантызм як літаратурны напрамак. Рамантычны герой.

Мастацтва. Архітэктура: палац у Снове (XIX ст.); Дом паляўнічага, палац Паскевічаў у Гомелі (XIX ст.); сядзіба Ваньковічаў у Мінску (XIX ст.). Скульптура: А. Заспіцкі. Помнік Адаму Міцкевічу (Мінск); В. Янушкевіч. Помнік Адаму Міцкевічу (Навагрудак). Жывапіс: В. Ваньковіч. «Партрэт Адама Міцкевіча», «Міцкевіч на скале Аюдаг»; У. Пракапцоў. «А. Міцкевіч. Боль паэта»; В. Шаранговіч. Ілюстрацыі да паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Музыка: Ф. Шапэн. Вальсы, мазуркі; Ф. Шуберт. «Няскончаная сімфонія».

Па шляху сінтэзу: сентыменталізм, рамантызм, рэалізм
(4 гадзіны)

Канстанцін Вераніцын. Паэма «Тарас на Парнасе» (1 гадзіна).

Сатырычны і гуманістычны пафас твора. Сцвярджэнне ідэй народнасці ў літаратуры. Роля міфалагічных персанажаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора. Тарас як тыповы народны герой, рысы яго характару: кемлівасць, абачлівасць, дасціпнасць. Выяўленчае майстэрства аўтара ў абмалёўцы персанажаў. Гісторыка-літаратурнае значэнне паэмы.

Тэорыя літаратуры. Пачатковае паняцце пра народнасць літаратуры. Пародыя і бурлеск у літаратуры (паглыбленне паняццяў).

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Камедыя «Пінская шляхта» (3 гадзіны).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Пінская шляхта». Жанравае вызначэнне, сатырычны і гуманістычны пафас твора. Выкрыццё царскага чыноўніцтва. Вобраз Кручкова, яго тыповасць. Духоўная абмежаванасць засцянковай шляхты. Праблема бацькоў і дзяцей. Вобраз Куторгі. Майстэрства драматурга ў разгортванні інтрыгі, сюжэта, у стварэнні камічнага эфекту. Гратэск і шарж як прыёмы фарса-вадэвіля. Значэнне творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча для беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Фарс і вадэвіль як камедыйныя жанры.

Мастацтва. Скульптура: А. Шатэрнік. «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч» (Мінск); М. Якавенка. Помнік В. Дуніну-Марцінкевічу (Тупальшчына, Валожынскі раён); В. Янушкевіч. «В. Дунін-Марцінкевіч» (гіпс). Жывапіс: І. Рэй. «В. Дунін-Марцінкевіч з дочкамі Камілай і Цэзарынай»; Я. Ціхановіч. «Партрэт Вінцука Дуніна-Марцінкевіча. Музыка: У. Кандрусевіч. Мюзікл «Залёты» (паводле В. Дуніна-Марцінкевіча); І. Лучанок. Цыкл для голасу з суправаджэннем «О, Радзіма бацькоў»; М. Равенскі. Аперэта «Залёты». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Пінская шляхта» (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, рэж. М. Пінігін).

Рэалізм як літаратурны напрамак. Захаванне тэндэнцый рамантызму
(5 гадзін)

Рэалізм як напрамак у літаратуры (1 гадзіна).

Узмацненне ў літаратуры Беларусі другой паловы XIX стагоддзя рэалістычных тэндэнцый. Публіцыстыка і яе роля ў тагачасным жыцці (творчасць Кастуся Каліноўскага). Рысы рамантызму ў творах Францішка Багушэвіча («Хцівец і скарб на святога Яна», «Быў у чысцы» і інш.), Янкі Лучыны («Паляўнічыя акварэлькі з Палесся»).

Тэорыя літаратуры. Публіцыстыка як від літаратуры (паглыбленне паняцця).

Францішак Багушэвіч. Прадмовы да зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі»; вершы «Мая дудка», «Ахвяра», «Хмаркі»; паэма «Кепска будзе!» (3 гадзіны).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Уплыў паўстання 1863–1864 гг. на творчасць Ф. Багушэвіча. Ідэйны змест прадмоў да зборнікаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Месца паэта і паэзіі ў жыцці народа («Мая дудка»). Увасабленне ў паэзіі Францішка Багушэвіча грамадскіх ідэалаў («Ахвяра»). Алегарычны змест верша «Хмаркі».

«Кепска будзе!». Выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці ў творы. Паказ жыццястойкасці беларускага народа. Роля айчыма ў лёсе Аліндаркі. Матыў трагічнасці і безвыходнасці. Гуманістычны ідэал аўтара ў паэме.

Тэорыя літаратуры. Рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры. Народнасць літаратуры (паглыбленне паняцця).

Янка Лучына. Паэма «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» (ва ўрыўках) (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка. «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Чалавек і прырода – галоўная тэма твора. Спроба стварэння беларускага народнага характару сродкамі эпічнай паэзіі ў «Паляўнічых акварэльках з Палесся». Вобраз Грышкі. Гуманістычны пафас твора.

Мастацтва. Архітэктура: Чырвоны касцёл у Мінску (XIX ст.). Скульптура: З. Азгур. Помнік Ф. Багушэвічу (Жупраны); К. Асадаў. «Францішак Багушэвіч» (скульптурны барэльеф); Жывапіс: Я. Ціхановіч. «Партрэт Францішка Багушэвіча».

Шляхі развіцця беларускай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя
(21 гадзіна)

Беларуская літаратура ў пачатку XX стагоддзя (1 гадзіна).

Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя, яе патрыятычны пафас і вернасць гуманістычным ідэалам. Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і літаратуры.

Фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры. Прыход у літаратуру Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Цёткі, Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Каруся Каганца, Ядвігіна Ш. і інш.

Станаўленне беларускага прафесіянальнага тэатра. Роля Уладзіслава Галубка, Еўсцігнея Міровіча ў станаўленні беларускага тэатра і драматургіі.

Цётка. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніцы.

Патрыятычны змест лірыкі Цёткі, паэтызацыя непаўторнасці і хараства Бацькаўшчыны. Пафас рэвалюцыйнай гераікі. Рамантычна-сімвалічная вобразнасць вершаў. Яскравасць паэтычнага стылю: рытміка, інтанацыя, гукапіс, тропы, мастацкая дэталь.

Тэорыя літаратуры. Вершаскладанне, паэтычны сінтаксіс (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Жывапіс: М. Купава. «Цётка»; І. Пратасеня. «Думы (Цётка)»; Л. Шчамялёў. «Край родны»; Ф. Янушкевіч. «Роздум. А. Пашкевіч (Цётка)». Музыка: І. Лучанок. Раманс «Як лілея на Дунаі»; Ю. Семяняка. Рамансы «Люблю мой сад», «Кася»; Д. Смольскі. «Арлы-брацці», «Вера беларуса», «Скрыпка».

Ядвігін Ш. Апавяданне «Дуб-дзядуля» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Увага да праблем чалавечага быцця, філасофскі сэнс твора «Дуб-дзядуля». Праблема сэнсу і каштоўнасці чалавечага існавання. Лірызм і псіхалагічная заглыбленасць. Прытчавая аснова апавядання. Адметнасць творчай манеры Ядвігіна Ш.

Тэорыя літаратуры. Пачатковае паняцце пра стыль пісьменніка.

Янка Купала. Вершы «Мая малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»), «Явар і каліна», паэма «Бандароўна»; драма «Раскіданае гняздо» (6 гадзін).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Лірыка. Грамадзянскасць і публіцыстычнасць у вершах Янкі Купалы, вобразна-інтанацыйнае багацце яго лірыкі. Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа («Мая малітва» і інш.). Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармонія чалавека і прыроды ў вершы «Явар і каліна».

«Бандароўна». Фальклорная першакрыніца паэмы. Сутнасць канфлікту. Вобразы-антыподы. Драматызм дзеяння. Маральнае харство Бандароўны. Рамантычная аснова твора.

«Раскіданае гняздо». Сацыяльна-філасофскі, гуманістычны пафас і змест п'есы. Асноўныя сюжэтныя лініі. Жанр, кампа-зіцыя, развіццё драматычнага канфлікту. Галоўныя героі драмы, матывы паводзін. Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Праўда Сымона і праўда Зоські. Старац як выразнік народнай маралі. Вобраз Незнаёмага ў сістэме дзейных асоб п'есы. Ідэйны сэнс Вялікага сходу. Рэалізм драмы, рамантычная сімволіка і лірызм. Сімвалічнасць назвы твора. Сцэнічнае ўвасабленне п'есы.

Тэорыя літаратуры. Жанры лірыкі (паглыбленне паняццяў). Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў драматычным творы (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: З. Азгур. Помнік Янку Купалу (Вязынка, Мінская вобласць); А. Анікейчык. Помнік Янку Купалу (Нью-Ёрк, Араў-парк); помнік Янку Купалу (скульптары А. Анікейчык, Л. Гумілеўскі, А. Заспіцкі, архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін. Мінск); помнік Янку Купалу (скульптары А. Заспіцкі, Г. Мурамцаў, архітэктар Ю. Казакоў. Акопы). Жывапіс: М. Савіцкі. «Віленскія сустрэчы»; Я. Ціхановіч, В. Шаранговіч. «А хто там ідзе?». Музыка: Ю. Семяняка. «Явар і каліна»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары У. Алоўнікаў, А. Багатыроў, В. Войцік, Д. Камінскі, В. Кузняцоў, М. Літвін, І. Лучанок, А. Мдывані, Л. Мурашка, Д. Смольскі, У. Солтан, А. Чыркун); «Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць (паэмы, вершы, проза, песні)»: мастацкае электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. – Мінск : Маст. літ., 2006–2007. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Раскіданае гняздо» (Нацыянальны дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Максіма Горкага; рэж. Б. Луцэнка).

Якуб Колас. Вершы «Не бядуй!», «Родныя вобразы», «Першы гром»; паэма «Новая зямля»; трылогія «На ростанях» (частка першая – «У палескай глушы») (7 гадзін).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Лірыка. Элегічнае і аптымістычнае ў паэзіі Якуба Коласа («Не бядуй!»). Паэтызацыя роднай прыроды («Родныя вобразы», «Першы гром»). Рытміка-інтанацыйны лад вершаў Якуба Коласа.

«Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця. Аўтабіяграфічнасць паэмы, яе творчая гісторыя. Жанравыя асаблівасці твора. Народны побыт і прырода ў паэме. Вобразы ў паэме: мудрасць і душэўная прыгажосць Антося, Ганны; вобразы дзяцей. Трагедыя лесу Міхала. Філасофская ідэя зямлі і волі. Сімвалічны сэнс назвы твора. Паэтычнае майстэрства Якуба Коласа.

Трылогія «На ростанях». Гісторыя напісання і праблематыка, асаблівасці сюжэта і кампазіцыі твора, яго аўтабіяграфізм. Асоба Андрэя Лабановіча. Народ і інтэлігенцыя ў творы. Жаночыя вобразы. Майстэрства Коласа-празаіка: псіхалагізм, багацце мовы, мастацкая дэталізацыя. «Палескі каларыт» твора.

Месца і значэнне творчасці Якуба Коласа ў беларускай літаратуры.

Тэорыя літаратуры. Паглыбленне паняццяў пра ліра-эпічныя творы (паэма-эпапея), пра эпас і яго жанры. Творчая гісторыя мастацкага твора. Герой і прататып. Індывідуальны стыль пісьменніка (развіццё паняцця).

Мастацтва. Скульптура: З. Азгур. Помнік Якубу Коласу (архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін); мастацка-мемарыяльны комплекс «Шлях Коласа». Жывапіс: У. Стальмашонак. «Якуб Колас»; У. Сулкоўскі. Серыя палотнаў «Радзіма Якуба Коласа». Музыка: У. Алоўнікаў. «Дуб», «Глуха шэпча лес», «Мой родны кут»; Д. Даўгалёў. «Ручэй», «Лес»; Л. Захлеўны. «На новай зямлі»; І. Лучанок. «Ганулька», «Надышлі маразы», «Каханне», «Роднаму краю»; У. Мулявін. «Каханне»; Ю. Семяняка. «Добра ў лузе ў час палудні»; «Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць (паэмы, вершы, проза, песні)»: мастацкае электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. – Мінск : Маст. літ., 2006–2007.

Максім Багдановіч. Вершы «Песняру», «Мяжы», «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Летапісец», «Плакала лета, зямлю пакідаючы...», «Маладыя гады», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», «Жывеш не вечна, чалавек...» (4 гадзіны).

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Погляды Максіма Багдановіча на прызначэнне паэта ў грамадстве («Песняру»). Вобраз Радзімы ў лірыцы паэта («Санет» і інш.). Зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. Скіраванасць да агульначалавечай праблематыкі. Багацце духоўнага свету лірычнага героя. Пошукі гармоніі, услаўленне красы жыцця і мастацтва. Рытмічнае багацце і меладычнасць верша.

Сувязь творчасці Багдановіча з класічнай спадчынай і сусветнай паэзіяй. Вобраз Максіма Багдановіча ў паэзіі і мастацтве.

Тэорыя літаратуры. Нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры (паглыбленне паняцця). Паняцце аб прыгожым. Форма і змест верша (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: С. Вакар. Помнік М. Багдановічу; Л. Гумілеўскі. «Максім Багдановіч»; В. Янушкевіч. «Зорка Максіма Багдановіча» (бронза). Жывапіс: Г. Вашчанка. «М. Багдановіч»; В. Волкаў. «М. Багдановіч»; У. Новак. «М. Багдановіч у Ялце»; У. Пасюкевіч. «У краіне светлай»; І. Рэй. «Шлях паэта». Музыка: Г. Гарэлава. Вакальны цыкл «Дзявочыя песні»; І. Лучанок. «Вераніка»; І. Палівода. Рок-опера «Максім»; А. Смольскі. Араторыя «Памяці паэта»; Ю. Семяняка. Опера «Зорка Венера»; Я. Тарасевіч. «Асенняя песня (Плакала лета)»; Л. Шлег. Вакальны цыкл «Вянок»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары А. Абіліёвіч, А. Аладаў, А. Багатыроў, У. Мулявін, І. Палівода, А. Туранкоў, Э. Тырманд).

Алесь Гарун. Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» (1 гадзіна).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Зборнік вершаў «Матчын дар». Вызваленча-патрыятычныя, агульначалавечыя матывы («Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...»). Абвостранае пачуццё любові да радзімы. Тэма сэнсу жыцця, прызначэння чалавека («Ідуць гады»). Філасафічнасць і публіцыстычнасць вершаў.

Рэзерв вучэбнага часу
(1 гадзіна)

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год
(1 гадзіна)

Усяго: на вывучэнне твораў – 48 гадзін;
на творчыя работы – 4 гадзіны;
на ўрок па творах для дадатковага чытання – 1 гадзіна.

Спіс твораў для завучвання на памяць

Францыск Скарына. Урывак з прадмовы да кнігі «Юдзіф».
Францішак Багушэвіч. Верш «Хмаркі».
Янка Купала. Верш «Явар і каліна».
Якуб Колас. «Родныя вобразы».
Максім Багдановіч. «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»).

Спіс твораў для дадатковага чытання

Мікола Арочка. «Судны дзень Скарыны».
Ян Баршчэўскі. «Шляхціц Завальня» (2–3 апавяданні на выбар)
Карусь Каганец. «Модны шляхцюк».
Уладзімір Караткевіч. «Дрэва вечнасці».
Якуб Колас. «Сымон-музыка».
Аркадзь Куляшоў. «Хамуціус».
Максім Лужанін. «Колас расказвае пра сябе».
Мікола Маляўка. Зб. «Старая зямля».

Алесь Марціновіч. Зб. «Хто мы, адкуль мы».
Барыс Мікуліч. «Развітанне».
Шота Руставелі. «Віцязь у тыгравай шкуры».
Анатоль Статкевіч-Чабаганаў. «Лёс роду – лёс радзімы».
Ян Чачот. «Наваградскі замак».
Тарас Шаўчэнка. Вершы. Паэмы.

Асноўныя віды вусных і пісьмовых работ па літаратуры ў IX класе

Выразнае чытанне мастацкіх твораў розных жанраў.

Вусны і пісьмовы пераказ празаічных тэкстаў, ускладнены элементамі разважання.

Аргументаванне ўласных ацэнак герояў і падзей.

Сачыненне-апісанне малюнкаў прыроды, выгляду герояў (на падставе вывучаных твораў).

Параўнальная характарыстыка літаратурных герояў аднаго твора і розных твораў (сачыненне-разважанне).

Вусны і пісьмовы водгук на самастойна прачытаную кнігу, прагледжаныя спектакль, кінафільм, тэлеперадачу.

Супастаўленне літаратурных твораў з ілюстрацыямі да іх.

Даклад або рэферат на літаратурную тэму (па вывучаных творах).

Канспект прачытаных літаратурна-крытычных прац.

Вопыты мастацка-творчага характару: мастацкія замалёўкі, апавяданні, нарысы, вершы.

Асноўныя патрабаванні да ведаў, уменняў і літаратурнага развіцця вучняў IX класа

Вучні павінны

ведаць:

асноўныя этапы і заканамернасці развіцця беларускай літаратуры (ад старажытных часоў да пачатку XX стагоддзя) у суаднясенні з развіццём сусветнай літаратуры;

сутнасць і характэрныя асаблівасці асноўных мастацкіх сістэм (барока, класіцызм, асветніцтва, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм), родаў і жанраў літаратуры;

змест асноўных тэарэтыка-літаратурных паняццяў, патрэбных для аналізу і ацэнкі мастацкіх твораў;

найбольш важныя звесткі пра жыццё і творчасць пісьменнікаў;

сюжэт і сістэму вобразаў вывучаных твораў, іх праблематыку;

тэксты, рэкамендаваныя праграмай для завучвання на памяць;

умець:

удумліва і творча чытаць літаратурныя творы, успрымаць іх на эмацыянальна-вобразным узроўні ў адзінстве ідэйнага зместу і мастацкай формы, самастойна іх асэнсоўваць;

вызначаць прыналежнасць твора да пэўнага літаратурнага мастацкага напрамку, роду і жанру;

вызначаць асноўную праблему твора;

характарызаваць літаратурнага героя;

суадносіць ідэі і характары з уласным жыццёвым вопытам, аргументаваць сваю ацэнку герояў і падзей;

супастаўляць герояў розных твораў і вылучаць у іх характарах і паводзінах агульнае і адрознае;

вызначаць сувязь паміж героямі твора і эпохай;

вызначаць узаемасувязь і ўзаемазалежнасць састаўных частак твора (сюжэт, кампазіцыя, тэма, ідэя, мастацкія сродкі);

даваць вусны або пісьмовы разгорнуты адказ на праблемнае пытанне па вывучаным творы;

пісаць сачыненні на літаратурную тэму;

рыхтаваць вусны і пісьмовы водгук на прачытаную кнігу, прагледжаныя кінафільм, спектакль, тэлеперадачу;

рыхтаваць даклад (рэферат) з выкарыстаннем літаратуразнаўчых крыніц;

карыстацца даведачна-інфармацыйнай літаратурай (літаратурна-крытычныя артыкулы, слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы і інш.).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Учебная программа по учебному предмету
«Русский язык»
для IX класса учреждений общего среднего образования
с белорусским и русским языками обучения и воспитания

РУССКИЙ ЯЗЫК

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Цель обучения русскому языку – сформировать у учащихся систему знаний о языке и речи; научить их пользоваться языком во всех видах речевой деятельности (чтение, слушание, письмо, говорение), в избранных сферах применения языка; развивать интеллектуальную, духовно-нравственную, коммуникативную, гражданскую культуру учащихся.

Задачи обучения русскому языку:

языковое и речевое развитие учащихся на основе усвоения знаний о системе русского языка на всех его уровнях (фонетическом, лексическом, морфологическом, синтаксическом), правил функционирования языковых средств в речи, норм русского литературного языка (произносительных, речевых, морфологических, синтаксических, орфографических и пунктуационных); обогащение словарного запаса и грамматического строя речи учащихся; формирование правописных умений и навыков, умений пользоваться языком в различных видах речевой деятельности (языковая и речевая компетенции);

формирование коммуникативных умений на основе овладения учащимися речеведческими понятиями (культура устной и письменной речи, текст, типы речи, стили речи, жанры речи, правила речевого общения), способами выражения мысли в устной и письменной форме, умений создавать самостоятельные связные высказывания различных стилей, типов и жанров речи (коммуникативная компетенция);

формирование речевой культуры учащихся на основе освоения языка как системы сохранения и передачи культурных ценностей, как средства постижения русской и национальной культуры в контексте общемировой; развитие способности пользоваться культурологическими сведениями для обеспечения полноценной коммуникации (лингвокультурологическая компетенция);

развитие средствами языка интеллектуальной, духовно-нравственной, коммуникативной, гражданской культуры учащихся (социокультурная компетенция).

Реализация указанной цели и задач достигается в процессе формирования языковой, речевой, коммуникативной, социокультурной и лингвокультурологической компетенций.

Курс русского языка для V–IX классов направлен прежде всего на применение полученных знаний и умений в речевой практике.

Оптимальными и эффективными подходами, определяющими теоретическую и методическую базу обучения языку и речи, являются системно-функциональный, коммуникативно-деятельностный, социокультурный и лингвокультурологический.

Системно-функциональный подход предполагает усвоение системы русского языка, единиц разного уровня с точки зрения значения, строения и назначения в речи; отбор и организацию языкового материала для создания различных видов речевой деятельности, *формирования языковой и речевой компетенций учащихся*.

Коммуникативно-деятельностный подход определяет такую организацию и направленность занятий по русскому языку, при которой цель обучения связана с обеспечением максимального приближения учебного процесса к реальному процессу общения. Объектом обучения с позиции этого подхода является речевая деятельность во всех ее видах. В основе коммуникативно-деятельностного подхода заложена не столько реальность самих ситуаций, сколько реальность деятельности учащихся в предлагаемых ситуациях, что способствует *формированию коммуникативной компетенции*.

Лингвокультурологический подход к обучению русскому языку позволяет сориентировать все уровни владения языком на *формирование лингвокультурологической компетенции*, воспитание речевой культуры учащихся на основе освоения языка как средства постижения русской и национальной культуры в контексте общемировой.

Лингвокультурологический подход к обучению языку относится также к деятельностному типу. Его реализация предполагает не только ознакомление с духовными ценностями, способами выражения которых являются язык, литература, искусство, история и др., но и овладение умениями пользоваться полученными знаниями в процессе общения.

Системно-функциональный подход к обучению учащихся предопределил выбор *линейно-опережающего и концентрического принципов построения содержания* обучения русскому языку в V–IX классах как наиболее соответствующих современным требованиям к организации процесса обучения, развитию и воспитанию языковой и речевой личности. Линейность структуры содержания обучения обеспечивает последовательное изучение многоуровневой системы языка, опережение – параллельное формирование языковых, речевых и коммуникативных умений.

Опережение осуществляется благодаря изучению в V классе пропедевтического раздела «Синтаксис», раздела «Лексика», в VI и VII классах – раздела «Состав слова. Словообразование», изучению на синтаксической основе раздела «Морфология».

Речевые разделы «Культура речи», «Текст», «Стили речи» изучаются концентрически с V по IX класс, «Жанры речи» – с VI по IX класс, что позволяет учитывать возрастные возможности учащихся, обеспечивать сравнительно раннее ознакомление с необходимым теоретическим материалом для формирования речевых умений, а также прочность усвоения в результате возвращения к теме в каждом последующем классе на новом уровне и в расширенном объеме.

Линейно-опережающий и концентрический принципы дают возможность осознавать языковые и речевые явления во взаимосвязи и одновременно формировать и совершенствовать языковую, речевую и коммуникативную компетенции учащихся.

Учебный материал для изучения в V–IX классах группируется по блокам с учетом основных содержательных линий и представлен как перечисление учебных разделов, составляющих основу данного учебного предмета и предъявляемых учащемуся как объект усвоения:

1. Язык и речь. Культура речи. Стили речи. Жанры речи. Текст.
2. Фонетика. Орфоэпия. Графика.
3. Орфография.
4. Лексика и фразеология.
5. Состав слова и словообразование.
6. Грамматика.

6.1. Морфология и правописание частей речи.

6.2. Синтаксис и пунктуация.

Принципами отбора содержания обучения являются:

учет функционально-семантических особенностей фактов языковой системы;

минимизация теоретических сведений на основе их значимости для речевой деятельности;

учет общих и специфических особенностей белорусского и русского языков;

опора на этнокультуру (при отборе дидактического материала);

опора на текст как на предмет обучения и как на продукт речевой деятельности.

Языковой курс каждого класса открывается разделом «Текст», содержание которого вооружает учащихся необходимыми знаниями по теории текстообразования и развивает умение свободно создавать тексты с учетом речевой ситуации.

В содержании программы выделена рубрика «Виды речевой деятельности». Это ***обучающие*** виды работ по развитию связной письменной речи учащихся, включаемые учителем в контекст изучения основных разделов курса русского языка. Выделение часов на их проведение планирует учитель, исходя из общего количества часов, отведенных на изучение данной темы. Работа над указанными видами деятельности может проводиться как в процессе урока, так и при подготовке к нему учащихся дома. Проведение учебных занятий по развитию связной речи учащихся является обязательным.

Содержание учебного материала для повторения в конце изученного курса планирует учитель на основе учета усвоенных в течение года знаний, умений и навыков и систематизированного теоретического и практического материала, изложенного в «Требованиях к знаниям, умениям и навыкам учащихся», включающих «Основные требования к результатам учебной деятельности», рассредоточенные по разделам.

(70 ч)

ПОВТОРЕНИЕ ИЗУЧЕННОГО В VIII КЛАССЕ (3 ч)

ТЕКСТ. СТИЛИ РЕЧИ (3 ч)

Текст и его основные признаки (повторение). Синтаксическая синонимия (ознакомление).

Стили речи (повторение): языковые средства стилей.

Виды деятельности: *устное учебное сообщение, анализ текста, развернутый ответ на вопрос, подробное (сжатое) изложение, составление плана текста и написание подробного изложения с сохранением авторских выразительных средств, подбор синтаксических синонимов, составление текста по данному началу.*

ЖАНРЫ РЕЧИ (3 ч)

Отзыв. Реферат. Содержание, композиция, языковые средства.

Виды деятельности: *устное учебное сообщение по схеме, опорному конспекту и другому материалу, представленному в учебном пособии; анализ образцов композиционных частей отзыва; написание отзыва о стихотворении; анализ композиционных частей реферата; составление реферата по данному плану-схеме; анализ речевых формул, используемых в реферате; анализ и оформление титульного листа реферата; подготовка реферата.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся:

создание в устной и письменной форме рассуждений, повествований и описаний, различных по стилю; композиционное и языковое оформление текстов различных жанров.

СИНТАКСИС И ПУНКТУАЦИЯ
(продолжение)

СЛОЖНОЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ (42 ч)

Общая характеристика сложного предложения (2 ч)

Значение сложного предложения (ознакомление). Средства связи и их роль в сложном предложении (ознакомление).

Строение сложного предложения: союзные (сложносочиненные, сложноподчиненные) и бессоюзные сложные предложения.

Виды деятельности: *составление учебного сообщения по схеме, анализ текста, развернутый ответ на вопрос, составление плана текста и устное (письменное) изложение текста по составленному плану.*

Сложносочиненное предложение (8 ч)

Средства связи частей в сложносочиненном предложении: сочинительные союзы, интонация. Сложносочиненные предложения с соединительными, разделительными и противительными союзами. Знаки препинания в сложносочиненном предложении.

Виды деятельности: *составление учебного сообщения по таблице, анализ текста, развернутый ответ на вопрос, устное изложение текста, сочинение в форме сравнительной характеристики.*

Сложноподчиненное предложение (20 ч)

Сложноподчиненное предложение: главная и придаточная части. Средства связи частей в сложноподчиненном предложении: подчинительные союзы, союзные слова, указательные слова. Основные виды придаточных частей: определительная, изъяснительная, обстоятельственные (места, времени, причины, следствия, цели, условия, уступки, образа действия, степени, сравнительная). Знаки препинания в сложноподчиненном предложении.

Сложноподчиненное предложение с несколькими придаточными частями: однородное и неоднородное соподчинение, последовательное подчинение (ознакомление). Знаки препинания в сложноподчиненном предложении с несколькими придаточными частями.

Виды деятельности: *учебное сообщение по таблице, выборочное изложение, анализ композиции рассуждениея, сочинение-рассуждение на предложенную тему, сочинение текста по данному началу, анализ текста в жанре дневниковых записей, составление таблиц (аналитической, обобщающей), написание по схеме (плану) рецензии на любимую телепередачу в виде письма ведущему, сочинение, содержащее развитие мысли, высказанной автором в тезисной форме.*

Бессоюзное сложное предложение (8 ч)

Средства связи частей в бессоюзном сложном предложении: интонация, порядок следования частей. Знаки препинания в бессоюзном сложном предложении.

Виды деятельности: *устное учебное сообщение; анализ текста; развернутый ответ на вопрос; анализ текстов пословиц, поговорок, загадок, примет; выборочное изложение, устное изложение; заполнение предложенной таблицы; редактирование текста-описания.*

Сложные предложения с разными видами связи (4 ч)

Сложные предложения с разными видами связи: союзной и бессоюзной. Знаки препинания в предложениях с разными видами связи.

Грамматическая норма. Правильное построение сложноподчиненного предложения: выбор союза, союзного слова; расположение придаточной части; согласование союзных слов ***который, какой*** с опорными словами в главной части, союзного слова ***чей*** – с определяемым словом в придаточной части.

Пунктуационная норма. Запятая, точка с запятой, тире между частями сложносочиненного предложения; отсутствие запятой в сложносочиненном предложении при наличии общего члена. Запятая в сложноподчиненном предложении. Отсутствие запятой между однородными придаточными, соединенными союзом и. Запятая на стыке сочинительного и подчинительного союзов или двух подчинительных союзов (союза и союзного слова). Запятая, точка с запятой в бессоюзном сложном предложении. Двоеточие в бессоюзном сложном предложении. Тире в бессоюзном сложном предложении.

Виды деятельности: *устное учебное сообщение, анализ текста, развернутый ответ на вопрос, сжатое (подробное) изложение, устное (письменное) сочинение-рассуждение по данному началу.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся:

обнаружение частей в составе сложного предложения и определение их количества; определение типа сложного предложения: союзное (сложносочиненное, сложноподчиненное) и бессоюзное; определение основных видов придаточных частей в сложноподчиненном предложении; разграничение союзов и союзных слов; анализ сложноподчиненных предложений с несколькими придаточными; составление схем сложного предложения; составление сложных предложений по схемам; интонирование сложных предложений; синтаксический и пунктуационный разбор сложносочиненных, сложноподчиненных, бессоюзных предложений, сложных предложений с разными видами связи;

использование текстообразующей роли различных типов сложных предложений для организации типа речи: сложных предложений со значением обусловленности и синонимичных им конструкций в рассуждении, сложных предложений со сравнительными отношениями и синонимичных им конструкций в описании; использование сложноподчиненных предложений с придаточной изъяснительной для выражения авторской позиции (оценки, восприятия, отношения) и создания целостности текста; употребление бессоюзных предложений в разговорной речи; использование синонимичных синтаксических конструкций (союзных и бессоюзных предложений, сложных и простых предложений) как источника богатства и разнообразия речи.

ЧУЖАЯ РЕЧЬ И ЕЕ ВИДЫ (8 ч)

Прямая речь (углубленное повторение). Знаки препинания в предложениях с прямой речью.

Косвенная речь.

Диалог. Знаки препинания при диалоге.

Цитация. Способы введения цитат в текст. Эпиграф. Знаки препинания при цитировании.

Грамматическая норма. Правила замены прямой речи косвенной.

Пунктуационная норма. Знаки препинания в предложениях с прямой речью (углубленное повторение). Пунктуационное оформление цитат, в том числе стихотворных. Оформление эпиграфа к сочинению.

Виды деятельности: *устное учебное сообщение, анализ текста, развернутый ответ на вопрос, создание текстов с использованием различных способов передачи чужой речи, редактирование предложений, подробное изложение.*

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся:

определение способа передачи чужой речи; составление предложений с прямой и косвенной речью; замена прямой речи косвенной и наоборот; синтаксический разбор предложений с прямой речью;

использование различных способов передачи чужой речи при пересказе текста от первого и третьего лица; использование прямой речи для речевой характеристики героев; уместное использование цитат в сочинениях и устных высказываниях для иллюстрации и подтверждения мысли; подбор эпиграфа к сочинению в соответствии с темой и основной мыслью текста.

ПОВТОРЕНИЕ ИЗУЧЕННОГО В IX КЛАССЕ (2 ч)

Контрольные письменные работы – 7 ч: диктанты – 2 (2 ч), изложения с дополнительным заданием – 2 (4 ч), тестовая работа – 1 (1 ч).

Резервное время – 2 ч.

Для диагностики усвоения теоретических сведений, сформированности учебно-языковых и коммуникативных умений и навыков рекомендуются следующие *формы контроля*:

диктанты различного вида;

изложение (подробное, сжатое, выборочное, с дополнительным заданием);

сочинение (сочинение-повествование, сочинение-описание, сочинение-рассуждение);

письмо по памяти;

учебное сообщение с использованием таблиц и схем;

различные виды разборов в пределах изученного материала;

тестовая работа.

Требования к умениям и навыкам, которыми должны овладеть учащиеся в процессе изучения всех разделов, указаны в рубриках программы после каждой темы: «Грамматическая норма», «Пунктуационная норма», «Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся».

Требования к знаниям, умениям и навыкам выпускников II ступени обучения

В процессе изучения русского языка в V–IX классах учащиеся должны овладеть знаниями, умениями и навыками компетенций, обозначенных в программе:

– *языковой*, обеспечивающей усвоение учащимися знаний в системе языка на всех его уровнях (фонетика, лексика, состав слова и словообразование, морфология, синтаксис), норм русского литературного языка (произносительных, речевых, морфологических, синтаксических, орфографических и пунктуационных), правил функционирования языковых средств в речи;

– *речевой*, определяющей отбор речеведческих понятий, необходимых для построения текстов, усвоение способов выражения мыслей посредством языка в устной и письменной форме; овладение умениями пользоваться языком в различных видах речевой деятельности;

– *коммуникативной*, реализующей знания о языке в общении, создаваемых текстах различных типов, стилей, жанров речи; формирующей умения решать коммуникативные задачи, обусловленные ситуацией общения, коммуникативными потребностями, национально-культурной спецификой поведения;

– *лингвокультурологической*, определяющей для процесса обучения русскому языку знания о языке как системе сохранения и передачи культурных ценностей, как средстве постижения общечеловеческих и национальных (для русского и белорусского народов) идеалов, традиций, обычаев, ценностей и норм, регулирующих взаимодействие личности с другими и ее поведение в обществе;

– *социокультурной*, определяющей знания об особенностях и закономерностях становления и развития культуры как способа деятельности и системы ценностей и норм, обеспечивающих взаимодействие личности и общества в современных условиях; формирующей социальные, духовно-нравственные качества личности и ее гражданскую позицию.

Знания двух последних компетенций (*социокультурной и лингвокультурологической*) обеспечиваются в процессе обучения дидактическим материалом и методической системой средств, формирующих качества личности учащегося.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Учебная программа по учебному предмету
«Русская литература»
для IX класса учреждений общего среднего образования
с белорусским и русским языками обучения и воспитания

РУССКАЯ ЛИТЕРАТУРА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Целью изучения литературы является приобщение учащихся к искусству слова в контексте движения духовной и социально-исторической жизни народа и развитие на этой основе художественного мышления и эстетических чувств, творческих способностей, читательской и речевой культуры, формирование нравственно-эстетических ориентаций.

Содержание литературного образования составляют **четыре основных компонента**: 1) знания; 2) умения; 3) опыт творческой деятельности; 4) система норм отношения к миру, людям, себе.

Первый компонент учебного предмета «Русская литература» – знания – формируется путем освоения разнообразного историко- и теоретико-литературного материала: а) произведений русского фольклора и литературы; б) отдельных образцов словесного искусства народов мира; в) сведений об основных периодах русского и мирового художественного процесса; г) критико-биографических сведений о жизни и творчестве виднейших писателей; д) основных теоретико-литературных понятий.

Все эти элементы содержания учебного предмета представлены в программе комплексно, во взаимосвязи историко-функционального, проблемно-тематического, жанрово-родового аспектов, с соблюдением принципов преемственности и доступности.

Изучение русской литературы того или иного периода соотносится с белорусской (например, переход к реализму, расцвет реализма и т. п.) и с зарубежной литературами, предусматривает сопоставление художественных образов, сюжетов, проблематики художественных произведений, принадлежащих к разным национальным литературам, выявление в них общего и в то же время неповторимого, особенного.

Основой учебных курсов всех классов являются литературные произведения, которые отбирались с учетом их художественных достоинств, общечеловеческой значимости, воспитательной ценности, места в творчестве писателя и в истории литературы, актуальности для нашего времени, доступности и интереса для учащихся.

В аннотациях программ, которые носят рекомендательный характер, внимание учителей обращается на гуманистический смысл произведения, диалектическую связь социального, конкретно-исторического и общечеловеческого в нем, художественное своеобразие, авторскую позицию.

Объем знаний о личности писателя, его творческой эволюции определяется в зависимости от возраста учащихся, количества часов, отведенных на изучение темы, а также его места в литературном курсе.

Программа содержит и целый комплекс теоретико-литературных понятий, отбор которых осуществляется по следующим критериям:

а) жанрово-родовая специфика изучаемого произведения;

б) функциональная роль теоретического понятия в основании конкретной литературной темы;

в) его значимость в формировании предметных компетенций.

профилактики инфекционных и простудных заболеваний, травматизма, ВИЧ-инфекции, вредных привычек (курение, употребление алкоголя и наркотиков), нарушения осанки, зрения, слуха;
оказания первой помощи при пищевом отравлении, ожогах, обморожениях, кровотечениях, переломах и вывихах, остановке дыхания;
обоснования здорового образа жизни, рациональной организации труда и отдыха.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Біялогія»
для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

БІЯЛОГІЯ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта вывучэння біялогіі – фарміраванне ў вучняў сучаснага навуковага светапогляду, неабходнага для разумення з’яў і працэсаў, якія адбываюцца ў прыродзе, у жыццядзейнасці ўласнага арганізма, у розных галінах народнай гаспадаркі, для працягу адукацыі, будучай прафесійнай дзейнасці; развіццё ўменняў вызначаць, характарызаваць,

параўноўваць і абагульняць вывучаемыя аб’екты і з’явы; стварэнне ўмоў для магчымасці ўсвядомленага выбару індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, якая спрыяе наступнаму прафесійнаму самавызначэнню, у адпаведнасці з індывідуальнымі інтарэсамі вучня.

Задачы вучэбнага прадмета «Біялогія»:

авалоданне сістэмай ведаў пра малекулярныя і структурна-функцыянальныя асновы жыцця, размнажэнне і развіццё арганізмаў асноўных царстваў, экасістэм, біяразнастайнасць, эвалюцыю, што неабходна для ўсведамлення каштоўнасці ўсяго жывога на Зямлі;

фарміраванне на базе ведаў пра жывую прыроду навуковай карціны свету;

фарміраванне экалагічнай граматнасці людзей, якія ведаюць біялагічныя заканамернасці, сувязі паміж жывымі арганізмамі, іх эвалюцыю, прычыны і каштоўнасць відавой разнастайнасці;

усталяванне гарманічных адносін з прыродай, самім сабой, фарміраванне норм і правіл экалагічнай этыкі, адказных адносін да жывой прыроды як асновы экалагічнага выхавання;

фарміраванне генетычнай граматнасці як асновы здаровага ладу жыцця, захавання псіхічнага, фізічнага, маральнага здароўя чалавека;

азнаямленне з фундаментальнымі законамі і прынцыпамі існавання жывой прыроды, супольнасцей, арганізмаў;

фарміраванне ведаў пра будову: бактэрый, пратыстаў, грыбоў, лішайнікаў, споравых і пакрытанасенных раслін, жывёл, чалавека;

фарміраванне інфармацыйнай кампетэнцыі, умення працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі;

развіццё асобы вучня, імкнення прымяніць біялагічныя веды на практыцы, удзельнічаць у практычнай дзейнасці ў галіне медыцыны, сельскай гаспадаркі, біятэхналогіі, рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыроды.

Біялагічная адукацыя заклікана фарміраваць у падрастаючага пакалення разуменне жыцця ў любой яго праяве як найвышэйшай каштоўнасці. Біялогія ўваходзіць у лік прыродазнаўчых навук, якія вывучаюць прыроду, а таксама шляхі пазнання чалавекам прыроды. Акрамя светапогляднага значэння, у яе аснове ляжаць мерапрыемствы па падтрыманні здароўя чалавека, яго бяспекі і вытворчай дзейнасці ў любой галіне народнай гаспадаркі.

У цяперашні час прыярытэтныя напрамкі, якія маюць прынцыповае тэарэтычнае і практычнае значэнне, наступныя:

эколага-прыродаахоўны (роля біялогіі ў захаванні біясферы, біялагічнай разнастайнасці, у прадухіленні экалагічных бедстваў);

эвалюцыйны (паходжанне і эвалюцыя жывых арганізмаў);

захаванне асабістага здароўя і здароўя чалавека, здароўезберагальнае асяроддзе жыцця.

У адборы зместу вучэбнага матэрыялу былі выкарыстаны наступныя падыходы:

культуралагічны падыход дазваляе ў поўнай меры захаваць фундаментальныя крытэрыі біялагічных ведаў, іх цэльнасць і пераемнасць. Сэнс культуралагічнага падыходу ў выкладанні вучэбнага прадмета «Біялогія» заключаецца ў падрыхтоўцы інфармаванага, кампетэнтнага выпускніка, які ўсведамляе сябе ў агульнакультурным кантэксце, гатовага працягнуць адукацыю, жыць і працаваць у новых сацыяльна-эканамічных умовах;

асобасна арыентаваны падыход прадугледжвае напаўненне праграм вучэбным зместам, значным для кожнага вучня ў паўсядзённым жыцці, важным для фарміравання адэкватных паводзін чалавека ў навакольным асяроддзі;

дзейнасны падыход рэалізуецца на аснове максімальнага ўключэння ў адукацыйны працэс практычнага кампанента вучэбнага зместу – лабараторных і практычных работ, дэманстрацыйных і лабараторных доследаў, экскурсій.

З пункта гледжання патрабаванняў навучання вучняў у адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца наступныя віды кампетэнцый:

вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя – гатоўнасць вучня да самастойнай пазнавальнай дзейнасці: пастаноўкі мэты, планавання, аналізу, рэфлексіі, самаацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; уменне адрозніваць факты ад здагадак, валоданне вымяральнымі навыкамі, выкарыстанне верагоднасных, статыстычных і іншых метадаў пазнання;

даследчая кампетэнцыя – сукупнасць ведаў, уменняў, спосабаў дзейнасці, якія дазваляюць вучню быць у пазіцыі даследчыка ў адносінах да навакольнага свету, якая выяўляецца праз успрымальнасць да навакольнага свету, уменне распазнаць і вырашыць праблемную сітуацыю з любым прыродным аб'ектам або з'явай, выкарыстоўваючы для гэтага розныя крыніцы інфармацыі. У аснове даследчай кампетэнтнасці ляжыць паняцце «ўменне» як гатоўнасці асобы да пэўных дзеянняў і аперацый у адпаведнасці з пастаўленай мэтай, на аснове наяўных ведаў і навыкаў;

інфармацыйная кампетэнцыя – гатоўнасць вучня самастойна працаваць з біялагічнай інфармацыяй з розных крыніц, шукаць, аналізаваць і адбіраць неабходную інфармацыю, арганізоўваць, пераўтвараць, захоўваць і перадаваць яе. Яна забяспечвае навыкі дзейнасці вучняў у адносінах да інфармацыі, якая змяшчаецца ў вучэбным прадмеце «Біялогія», а таксама ў навакольным свеце;

прадметныя кампетэнцыі:

экалагічная кампетэнтнасць – здольнасць экалагічна думаць; прымяняць экалагічныя веды, уменні і навыкі, вопыт практычнай экалагічнай дзейнасці для вырашэння розных сітуацый экалагічнага характару; захаванне норм і правіл паводзін у прыродзе;

прыродазнаўчая кампетэнцыя – здольнасць фарміравання станоўчых пачуццяў да жывых арганізмаў, якія, у сваю чаргу, будуць матываваць гуманныя паводзіны вучняў у навакольным асяроддзі і набыццё вопыту экалагічнай дзейнасці;

здароўезберагальная кампетэнцыя – каштоўнаснае стаўленне да здароўя, як асновы ўсёй жыццядзейнасці чалавека, здольнасць да засваення здароўезберагальных ведаў, уменняў і навыкаў, гатоўнасць да праяўлення вопыту здароўезбераження ў паўсядзённай дзейнасці;

прыродазнаўчанавуковая кампетэнцыя ўключае адпаведныя біялагічныя веды, уменні, навыкі, вопыт творчай пераўтваральнай дзейнасці ў галіне «прырода – чалавек – прырода».

Асноватворнымі падчас адбору зместу і канструявання вучэбнага прадмета «Біялогія» з'яўляюцца наступныя прынцыпы:

прынцып навуковасці – адпаведнасць зместу вучэбнага матэрыялу ўзроўню сучаснага развіцця біялагічных навук; дакладнасць выкладу фактаў, законаў, прынцыпаў і тэорый;

глыбіня навуковай інтэрпрэтацыі біялагічных фактаў і з'яў абмяжоўваецца *прынцыпам даступнасці*. Даступнасць зместу выяўляецца наяўнасцю лагічных сувязей паміж элементамі ведаў;

прынцып сістэмнасці і сістэматычнасці – стройная лагічная паслядоўнасць выкладання навуковых гіпотэз, тэорый і фактаў; наяўнасць іх аналізу і абагульнення выкарыстання розных форм лагічнага мыслення;

прынцып гістарызму –прадугледжвае наяўнасць у змесце вучэбнага прадмета матэрыялаў, што знаёмяць вучняў з роляй біялагічных навук у сістэме навук, якія раскрываюць іх дасягненні;

прынцып рэалізацыі ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей – раскрыццё ў змесце вучэбнай праграмы ўзаемасувязі з іншымі прадметнымі ведамі, уменнямі і навыкамі;

прынцып сувязі навучання з жыццём паказвае практычную ролю біялагічных ведаў у жыцці чалавека. Дзякуючы ажыццяўленню гэтага прынцыпу, вучні ўсведамляюць

каштоўнасць і карыснасць біялагічнай адукацыі. Гэты прынцып патрабуе раскрыцця прыкладнога значэння біялагічных ведаў.

Ва ўстановах адукацыі на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжана вывучэнне наступных сістэматычных курсаў вучэбнага прадмета «Біялогія»:

I. Біялогія (Уводзіны ў біялогію) –VI клас.

II. Біялогія (Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пасялення. Бактэрыі. Пратысты. Грыбы. Лішайнікі. Расліны) – VII клас.

III. Біялогія (Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пасялення. Жывёлы) – VIII клас.

IV. Біялогія (Чалавек і яго здароўе) – IX клас.

V. Біялогія (Агульныя біялагічныя заканамернасці) – X і XI класы.

Раздзел «Жывыя арганізмы ў асяроддзі свайго пражывання. Бактэрыі. Пратысты. Грыбы. Лішайнікі. Расліны» ўключае звесткі пра адметныя прыметы жывых арганізмаў, іх разнастайнасць, сістэму арганічнага свету, бактэрыі, пратысты, грыбы, лішайнікі, расліны. Змест раздзела прадстаўлены на аснове эколага-эвалюцыйнага і функцыянальнага падыходаў, у адпаведнасці з якімі акцэнты ў вывучэнні арганізмаў пераносяцца з асаблівасцей будовы асобных прадстаўнікоў на раскрыццё працэсаў іх жыццядзейнасці, прыстасаванасці да асяроддзя пражывання, ускладнення ў ходзе гістарычнага развіцця, ролі ў экасістэмах і жыцці чалавека.

Змест вучэбных заняткаў і выкарыстоўваемыя формы і метады навучання павінны быць накіраваны на засваенне вучнямі ведавага і дзейнаснага кампанентаў, развіццё асобы вучня і рэалізацыю выхаваўчага патэнцыяла біялогіі.

Важным аспектам навучання з’яўляецца арганізацыя і стымуляванне настаўнікам актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў. У ходзе вучэбных заняткаў рэкамендуецца ствараць сітуацыі, у якіх вучні будуць не толькі засвойваць веды, але і спрабаваць прымяняць іх пры вырашэнні розных жыццёвых сітуацый. Як адзін са спосабаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў добра зарэкамендавала сябе навучанне на аснове стварэння праблемных сітуацый, пастаноўкі праблемных задач. Развіццю біялагічнага мыслення вучняў садзейнічае таксама ўключэнне на рэгулярнай аснове ў працэс навучання рашэння пазнавальных задач.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на выкарыстанне ў адукацыйным працэсе розных відаў дзейнасці: работа з рознымі крыніцамі інфармацыі (работа з вучэбнымі дапаможнікамі, табліцамі і інструкцыямі, электроннымі сродкамі навучання), сумеснае выкананне заданняў настаўніка, удзел у дыскусіі па праблемных сітуацыях, выкананне лабараторных і практычных работ. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на фарміраванне ў вучняў уменняў назіраць, апісваць біялагічныя аб’екты, планаваць і праводзіць простыя доследы і эксперыменты, рашаць біялагічныя задачы розных тыпаў складанасці і зместу, раскрываць і ўстанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, працаваць з вызначальнікамі.

Вялікім патэнцыялам у засваенні паняццяў, развіцці вобразных уяўленняў вучняў валодае выкарыстанне ўсіх відаў нагляднасці на ўроках: табліц, малюнкаў, аплікацый, схем, мадэлей, муляжоў, аудыя- і відэаматэрыялаў, гербарыя, вільготных прэпаратаў, натуральных аб’ектаў.

Інтэнсіфікацыі працэсу навучання і павышэнню яго эфектыўнасці будзе садзейнічаць выкарыстанне камп’ютарнай і мультымедыйнай тэхнікі, інтэрактыўных дошак і электронных сродкаў навучання.

IX КЛАС

(2 гадзіны на тыдзень; усяго 70 гадзін, у тым ліку 6 гадзін – рэзервовы час)

Уводзіны (1 гадзіна)

Навукі пра чалавека і яго здароўе: анатомія, фізіялогія, псіхалогія, гігіена. Метады вывучэння арганізма чалавека.

АГУЛЬНЫ АГЛЯД АРГАНІЗМА ЧАЛАВЕКА (4 гадзіны)

Арганізацыя і ўласцівасці клеткі.

Тканкі, іх класіфікацыя і прынцыпы арганізацыі. Органы, сістэмы органаў. Арганізм – адно цэлае.

Дэманстрацыі: слайды, мікрапрэпараты тканак, мадэлі, табліцы.

Практычныя работы

1. Будова тканак чалавечага арганізма.

РЭГУЛЯЦЫЯ ФУНКЦЫЙ У АРГАНІЗМЕ (2 гадзіны)

Паняцце аб рэгуляцыі. Нервовая, гумаральная і нейрагумаральная рэгуляцыя функцый. Самарэгуляцыя працэсаў жыццядзейнасці. Паняцце аб гамеастазе.

НЕРВОВАЯ СІСТЭМА (8 гадзін)

Агульныя прынцыпы арганізацыіі нервовай сістэмы. Значэнне нервовай сістэмы. Будова і віды нейронаў. Рэфлекс, рэфлекторная дуга.

Будова і функцыі спіннога мозга.

Галаўны мозг. Будова і функцыі прадаўгаватага, задняга, сярэдняга і прамежкавага мозга. Арганізацыя і значэнне кары вялікіх паўшар'яў.

Агульны план будовы вегетатыўнай нервовай сістэмы. Сімпатычны і парасімпатычны аддзелы, іх функцыі.

Гігіена нервовай сістэмы.

Дэманстрацыі: табліцы, муляжы, мадэлі.

Дэманстрацыйныя вопыты

1. Каленны рэфлекс.

ЭНДАКРЫННАЯ СІСТЭМА (3 гадзіны)

Гармоны і іх роля ў арганізме. Залозы ўнутранай сакрэцыі. Гіпофіз, яго сувязь з іншымі залозамі. Шчытападобная залоза. Надныračнікі. Залозы змешанай сакрэцыі: падстраўнікавая залоза, палавыя залозы.

Дэманстрацыі: табліцы, муляжы, якія паказваюць размяшчэнне ў арганізме і будову залоз унутранай сакрэцыі.

АПОРНА-РУХАЛЬНАЯ СІСТЭМА (5 гадзін)

Апорна-рухальная сістэма, яе пасіўная і актыўная часткі, іх функцыі.

Будова касцей. Віды касцей. Рост касцей. Злучэнні касцей.

Аддзелы шкілета чалавека: шкілет галавы, шкілет тулава, шкілет канечнасцей. Першая дапамога пры вывіхах і пераломах.

Будова і функцыі мышцаў. Асноўныя групы шкілетных мышцаў. Работа і стамленне мышцаў.

Значэнне рухальнай актыўнасці для захавання здароўя. Пастава, яе парушэнні. Плоскаступнёвасць.

Дэманстрацыі: мадэлі, табліцы шкілета; доўгія, кароткія, трубчастыя і губчатыя косці; чэрап.

Дэманстрацыйныя вопыты

2. Першая дапамога пры пераломе канечнасцей.

Практычныя работы

2. Будова і функцыі шкілета чалавека.

УНУТРАНАЕ АСЯРОДДЗЕ АРГАНІЗМА (5 гадзін)

Кампаненты ўнутранага асяроддзя арганізма: кроў, лімфа, тканкавая вадкасць. Пастаянства ўнутранага асяроддзя арганізма.

Састаў і функцыі крыві. Плазма крыві. Эрытрацыты. Гемаглабін, яго функцыі. Групы крыві і рэзус фактар. Трамбацыты. Згусанне крыві. Лейкацыты. Фагацытоз.

Імунная сістэма. Віды імунітэту. Вакцынацыя.

Дэманстрацыі: мікрапрэпараты.

Лабараторныя работы

1. Мікраскапічнае вывучэнне прэпаратаў крыві чалавека і жабы.

САРДЭЧНА-САСУДЗІСТАЯ СІСТЭМА (6 гадзін)

Кровазварот.

Сэрца, яго будова. Сардэчны цыкл. Аўтаматыя.

Будова і функцыі крывяносных сасудаў. Вялікі і малы кругі кровазвароту. Перамяшчэнне крыві па сасудах. Пульс. Крывяны ціск.

Нейрагумаральная рэгуляцыя кровазвароту.

Першая дапамога пры крывацёках.

Будова і функцыя лімфатычнай сістэмы. Утварэнне і рух лімфы.

Дэманстрацыі: муляж і мадэль сэрца, табліцы.

Дэманстрацыйныя вопыты

3. Вымярэнне крывянога ціску ў стане спакою і пасля фізічнай нагрузкі.

4. Першая дапамога пры крывацёках (артэрыальных, вянозных, капілярных).

Лабараторныя работы

2. Падлік частаты пульсу ў стане спакою і пасля фізічнай нагрузкі.

ДЫХАЛЬНАЯ СІСТЭМА (4 гадзіны)

Значэнне дыхання, яго асноўныя этапы. Будова і функцыі дыхальных шляхоў. Будова лёгкіх. Дыхальныя рухі. Жыццёвая ёмістасць лёгкіх. Газаабмен у лёгкіх і тканках. Транспарт газаў у крыві. Нейрагумаральная рэгуляцыя дыхання.

Гігіена дыхання. Паветрана-кропельныя інфекцыі, іх прафілактыка. Першая дапамога пры спыненні дыхання. Шкоднае ўздзеянне нікаціну.

Дэманстрацыі: муляжы, табліцы органаў дыхання.

Дэманстрацыйныя вопыты

5. Прыёмы штучнага дыхання і непрамога масажу сэрца.

СТРАВАВАЛЬНАЯ СІСТЭМА. АБМЕН РЭЧЫВАЎ (6 гадзін)

Значэнне харчавання і стрававання. Стрававальныя ферменты, іх значэнне і ўласцівасці.

Будова і асноўныя функцыі органаў стрававальнай сістэмы: ротавая поласць, глотка, стрававод, страўнік, кішэчнік, падстраўнікавая залоза і пячонка. Стрававальныя працэсы ў ротавай поласці. Глытанне. Стрававальныя працэсы ў страўніку, тонкім і тоўстым кішэчніку. Усмоктванне. Нейрагумаральная рэгуляцыя стрававання.

Гігіена харчавання. Харчовыя атручэнні і іх папярэджанне. Асновы рацыянальнага харчавання.

Абмен бялкоў, тлушчаў і вугляводаў. Водасалявы абмен.

Вітаміны, іх роля ў працэсах абмену рэчываў. Водараства-ральныя (С, B_p, B_6) і тлушчарастваральныя (А, D) вітаміны. Недахоп вітамінаў у ежы і яго вынікі.

Дэманстрацыі: табліцы і мадэлі, якія паказваюць працэсы стрававання.

ВЫДЗЯЛЯЛЬНАЯ СІСТЭМА (3 гадзіны)

Значэнне выдзялення ў жыццядзейнасці арганізма. Органы, якія прымаюць удзел у працэсах выдзялення: ныркі, потавыя залозы, лёгкія.

Мочавыдзяляльная сістэма. Будова і функцыі нырак. Нефрон. Утварэнне мачы. Гігіена мочавыдзяляльнай сістэмы.

Дэманстрацыі: табліцы, муляжы.

ПОКРЫЎНАЯ СІСТЭМА. СКУРА (3 гадзіны)

Будова скуры: эпідэрміс, дэрма, падскуравая тлушчавая клятчатка. Функцыі скуры. Роля скуры ў падтрымцы тэмпературнага гамеастазу.

Гігіена скуры.

Першая дапамога пры пашкоджаннях скуры (апёк, абмарожванне), цеплавым і сонечным ударах.

Роля загартоўвання ва ўмацаванні здароўя чалавека.

Дэманстрацыі: табліцы, якія паказваюць будову і функцыянаванне скуры.

Дэманстрацыйныя вопыты

6. Першая дапамога пры апёках, абмарожваннях, цеплавым і сонечным ударах.

РЭПРАДУКТЫЎНАЯ СІСТЭМА. ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЧАЛАВЕКА (5 гадзін)

Паняцце пра рэпрадукцыю і індывідуальнае развіццё чалавека.

Мужчынская палавая сістэма. Жаночая палавая сістэма. Апладненне. Цяжарнасць. Роды.

Палавое паспяванне. Планаванне сям'і і кантрацэптыўныя прэпараты.

Паняцце пра захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам (трыхаманоз, сіфіліс, ганарэя, ВІЧ-інфекцыя).

Алкаголь, нікацін і таксічныя рэчывы як фактары, што парушаюць індывідуальнае развіццё.

Дэманстрацыі: муляжы, табліцы.

СЕНСОРНЫЯ СІСТЭМЫ (4 гадзіны)

Значэнне сенсорных сістэм (аналізатараў, паводле І. П. Паўлава). Структура сенсорнай сістэмы (перыферычны, правадніковы, цэнтральны аддзелы). Агульная характарыстыка зрокавай, слыхавой, смакавай і нюхальнай, датыкальнай сенсорных сістэм (рэцэптары, праваднікі, коркавы цэнтр).

Будова і функцыі органа зроку. Дальназоркасць, блізарукасць. Гігіена зроку і першая дапамога пры пашкоджанні вачэй.

Будова і функцыі органа слыху. Вонкавае, сярэдняе і ўнутранае вуха. Гігіена слыху.

Дэманстрацыі: табліцы, муляжы.

ПАВОДЗІНЫ І ПСІХІКА (3 гадзіны)

Паняцце пра псіхіку і паводзіны чалавека. Безумоўныя і ўмоўныя рэфлексы. Умовы і механізм утварэння ўмоўных рэфлексаў. Тармажэнне ўмоўных рэфлексаў.

Сон, яго значэнне. Сны. Гігіена сну.

Дзейнасць мозга і псіхічныя функцыі. Свядомасць, адчуванне, успрыманне. Увага. Памяць. Мысленне і маўленне. Шкодны ўплыў алкаголю і таксічных рэчываў на псіхіку і паводзіны чалавека.

АСНОВЫ ЗДАРОВАГА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ (2 гадзіны)

Культура адносін да ўласнага здароўя. Выкананне санітарна-гігіенічных нормаў і правілаў здаровага ладу жыцця.

Фактары рызыкі развіцця захворванняў. Шкодныя і карысныя звычкі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ НАВУЧАННЯ ВУЧНЯЎ ІХ КЛАСА

Вучні п а в і н н ы:

называць:

арганоіды клеткі, іх функцыі;

асноўныя жыццёвыя працэсы арганізма;

органы, сістэмы органаў арганізма чалавека;

залозы знешняй, унутранай і змешанай сакрэцыі;

аддзелы нервовай сістэмы;

аддзелы шкілета і косці, спосабы злучэння, віды касцей;

прычыны ўзнікнення і меры прафілактыкі плоскаступнёвасці і скрыўлення пазваночніка, сардэчна-сасудзістых захворванняў, захворванняў органаў дыхання, парушэнняў зроку (блізарукасці і дальназоркасці) і слыху, захворванняў мочавыдзяляльнай сістэмы;

функцыі крыві, яе састаў;

асноўныя сасуды вялікага і малога кругоў кровазвароту;

функцыі дыхання, органы дыхання;

функцыі нырак у арганізме;

умовы ўтварэння ўмоўных рэфлексаў;

фактары, што адмоўна ўплываюць на індывідуальнае раз-іццё чалавека;

распазнаваць:

асноўныя віды тканак;

асноўныя органы і сістэмы органаў;

прыводзіць прыклады:

узаемасувязі будовы і функцый органаў і сістэм органаў;

умоўных і безумоўных рэфлексаў;

спосабаў прафілактыкі захворванняў чалавека;

характарызаваць:

клетку як структурна-функцыянальную адзінку жыцця; ролю ферментаў, гармонаў і іншых рэчываў у арганізме; механізмы рэгуляцыі фізіялагічных працэсаў; імунітэт, яго значэнне ў жыцці чалавека, прафілактыку ВІЧ-інфекцыі; будову сэрца; нейрагумаральны механізм рэгуляцыі сардэчнай дзейнасці;

асаблівасці будовы артэрый, капіляраў і вен; нейрагумаральны механізм рэгуляцыі дыхання; асаблівасці будовы органаў стрававальнай сістэмы; асаблівасці будовы скуры, звязаныя з функцыямі, якія яна выконвае;

працэсы, што ляжаць у аснове тэрмарэгуляцыі;

будову органаў жаночай і мужчынскай палавых сістэм;

будову органаў зроку і слыху;

механізм утварэння ўмоўных рэфлексаў;

праводзіць параўнанне:

клетак розных тканак арганізма;

механізмаў нервовай і гумаральнай рэгуляцыі;

розных тыпаў крывяносных сасудаў;

знешняга і ўнутранага тармажэння;

абгрунтоўваць:

узаемасувязь будовы і функцый тканак, органаў і сістэм органаў;

нормы, рэжым і правілы рацыянальнага харчавання;

уплыў разумовай і фізічнай працы, фізкультуры і спорту на стан здароўя чалавека;

шкодны ўплыў алкаголю, наркотыкаў, курэння на арганізм чалавека, прафілактыку шкодных звычак;

неабходнасць выканання правілаў асабістай гігіены;

праводзіць назіранні:

за станам свайго арганізма (вымярэнне тэмпературы цела, крывянога ціску, масы і росту, частаты пульсу і дыхання);

прымяняць веды для:

правядзення назіранняў за станам уласнага арганізма;

прафілактыкі інфекцыйных і прастудных захворванняў, траўматызму, ВІЧ-інфекцыі, шкодных звычак (курэнне, ужыванне алкаголю і наркотыкаў), парушэння паставы, зроку, слыху;

аказання першай дапамогі пры харчовым атручэнні, апёках, абмарожваннях, крывацёках, пераломах і вывіхах, спыненні дыхання;

абгрунтавання здаровага ладу жыцця, рацыянальнай арганізацыі працы і адпачынку.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Учебная программа по учебному предмету
«Физика»
для IX класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания

ФИЗИКА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Общая характеристика учебного предмета «Физика»

Учебный предмет «Физика», базирующийся на физике как науке о наиболее общих законах природы, является системообразующим для изучения физической географии, биологии, химии, астрономии и вносит существенный вклад в систему знаний об окружающем мире.

Дидактическая модель учебного предмета «Физика» предусматривает содержательный и процессуальный компоненты.

Источником наполнения содержательного компонента являются:

физические знания (научные факты, понятия, законы, теории, физическая картина мира);

методологические знания (знания о процессах и методах познания).

Источником наполнения процессуального компонента являются:

приемы изучения, соответствующие методам науки (использование наблюдения или теории для получения нового знания);

познавательная деятельность учащихся, соответствующая переходу от явления к его сущности и от сущности к явлению;

экспериментально-поисковая деятельность учащихся, соответствующая этапам и логике научной деятельности (наблюдение, выдвижение гипотезы, экспериментальная проверка гипотезы, формулировка закона, создание теории).

Содержание, основные требования к результатам учебной деятельности учащихся по физике определяются с учетом международного опыта построения содержания образовательных программ общего среднего образования, научной и практической значимости содержательного и процессуального компонентов учебного предмета «Физика».

Средствами учебного предмета «Физика» формируются научное мировоззрение и специфичная для физики экспериментально-исследовательская компетенция, поддерживаются и развиваются коммуникативная, информационная, ценностно-ориентационная, личностного саморазвития и иные компетенции.

Содержание, учебная деятельность учащихся, основные требования к ее результатам концентрируются по следующим **содержательным линиям**:

физические методы исследования явлений природы;

физические объекты и закономерности взаимодействия между ними;

физические аспекты жизнедеятельности человека.

Цели и задачи изучения учебного предмета «Физика»

В контексте целей обучения и воспитания на II ступени общего среднего образования **целями** изучения физики как учебного предмета являются:

формирование представлений о физической картине мира на основе освоения знаний: о механических, тепловых, электромагнитных и световых явлениях; величинах, характеризующих эти явления; законах, которым они подчиняются; методах научного познания природы;

понимание роли физики в жизни общества, взаимосвязи развития физики, общества, других наук, техники, технологий;

формирование общеучебных умений и навыков в решении практических задач, связанных с использованием физических знаний, в рациональном природопользовании и защите окружающей среды;

формирование познавательного интереса к физике и технике;

обеспечение подготовки к продолжению получения образования на III ступени общего среднего образования или на уровнях профессионально-технического, среднего специального образования;

развитие аналитического мышления, творческих способностей, осознанных мотивов учения;

воспитание эстетического восприятия мира, убежденности в возможности познания природы, в необходимости разумного использования достижений науки и технологий для дальнейшего развития общества, сохранения окружающей среды, уважения к творцам науки и техники; отношения к физике как к элементу общечеловеческой культуры.

Достижение целей изучения физики обеспечивается решением следующих **задач**:

на предметном уровне:

усвоение знаний об основных физических понятиях, законах и методах исследования; идей единства строения материи и неисчерпаемости процесса ее познания, понимание роли практики в познании физических явлений и законов;

формирование умений:

– проводить наблюдения природных явлений, описывать и обобщать результаты наблюдений, использовать простые измерительные приборы для изучения физических явлений, представлять результаты наблюдений или измерений с помощью таблиц, графиков и выявлять на этой основе эмпирические закономерности;

– применять полученные знания для объяснения разнообразных природных явлений и процессов, принципов действия важнейших технических устройств, решения физических задач;

– самостоятельно приобретать новые знания, решать физические задачи и выполнять экспериментальные исследования, в том числе с использованием информационных технологий;

развитие познавательных интересов, интеллектуальных и творческих способностей;

на межпредметном уровне (в контексте с учебными предметами естественно-научной составляющей образовательной программы базового образования (физика, география, биология, химия)):

формирование представлений о целостной научной картине мира, понимание возрастающей роли естественных наук и научных исследований в современном мире;

овладение умениями формулировать гипотезы, конструировать, проводить эксперименты, оценивать полученные результаты;

формирование умений безопасного и эффективного использования лабораторного оборудования, проведения точных измерений, наблюдений и адекватной оценки полученных результатов, обосновывать свои действия, основанные на межпредметном анализе учебных и практико-ориентированных задач;

формирование бережного отношения к окружающей среде;

на метапредметном уровне:

овладение учащимися универсальными учебными действиями как совокупностью способов действий, обеспечивающих им способность к самостоятельному усвоению новых знаний и умений (включая и организацию этого процесса), к эффективному решению различного рода жизненных задач, на основе которых формируются и развиваются компетенции учащегося;

на личностном уровне:

формирование у учащихся понимания значимости физического знания независимо от их профессиональной деятельности в будущем, ценности научных открытий и методов познания, творческой созидательной деятельности, образования на протяжении всей жизни.

Место учебного предмета в Типовом учебном плане общего среднего образования

Типовой учебный план общего среднего образования на изучение физики устанавливает в VII–IX классах по 2 учебных часа в неделю.

Содержание учебного предмета «Физика» в VII и VIII классах представлено областями физики как науки на уровне физических явлений, структурируется на основе рассмотрения различных форм движения материи в порядке их усложнения (механические явления, тепловые явления, электромагнитные явления, световые явления). В IX классе изучается механика, учебный материал концентрируется по генеральным линиям: классический принцип относительности; законы движения Ньютона; законы сохранения в механике. Содержание учебного предмета «Физика» является относительно завершенным.

Предъявляемые учебный материал содержательного компонента, перечень демонстрационных опытов, компьютерных моделей, фронтальных лабораторных работ процессуального компонента учебного предмета «Физика», основные требования к результатам учебной деятельности учащихся распределены по разделам (темам) отдельно для каждого класса и с учетом последовательности изучения учебного материала, выполнения фронтальных лабораторных работ.

Количество учебных часов, отведенное на изучение отдельных тем, является примерным. Оно зависит от предпочтений учителя в выборе педагогически обоснованных методов обучения и воспитания, форм проведения учебных занятий, видов учебной деятельности и познавательных возможностей учащихся.

Рекомендуемые подходы к организации образовательного процесса, формы, методы обучения и воспитания

Актуальными подходами к организации образовательного процесса являются системно-деятельностный, компетентностный и личностно ориентированный. При реализации каждого из указанных подходов учащийся является главным объектом образовательного процесса. При этом основное внимание уделяется активной разносторонней, в максимальной степени самостоятельной познавательной деятельности учащегося.

Механизмом реализации данных подходов при изучении физики являются современные технологии обучения и воспитания, обеспечивающие овладение учащимися методологическими, теоретическими знаниями, экспериментально-проектными умениями, приобретение опыта познавательной деятельности, развитие творческих способностей учащихся.

Контроль, или проверка результатов учебной деятельности учащихся, является обязательным компонентом образовательного процесса и определяется дидактикой как педагогическая диагностика.

Назначение проверки во всем многообразии ее форм, типов и методов проведения – выявление уровня усвоения учебного материала в соответствии с основными требованиями к результатам учебной деятельности учащихся, предъявляемые в настоящей учебной программе, и на этой основе корректировка учебно-познавательной деятельности учащихся.

Контрольные работы (по четыре в каждом из VII–IX классов) проводятся по темам, имеющим особое значение для продолжения изучения физики и с учетом их прикладного характера:

VII класс: «Физические методы познания природы»; «Движение и силы»; «Силы»; «Давление»;

VIII класс: «Расчет количества теплоты при нагревании и охлаждение. Горение. Плавление»; «Электрическое сопротивление. Закон Ома»; «Электрические явления»; «Световые явления»;

IX класс: «Равномерное и неравномерное движение. Сложение скоростей»; «Движение с ускорением»; «Динамика»; «Законы сохранения».

Количество самостоятельных работ с учетом многообразия их функций (ориентирующая, обучающая, диагностирующая, контролирующая, развивающая, воспитательная) определяет учитель.

Ожидаемые результаты освоения содержания образовательной программы базового образования при изучении физики

Личностные результаты отражают:

убежденность в возможностях познания природы;

осознание значимости бережного отношения к окружающей среде и природопользованию;

уважение к творцам науки и техники, виденье науки как элемента общечеловеческой культуры.

Метапредметные результаты отражают:

освоение новых форм учебной деятельности: лабораторно-исследовательской; проектно-исследовательской, семинарской и иных;

развитие универсальных учебных действий (регулятивных, учебно-познавательных, коммуникативных) средствами физики;

развитие умений работать с информацией, выделять в ней главное; отличать существенные признаки явлений и величин от несущественных; видеть несколько вариантов решений проблемы, выбирать наиболее оптимальный вариант.

Предметные результаты отражают:

сформированность представлений об объективности научного физического знания; о системообразующей роли физики для развития других естественных наук, техники и технологий; научного мировоззрения как результата изучения основ строения материи и закономерностей физических явлений;

приобретение опыта применения научных методов познания, наблюдения физических явлений, проведения опытов, простых экспериментальных исследований, прямых измерений с использованием современных измерительных приборов; понимание неизбежности погрешностей любых измерений;

осознание эффективности применения достижений физики и технологий в целях рационального природопользования;

сформированность представлений о рациональном использовании природных ресурсов и энергии, о загрязнении окружающей среды как следствии работы машин и механизмов;

сформированность умений прогнозировать, анализировать и оценивать последствия бытовой и производственной деятельности человека с позиции экологической безопасности.

Содержание учебного предмета

(2 ч в неделю, всего 70 ч)

1. Основы кинематики (27 ч)

Механическое движение. Относительность движения. Система отсчета.

Скалярные и векторные величины. Действия над векторами. Проекция вектора на ось.

Путь и перемещение. Равномерное прямолинейное движение. Скорость.

Неравномерное движение. Средняя и мгновенная скорость. Сложение скоростей.

Ускорение. Скорость при равнопеременном движении. Перемещение, координата и путь при равнопеременном движении.

Графики зависимости кинематических величин от времени при равномерном и равнопеременном движении.

Криволинейное движение. Линейная и угловая скорости. Период и частота. Ускорение при вращательном движении.

Фронтальные лабораторные работы

1. Определение абсолютной и относительной погрешностей прямых измерений.
2. Измерение ускорения при равноускоренном движении тела.
3. Изучение движения тела по окружности.

Демонстрации, опыты, компьютерные модели

Модель системы отсчета.
Относительность движения.
Поступательное и вращательное движения.
Равномерное и неравномерное движения.
Направление мгновенной скорости.
Движение тела по окружности.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащийся должен:

иметь представление:

о физических понятиях: система отсчета, материальная точка;
векторных физических величинах и действиях над ними;

знать и понимать:

смысл физических понятий: механическое движение, перемещение, скорость, ускорение, угловая скорость, период и частота обращения;

уметь:

описывать и объяснять физические явления: движение с постоянной скоростью, движение с постоянным ускорением, равномерное вращение;

владеть:

экспериментальными умениями: измерять физические величины – модули перемещения, ускорения; период и частоту обращения; оценивать погрешности результатов прямых измерений;

практическими умениями: анализировать графики зависимости кинематических величин от времени при равномерном и равнопеременном движении; решать качественные, графические и расчетные задачи на применение кинематических законов движения, правила сложения скоростей; определять скорость, ускорение, перемещение, путь и координаты материальной точки при поступательном движении с постоянным ускорением; определять угловую и линейную скорости, центростремительное ускорение, период и частоту при равномерном вращении материальной точки с применением формул: ускорения, скорости, перемещения при равномерном и прямолинейном движении с постоянным ускорением, угловой скорости, периода обращения, центростремительного ускорения.

2. Основы динамики (29 ч)

Взаимодействие тел. Сила. Движение по инерции. Первый закон Ньютона. Инерциальные системы отсчета.

Масса. Второй закон Ньютона.

Третий закон Ньютона. Принцип относительности Галилея.

Деформация тел. Сила упругости. Закон Гука.

Силы трения. Сила сопротивления среды.

Закон всемирного тяготения. Сила тяжести. Вес. Невесомость и перегрузки.

Движение тела под действием силы тяжести.

Фронтальные лабораторные работы

4. Проверка закона Гука.
5. Измерение коэффициента трения скольжения.
6. Изучение движения тела, брошенного горизонтально (компьютерный вариант).

Демонстрации, опыты, компьютерные модели

Сравнение масс тел.

Второй закон Ньютона.

Третий закон Ньютона.

Зависимость силы упругости от деформации тела.

Силы трения.

Падение тел в трубке Ньютона.

Движение тела, брошенного горизонтально.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащийся должен:

иметь представление:

о (об) физических моделях: инерциальные системы отсчета, абсолютно твердое тело; упругих и пластических деформациях;

границах применимости законов классической механики;

практическом применении законов динамики;

знать и понимать:

смысл физических понятий: инерция, масса, плотность, сила, вес тела, невесомость, перегрузка;

смысл физических законов (принципов): Ньютона, всемирного тяготения, Гука, принципа относительности Галилея;

уметь:

применять законы динамики Ньютона для описания и объяснения механических явлений;

владеть:

экспериментальными умениями: измерять физические величины – силу (тяжести, трения, упругости, вес), жесткость пружины, коэффициент трения; строить графики зависимости силы упругости от удлинения пружины, силы трения от силы давления;

практическими умениями: оценивать зависимость тормозного пути транспортного средства от скорости его движения; решать качественные, графические и расчетные задачи на применение законов Ньютона, на движение тел (системы тел) под действием сил (тяготения, упругости, трения) с применением формул, выражающих законы Ньютона, всемирного тяготения, Гука, формул сил тяжести, трения.

3. Законы сохранения в механике (14 ч)

Импульс тела и системы тел. Закон сохранения импульса. Реактивное движение.

Механическая работа и мощность.

Механическая потенциальная и кинетическая энергия. Полная энергия системы. Закон сохранения энергии.

Фронтальные лабораторные работы

7. Закон сохранения импульса (компьютерный вариант).
8. Закон сохранения механической энергии (компьютерный вариант).

Демонстрации, опыты, компьютерные модели

Закон сохранения импульса.

Реактивное движение.

Изменение энергии тела при совершении работы.

Взаимные превращения механической энергии.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Учащийся должен:

иметь представление:

о замкнутой системе тел;

реактивном движении;

знать и понимать:

смысл физических понятий: импульс тела, импульс силы;

смысл теоремы об изменении кинетической энергии;

смысл и условия применимости законов сохранения: импульса и энергии;

уметь:

применять законы сохранения импульса и механической энергии, теорему об изменении кинетической энергии для описания и объяснения физических явлений;

владеть:

практическими умениями: решать качественные, расчетные и графические задачи на применение законов сохранения импульса и механической энергии, теоремы об изменении кинетической энергии с применением формул: импульса, механической работы и мощности, кинетической энергии тела, потенциальной энергии тела в поле тяготения и упруго деформируемого.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 92

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Фізіка»
для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета «Фізіка»

Вучэбны прадмет «Фізіка», які базіруецца на фізіцы як навуцы пра найбольш агульныя законы прыроды, з'яўляецца сістэмаўтваральным для вывучэння вучэбных прадметаў: фізічнай геаграфіі, біялогіі, хіміі, астраноміі – і ўносіць істотны ўклад у сістэму ведаў пра навакольны свет.

Дыдактычная мадэль вучэбнага прадмета «Фізіка» прадугледжвае зместавы і працэсуальны кампаненты.

Крыніцай напаўнення зместавага кампанента з'яўляюцца:

фізічныя веды (навуковыя факты, паняцці, законы, тэорыі, фізічная карціна свету);

метадалагічныя веды (веды аб працэсах і метадах пазнання).

Крыніцай напаўнення працэсуальнага кампанента з'яўляюцца:

прыёмы вывучэння, адпаведныя метадам навукі (выкарыстанне назірання або тэорыі для атрымання новых ведаў);

пазнавальная дзейнасць навучэнцаў, адпаведная пераходу ад з'явы да яе сутнасці і ад сутнасці да з'явы;

эксперыментальна-пошукавая дзейнасць навучэнцаў, адпаведная этапам і логіцы навуковай дзейнасці (назіранне, вылучэнне гіпотэзы, эксперыментальная праверка гіпотэзы, фармулёўка закону, стварэнне тэорыі).

Змест, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па фізіцы вызначаюцца з улікам міжнароднага вопыту пабудовы зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, навуковай і практычнай значнасці зместавага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага прадмета «Фізіка».

Сродкамі вучэбнага прадмета «Фізіка» фарміруюцца навуковы светапогляд і спецыфічная для фізікі эксперыментальна-даследчая кампетэнцыя, падтрымліваюцца і развіваюцца камунікатыўная, інфармацыйная, каштоўнасна-арыентаваная кампетэнцыі, кампетэнцыя асобаснага самаразвіцця і інш.

Змест, вучэбная дзейнасць навучэнцаў, асноўныя патрабаванні да яе вынікаў канцэнтруюцца па наступных зместавых лініях:

фізічныя метады даследавання з'яў прыроды;

фізічныя аб'екты і заканамернасці ўзаемадзеяння паміж імі;

фізічныя аспекты жыццядзейнасці чалавека.

Мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Фізіка»

У кантэксце мэт навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі **мэтамі** вывучэння фізікі як вучэбнага прадмета з'яўляюцца:

фарміраванне ўяўленняў аб фізічнай карціне свету на аснове засваення ведаў: аб механічных, цеплавых, электрамагнітных і светлавых з'явах; велічынях, якія характарызуюць гэтыя з'явы; законах, якім яны падпарадкоўваюцца; метадах навуковага пазнання прыроды;

разуменне ролі фізікі ў жыцці грамадства, узаемасувязі развіцця фізікі, грамадства, іншых навук, тэхнікі, тэхналогій;

фарміраванне агульнавучэбных уменняў і навыкаў у вырашэнні практычных задач, звязаных з выкарыстаннем фізічных ведаў, у рацыянальным прыродакарыстанні і ахове навакольнага асяроддзя;

фарміраванне пазнавальнага інтарэсу да фізікі і тэхнікі;

забеспячэнне падрыхтоўкі да працягу атрымання адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі або на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

развіццё аналітычнага мыслення, творчых здольнасцей, усвядомленых матываў вучэння;

выхаванне эстэтычнага ўспрымання свету, перакананасці ў магчымасці пазнання прыроды, у неабходнасці разумнага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхналогій для далейшага развіцця грамадства, захавання навакольнага асяроддзя, павагі да творцаў навукі і тэхнікі; адносін да фізікі як да элемента агульначалавечай культуры.

Дасягненне мэт вывучэння фізікі забяспечваецца рашэннем наступных задач:

на прадметным узроўні:

засваенне ведаў пра асноўныя фізічныя паняцці, законы і метады даследавання; ідэй адзінства будовы матэрыі і невычэрпнасці працэсу яе пазнання, разуменне ролі практыкі ў пазнанні фізічных з’яў і законаў;

фарміраванне ўменняў:

праводзіць назіранні прыродных з’яў, апісваць і падагульняць вынікі назіранняў, выкарыстоўваць простыя вымяральныя прыборы для вывучэння фізічных з’яў, прадстаўляць вынікі назіранняў або вымярэнняў з дапамогай табліц, графікаў і выяўляць на гэтай аснове эмпірычныя заканамернасці;

прымяняць атрыманыя веды для тлумачэння разнастайных прыродных з’яў і працэсаў, прынцыпаў дзеяння найважнейшых тэхнічных прылад, рашэння фізічных задач;

самастойна набываць новыя веды, рашаць фізічныя задачы і выконваць эксперыментальныя даследаванні, у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій;

развіццё пазнавальных інтарэсаў, інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

на міжпрадметным узроўні (у кантэксце з вучэбнымі прадметамі прыродазнаўчага складніка адукацыйнай праграмы базавай адукацыі (фізіка, геаграфія, біялогія, хімія)):

фарміраванне ўяўленняў аб цэласнай навуковай карціне свету, разуменне ўзрастаючай ролі прыродазнаўчых навук і навуковых даследаванняў у сучасным свеце;

авалоданне ўменнямі фармуляваць гіпотэзы, канструяваць, праводзіць эксперыменты, ацэньваць атрыманыя вынікі;

фарміраванне ўменняў бяспечнага і эфектыўнага выкарыстання лабараторнага абсталявання, правядзення дакладных вымярэнняў, назіранняў і адэкватнай ацэнкі атрыманых вынікаў, абгрунтоўваць свае дзеянні, заснаваныя на міжпрадметным аналізе вучэбных і практыка-арыентаваных задач;

фарміраванне беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя.

на метапрадметным узроўні:

авалоданне вучнямі ўніверсальнымі вучэбнымі дзеяннямі як сукупнасцю спосабаў дзеянняў, якія забяспечваюць здольнасць да самастойнага засваення новых ведаў і ўменняў (уключаючы і арганізацыю гэтага працэсу), да эфектыўнага вырашэння рознага роду жыццёвых задач, на аснове якіх фарміруюцца і развіваюцца кампетэнцыі навучэнца.

на асобасным узроўні:

фарміраванне ў вучняў разумення значнасці фізічных ведаў незалежна ад іх прафесійнай дзейнасці ў будучыні, каштоўнасці навуковых адкрыццяў і метадаў пазнання, творчай стваральнай дзейнасці, адукацыі на працягу ўсяго жыцця.

Месца вучэбнага прадмета ў тыпавых вучэбных планах агульнай сярэдняй адукацыі

Тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі на вывучэнне фізікі вызначае ў VIII і IX класах па 2 вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Змест вучэбнага прадмета «Фізіка» ў VIII класе прадстаўлены галінамі фізікі як навукі на ўзроўні фізічных з'яў, структуруецца на аснове разгляду розных форм руху матэрыі ў парадку іх ускладнення (цеплавыя з'явы, электрамагнітныя з'явы, светлавыя з'явы). У IX класе вывучаецца механіка. Вучэбны матэрыял канцэнтруецца па генеральных лініях: класічны прынцып адноснасці; законы руху Ньютана; законы захавання ў механіцы. Змест вучэбнага прадмета «Фізіка» з'яўляецца адносна завершаным.

Прад'яўлены вучэбны матэрыял зместавага кампанента, пералік дэманстрацыйных вопытаў, камп'ютарных мадэлей, франтальных лабараторных работ працэсуальнага кампанента вучэбнага прадмета «Фізіка», асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў размеркаваны па раздзелах (тэмах) асобна для кожнага класа і з улікам паслядоўнасці вывучэння вучэбнага матэрыялу, выканання франтальных лабараторных работ.

Колькасць вучэбных гадзін, адведзеная на вывучэнне асобных тэм, з'яўляецца прыкладнай. Яна залежыць ад выбару настаўнікам педагагічна абгрунтаваных метадаў навучання і выхавання, форм правядзення вучэбных заняткаў, відаў вучэбнай дзейнасці і пазнавальных магчымасцей навучэнцаў.

Рэкамендаваныя падыходы да арганізацыі адукацыйнага працэсу, формы, метады навучання і выхавання

Актуальнымі падыходамі да арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца сістэмна-дзейнасны, кампетэнтнасны і асобасна арыентаваны. Пры рэалізацыі кожнага з названых падыходаў вучань з'яўляецца галоўным аб'ектам адукацыйнага працэсу. Пры гэтым асноўная ўвага надаецца актыўнай рознабаковай, у максімальнай ступені самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучня.

Механізмам рэалізацыі гэтых падыходаў пры вывучэнні фізікі з'яўляюцца сучасныя тэхналогіі навучання і выхавання, якія забяспечваюць авалоданне вучнямі метадалагічнымі, тэарэтычнымі ведамі, эксперыментальна-праектнымі ўменнямі, набыццё вопыту пазнавальнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў.

Кантроль, або праверка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, з'яўляецца абавязковым кампанентам адукацыйнага працэсу і вызначаецца дыдактыкай як педагагічная дыягностыка.

Прызначэнне праверкі ва ўсёй разнастайнасці яе форм, тыпаў і метадаў правядзення – выяўленне ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу ў адпаведнасці з асноўнымі патрабаваннямі да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, што прад'яўляюцца ў вучэбнай праграме, і на гэтай аснове карэкціроўка вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

Кантрольныя работы (па чатыры ў VIII і IX класах) праводзяцца па тэмах, якія маюць асаблівае значэнне для працягу вывучэння фізікі і з улікам іх прыкладнога характару.

VIII клас: «Разлік колькасці цеплыні пры награвanні і астуджэнні. Гарэнне. Плаўленне»; «Электрычнае супраціўленне. Закон Ома»; «Электрычныя з'явы»; «Светлавыя з'явы»;

IX клас: «Раўнамерны і нераўнамерны рух. Складанне скарасцей»; «Рух з паскарэннем»; «Дынаміка»; «Законы захавання».

Колькасць самастойных работ з улікам разнастайнасці іх функцый (арыентацыйная, навучальная, дыягнастычная, функцыя кантролю, развіццёвая, выхаваўчая) вызначае настаўнік.

Чакаемыя вынікі засваення зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі пры вывучэнні фізікі

Асобасныя вынікі адлюстроўваюць:

перакананасць у магчымасцях пазнання прыроды;

ўсведамленне значнасці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання;

павагу да творцаў навукі і тэхнікі, бачанне навукі як элемента агульначалавечай культуры.

Метапрадметныя вынікі адлюстроўваюць:

засваенне новых форм вучэбнай дзейнасці: лабараторна-даследчай; праектна-даследчай, семінарскай і іншых;

развіццё ўніверсальных вучэбных дзеянняў (рэгулятыўных, вучэбна-пазнавальных, камунікатыўных) сродкамі фізікі;

развіццё ўменняў працаваць з інфармацыяй, вылучаць у ёй галоўнае; адрозніваць істотныя прыметы з'яў і велічынь ад неістотных; бачыць некалькі варыянтаў рашэння праблемы, выбіраць найбольш аптымальны варыянт.

Прадметныя вынікі адлюстроўваюць:

сфарміраванасць уяўленняў аб аб'ектыўнасці навуковых фізічных ведаў; аб сістэмаўтваральнай ролі фізікі для развіцця іншых навук, тэхнікі і тэхналогій; навуковага светапогляду як выніку вывучэння асноў будовы матэрыі і заканамернасцей фізічных з'яў;

для мышцаў рук: згінанне і разгінанне рук з гантэлямі седзячы на лаўцы пад вуглом 45°; хопам зверху разгінанне рук са штангай з-за галавы ў становішчы стоячы, лежачы на нахіленай лаўцы;

для мышцаў брушнога прэса: падцягванне ў вісе каленаў да грудзей; стоячы нахілы тулава ў бакі; кругавыя рухі тулавам з гантэлямі за галавой;

для мышцаў сцягна: частковыя прысяданні (практыкаванне выконваецца на чвэрць, палову або тры чвэрці амплітуды) са зменай тэмпу і колькасці паўтораў.

Практыкаванні, комплексы і ульні для развіцця каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцяў вучняў: кросавы бег ад 10 да 30 хвілін з частатой пульса 120–140 уд/хв; гульня ў футбол, баскетбол, гандбол; агульнаразвіваючыя практыкаванні з абцяжараннем ўласнага цела, з рознымі эспандарами; практыкаванні на гімнастычнай перакладзіне, брусах, трэнажорах; комплексы практыкаванняў кругавой трэніроўкі, якія ўключаюць да 8–12 станцый.

КАНЬКАБЕЖНЫ СПОРТ

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспекі заняткаў на ўроках па канькабежным спорце. Падрыхтоўка канькоў і адзення да заняткаў на лёдзе. Правілы папярэджання траўмаў і абмаражэнняў.

Практический материал

Спосабы руху. Хада ў каньках па снезе. Стаянне на каньках на лёдзе. Адштурхванне па чарзе правай і левай нагамі. Слізганне на двух каньках па краі лядовай пляцоўкі. Слізганне на адным каньку прыстаўляючы другі, на двух каньках «змейкай». Адштурхванне і слізганне на двух каньках па прамой, па павароце направа і налева. Павароты на двух каньках дугой і прыстаўнымі крокамі. Тармажэнне «паўплугам» і «плугам». Старт. Бег па прамой і павароце. Бег з махавымі рухамі двух рук. Фінішаванне. Бег на каньках 100-200-300-500 м без уліку часу. Рухавыя гульні на лёдзе.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

Тэарэтычныя звесткі

Разнавіднасці і дыстанцыі бегу. Разнавіднасці і спосабы скачкоў. Разнавіднасці кіданняў і штуршкоў. Лёгкаатлетычныя мнагабор'і. Лёгкая атлетыка у Дзяржаўным фізкультурна-аздараўленчым комплексе Рэспублікі Беларусь.

Практычны матэрыял

Бег. Са зменай хуткасці, са зменай напрамку, з павелічэннем і памяншэннем даўжыні кроку, з выскокваннямі ўверх штуршком правай і левай нагой. Эстафетны бег з адрэзкамі 30, 60, 100 м. Чаўночны бег 3 × 10 м, 4 × 9 м, 10 × 5 м. Бег з раўнамернай і зменнай хуткасцю, кросавы бег.

Скачкі. З месца штуршком дзвюма нагамі. Шматскоки на двух нагах. Выскокванні ўверх з крананнем рукой прадмета. У даўжыню з разгону на далёкасць. У вышыню з разгону вывучаным спосабам.

Кіданне. Тэніснага мяча на далёкасць з месца, з чатырох-шасці крокаў і з поўнага разгону на далёкасць, у гарызантальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 10–25 м., на далёкасць адскоку ад сцяны.

ЛЫЖНЫЯ ГОНКІ

Тэарэтычныя звесткі

Умовы захоўвання і асаблівасці падрыхтоўкі лыжнага інвентару, адзення і абутку да заняткаў. Спосабы папярэджання абмаражэнняў пры бегу на лыжах. Аказанне першай дапамогі пры траўмах і абмаражэннях. Уплыў заняткаў лыжнымі гонкамі на ўмацаванне здароўя. Гісторыя развіцця лыжнага спорту ў Рэспубліцы Беларусь. Лыжныя гонкі ў Дзяржаўным фізкультурна-аздараўленчым комплексе Рэспублікі Беларусь.

Практычны матэрыял

Павароты пераступаннем на месцы і ў руху. Павароты махам на месцы праз лыжу наперад і праз лыжу ўзад.

Папераменны двухкрокавы і адначасовы аднакрокавы ход. Пераход з папераменнага ходу на адначасовы. Чаргаванне папераменнага двухкрокавага з адначасовым аднакрокавым ходам. Адначасовы двухкрокавы і папераменны чатырохкрокавы ход. Чаргаванне папераменных і адначасовых хадоў. Каньковы ход. Чаргаванне каньковага ходу з адначасовым і папераменным лыжнымі хадамі. Бяскрокавы ход. Рух па слабаперасечанай мясцовасці з чаргаваннем адначасовых, папераменных і бяскрокавага хадоў.

Ўздым «паўелачкай», «елачкай» і «лесвічкай». Спуск прама і наўскос ў асноўнай стойцы. Спуск прама ў нізкай стойцы.

Тармажэнне «плугам», «упорам». Тармажэнне бакавым саслізгваннем.

Пераадоленне перашкод на лыжах спосабамі пераступанне, пераскок, пералазанне. Пераадоленне грудоў (30–50 см вышынёй) і западзін пры перамяшчэнні у нізкай стойцы.

Праходжанне навучальных дыстанцый з выкарыстаннем развучаных спосабаў перамяшчэння. Праходжанне вучэбных дыстанцый з пераадоленнем спускаў і пад'ёмаў.

ПЛАВАННЕ

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспечных паводзін вучняў у басейне. Падрыхтоўка купальных прыладаў да заняткаў па плаванні. Правілы асабістай і грамадскай гігіены пры наведванні басейна. Правілы бяспечнага купання ў адкрытых вадаёмах.

Спосабы спартыўнага плавання. Уплыў заняткаў плаваннем на здароўе навучэнцаў. Гартавальны эфект заняткаў плаваннем. Самакантроль пры занятках плаваннем.

Лепшыя плыўцы свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Практыкаванні на сушы. Актыўныя і пасіўныя практыкаванні для развіцця рухомасці ступні, плечавых, тазасцёгнавых і галёнкаступнёвых суставаў. Практыкаванні для развіцця сілавой трываласці мышцаў рук, ног, брушнога прэса, спіны. Імітацыйныя практыкаванні для развіцця каардынацыі рухаў рук і ног пры плаванні абраным стылем. Спецыяльныя практыкаванні для адпрацоўкі павароту.

Практыкаванні ў вадзе. Практыкаванні для фарміравання тэхнікі руху рукамі, нагамі і дыхання пры плаванні абраным стылем. Плаванне ў поўнай каардынацыі абраным стылем. Практыкаванні для адпрацоўкі тэхнікі паваротаў пры плаванні абраным стылем. Практыкаванні для адпрацоўкі тэхнікі старту. Праплыванне да 100 м любым спартыўным спосабам. Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на грудзях»: імітацыя грабка рукамі на сушы; плаванне з дошкай на нагах, плаванне на руках, узгадненне рухаў рук, ног і дыхання; з зыходнага палажэння лежачы на грудзях, рукі

ўверсе – праплыванне адрэзкаў 5–6 м, выконваючы гребок толькі левай рукой, толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі, выкарыстоўваючы для падтрымання ног плавальныя дошкі, надзіманыя кругі і да т. п.; тое ж, але з актыўнымі рухамі нагамі і поўным цыклам дыхання; плаванне спосабам «кроль на грудзях» у поўнай каардынацыі дыхання з рухамі рук і ног. Плаванне 25 метраў без уліку часу.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на спіне»: імітацыя грабка рукамі на сушы; з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверх проплывание адрэзкаў 5–6 м, выконваючы грабок толькі левай рукой, толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі, выкарыстоўваючы для падтрымання ног дошкі, надзіманыя кругі і да т. п.; тое ж, але з актыўнымі рухамі нагамі і поўным цыклам дыхання; плаванне спосабам «кроль на спіне» ў поўнай каардынацыі дыхання з работай рук і ног. Плаванне 25 метраў без уліку часу.

Скачкі ў ваду. Скачкі ў ваду з борціка нагамі ўніз. Спад галавой уніз з зыходных становішчаў седзячы на борціку і седзячы на тумбачцы. Стартавы скачок у ваду з тумбачкі.

Развіццё хуткасных, хуткасна-сілавых, сілавых, каардынацыйных здольнасцяў, гнуткасці, трываласці з акцэнтам на развіццё аэробнай трываласці.

ТЭНІС НАСТОЛЬНЫ

Тэарэтычныя звесткі

Тэніс настольны – алімпійскі від спорту. Тэніс ў адзінай спартыўнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку тэнісіста. Харчаванне пры занятках тэнісам. Перайначванне тэхнікі гульні ў настольны тэніс. Удасканаленне абсталявання і інвентара. Правілы гульні. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Лепшыя спартсмены свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Практычны матэрыял

Бег 10, 30, 60 м, бег з паскарэннем, чаўночны бег 4 × 9 м, 6 × 20 м, 10 × 5 м. Чаўночны бег з вар'іраваннем звычайнага бегу з бегам спінай наперад. Бег з максімальнай хуткасцю 5 × 30 м, 10 × 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 хвілін.

Патройныя і пяцярныя скачкі з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Прысяданні па чарзе на правай і левай нагах. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180°у правую і левую боку. Паскарэнні пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок са спружыністымі прысяданнямі. Пераскок праз гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем сцёгнаў («кенгуру»).

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні хопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока-нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, аб сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, з перакладаннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя удараў з ракеткай і без ракеткі з абцяжаральнікам у руцэ; адзіночных, серыйных удараў, удараў з перасоўваннямі направа і налева, наперад і назад; падачы мяча з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай; ўдараў у розным тэмпе перад люстэркам; удараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальна хуткага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сцяну і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня дзвюма ракеткамі, гульня «негульнявой» рукой. Гульня двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух чалаўцык.

Падача з элементамі вывучанага ўдару. Ўдар на стале па дыяганалі. Змена кірунку палёту мяча па шырыні стала. Змена траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змена даўжыні палёту мяча. Удар па зменлівым прыходным кручэнні.

Змена тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманьні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаным ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з паловы стала, з дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаным ударам па кароткім і доўгім прыходных мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні направа-налева, наперад-назад. Гульня штуршком злева доўга-каротка. Гульня па ўзыходным, сыходным мячы, у вышэйшай кропцы адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў размечаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Падрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай направа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская і з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Тактыка гульні ў сучасны настольны тэніс (на прыкладзе дэманстрацыі запісу гульні з паказам і разборам асноўных варыянтаў тактычных дзеянняў).

Прымяненне вывучаных элементаў у вучэбнай гульні.

ФУТБОЛ

Тэарэтычныя звесткі

Футбол – алімпійскі від спорту. Разнавіднасці футбола: футбол, міні-футбол, футбол у залах, пляжны футбол. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку футбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні гульцоў у нападзе, паўабароне, абароне. Тэхніка-тактычныя дзеянні варатара. Абавязкі і правы гульцоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па футболе.

Самакантроль на занятках футболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя футбалісты свету, Еўропы, рэспублікі і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Агульнападрыхтоўчыя, спецыяльна-падрыхтоўчыя практыкаванні і эстафеты з футбольным мячом. Рухавыя гульні і эстафеты з вядзеннем мяча, з абводкай стоек, з прыёмам і спыненнем мяча, з ударамі па варотах, у «лабірынт» (з мячом і без мяча), на збліжэнне з супернікам, з двума і трыма нападальнікамі на пляцоўцы для міні-футбола, з абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), шматпланавыя гульні для развіцця каардынацыйных здольнасцяў, хуткасных здольнасцяў. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы, удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом, гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гульнявой

трываласці, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча, фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні, спрошчаныя гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 гульцоў, гульні для каманд з 7 чалаўцык, тэсты на гульнёвыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалаўцык з улікам падзелу поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагамі па нерухомым мячы і мячы, што коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском. Практыкаванні ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак вядзенне-перадача, прыём-перадача, прыём-вядзенне-перадача.

Ўдары па мячы на далёкасць і дакладнасць, абводка-адбіранне мяча, абводка-адбор-удар у вароты, перахоп мяча, гульня галавой, камбінацыі ў тройках з мячом, дзеянні без мяча (адчыненне, адцягненне ўвагі, стварэнне колькаснай перавагі), узаемадзеянне двух нападальнікаў супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападальніка, гульнёвыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т. п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцяў, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў. Гульні з бегам, скачкамі, перадачамі мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнёвай трываласці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннямі, рыўкамі, скачкамі), хуткасна-сілавых якасцяў, сілы.

ПРЫКЛАДНЫЯ ДАМАШНІЯ ЗАДАННІ

Для вучняў VIII–IX класаў.

Комплекс ранішняй гімнастыкі з 10–12 практыкаванняў у чаргаванні з гімнастычнай палкай, скакалкай, гантэлямі. Раўнамерны бег да 2 км (дз) і 3–4 км (м). Язда на веласіпедзе 8–10 км. Хадзьба на лыжах 3–5 км. Паўторны бег з высокім падыманнем сцягна і максімальнай частатой рухаў. Віс на сагнутых руках, падцягванне ў вісе стоячы на нізкай перакладзіне (дз). Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне, рукі за галавой. Падыманне і апусканне прамых ног са становішча лежачы на спіне з дакрананнем да падлогі за галавой. Падыманне і апусканне, адвядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1–3 кг. З гантэлямі ў руках прысяданні па чарзе на правай і левай нагах. Прысяданні з выскокваннем уверх. Раўнавага на адной назе (стойка «Фламінга»). Скачкі праз кароткую скакалку да 5 мін. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы і ва ўпоры седзячы ззаду.

Падрыхтоўка і ўдзел у школьных і раённых фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах, днях здароўя, спартыўных спаборніцтвах.

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ»

Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[30]

Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики

№ п/п	Наименование	Единица измерения	Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.):				Примечания
			до 220	до 440	до 880	свыше 880	
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–

2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг
7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазания диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–
11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							
28	Брусок деревянный 5 × 5 × 10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–
30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1	1	1	2	от 1 до 100
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–
33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–
Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–
44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–

46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–		приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						
58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–
58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–
60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–
61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–
62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–

74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемый за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей							
Технические средства обучения							
87	Видеокамера	штука	1	1	1	1	–
88	Компьютер	штука	1	1	1	1	–
89	Мегафон	штука	1	1	2	3	–
90	Микрофон	штука	1	1	1	2	–
91	Музыкальный центр	штука	1	1	1	1	–
92	Проектор мультимедийный	штука	1	1	1	1	–
93	Телевизор	штука	1	1	1	1	–
94	Усилитель с колонками	штука	1	1	1	1	–
95	Шнур (удлинитель) электрический	штука	1	1	1	1	до 50 м
96	Экран переносной	штука	1	1	1	1	–
Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование							
97	Веревочка с грузом	штука	2	3	4	6	до 5 м
98	Тренажер (операционный или многофункциональный)	штука	2	4	4	6	–
99	Штанга	штука	1	2	2	3	–
100	Эспандер	штука	6	8	10	15	–
101	Гантели разборные	пара	4	8	10	12	до 10 кг
Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования							
102	Костюм спортивный	штука	10	18	20	20	–
103	Майка, полурукавка, футболка спортивная	штука	10	18	20	20	–
104	Трусы спортивные	штука	10	18	20	20	–
105	Кроссовки спортивные	пара	10	18	20	30	–

[30] К постановлению Министерства образования Республики Беларусь от 14.07.2014 № 105.

Дадатак 2

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 1000, 1500 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Старт групавы. Вучням, якія парушылі правілы спаборніцтваў па бегу, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання кантрольных практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

6-хвілінны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне размячаецца на кожныя 10 або 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па сканчэнні шасці мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе іх застаў сігнал. Потым настаўнік кожнаму вучню індывідуальна

вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе вучань перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

Хадзьба 1500, 2000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна. Рэкамендуецца выконваць тэставае практыкаванне асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Пры невялікай напаўняльнасці класа дапускаецца выкананне практыкавання адначасова ўсімі вучнямі. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на бег, чаргаваць бег з хадзьбой, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Час пераадолення дыстанцыі вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Падцягванне на перакладзіне выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хопам зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца згінанні тулава і ног у каленных суставах, развядзенне, скрыжаванне і іншыя рухі нагамі, рыўкі, махі і разгойдванне, перахопы рук. Падцягванне залічваецца, калі падбароддзе вучня знаходзіцца вышэй за ўзровень перакладзіны, а пры апусканні рукі поўнасцю выпрамляюцца ў локцевых суставах.

Падыманне тулава за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, стопы ног зафіксаваныя». Вугал у каленным суставе павінен складаць 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дакрананні локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дакрананнем лапаткамі да гімнастычнага мата.

Падыманне і апусканне прамых ног за 1 хвіліну выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі за галавой, прамыя ногі разам. Настаўнік ці другі вучань размяшчаецца з боку галавы тэсціруемага і ўтрымлівае яго за локцевыя суставы. Па сігнале настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань падымае прамыя ногі да вугла 90° да моманту дакранання галёнкай да гімнастычнай палкі, якую загадзя замацавалі ў нерухомым становішчы або якую ўтрымлівае настаўнік. Затым падыспытны апускае ногі, дакранаецца пяткамі да гімнастычнага мата. Залічваецца колькасць поўных цыклаў (падыманне і апусканне) на працягу 1 мінуты.

Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы. Вучань прымае зыходнае становішча «упор лежачы, рукі на шырыні плячэй, ногі разам». Захоўваючы прамое становішча тулава і ног, вучань згінае рукі ў локцевых суставах да вугла не менш за 90 градусаў і, выпрастваючы рукі, вяртаецца ў зыходнае становішча. Не дапускаецца згінаць ногі і тулава, дакранацца падлогі каленямі і грудзьмі. Залічваецца колькасць згінанняў і разгінанняў рук без парушэння названых патрабаванняў.

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага або нізкага старту.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Чаўночны бег 4 × 9 метраў выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу не большая за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца 2 спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту ў напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць два брускі 50 × 50 × 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.



Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, дзе кожны бярэ адзін брусок (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (ці за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся на лініі. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы скорасці, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з дзвюх спроб.

Скачкі праз кароткую скакалку за 1 хвіліну выконваюцца на цвёрдым пакрыцці (у спартыўнай зале, на гульнявой пляцоўцы або бегавой дарожцы стадыёна). Кручэнне скакалкі выконваецца толькі наперад. Скачкі выконваюцца з абавязковай апорай на абедзве нагі адначасова. Дапускаецца выкарыстоўваць любыя скакалкі прамысловай вытворчасці або самаробныя (напрыклад, з турысцкага фала). Забараняецца выкарыстоўваць на скакалцы ўстаўкі-ўцяжарвальнікі. Пры памылцы ў час выканання скачкоў секундамер не спыняецца, а вучань працягвае выконваць скачкі. Залічваецца сумарная колькасць скачкоў на працягу 30 секунд або 1 мінуты.

Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Трайны скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы або на дарожцы стадыёна з прызямленнем пасля трэцяга скачка ў скачковую яму. Скачкі выконваюцца штуршком дзвюма нагамі злітна без затрымак і спыненняў. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі выконваецца ў спартыўнай зале з зыходнага становішча «седзячы, ногі паасобку, пяткі на кантрольнай лініі». Выкарыстоўваецца мяч вагой 1 кг. Вучань утрымлівае мяч дзвюма рукамі над галавой, затым згінае рукі ў локцевых суставах, апускае мяч за галаўку і рэзкім рухам кідае яго ўперад-уверх. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе».

Вучань садзіцца на падлогу з боку знака «-» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі «ОВ» упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі ў каленных суставах.

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы

затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнёныых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.



Нахіл уперад з зыходнага становішча «стоячы на гімнастычнай лаўцы». Для ацэнкі выніку выкарыстоўваецца вымяральная лінейка, прымацаваная вертыкальна да гімнастычнай лаўкі. Вучань прымае зыходнае становішча, «пяткі і наскі ног разам». Наскі не выходзяць за край гімнастычнай лаўкі. Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Не дапускаецца згінанне ног у каленных суставах. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнёных (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Дадатак 3

ГАДЗІНА ЗДАРОЎЯ І СПОРТУ

(35 вучэбных гадзін)

БАСКЕТБОЛ

Вучэбны матэрыял

Тэхніка-тактычныя дзянні. Вызначэнне прыёму, спосабаў выканання і яго разнавіднасцяў. Стойкі гульца, перамяшчэння, прыпынкі, трыманне і лоўля мяча, перадачы, вядзенне, кідкі па кальцы. Індывідуальныя дзеянні ў нападзе і абароне. Персанальная абарона.

Аматарскі і прафесійны баскетбол і яго відовішчнасць. Арганізацыя і правядзенне аматарскіх спаборніцтваў па баскетболе. Прафесійныя падыходы да баскетбола. Этыка гульца. Правілы паводзін на гульнях у якасці заўзятара. Лепшыя гульцы свету, краіны і рэгіёну і іх дасягненні.

Паўтарэнне вывучанага матэрыялу: перамяшчэнні гульца (хада, бег, скачкі, павароты, прыпынкі); лоўля мяча адной і дзвюма рукамі; вядзенне мяча без зрокавага кантролю са зменай напрамку і хуткасці; перадачы мяча на месцы і ў руху; перадачы мяча пры сустрэчным руху; кідкі мяча па кальцы з месца адной рукой ад пляча з блізкай і сярэдняй дыстанцыі; кідкі ў руху, штрафны кідок; спыненне крокам і скачком пасля вядзення і перадач мяча; шчыльная апека гульца з мячом і без мяча; выбіванне і вырыванне мяча; персанальная абарона.

Лоўля мяча, які высока ляціць: на месцы, у скачку, у руху.

Перадачы мяча на месцы і ў руху, сустрэчныя перадачы ў парах; у тройках; у калонах па паветры і з адскокам ад падлогі. Вядзенне мяча без зрокавага кантролю са зменай напрамку і хуткасці: на месцы і ў руху, навучанне паваротам. Кідкі мяча па кальцы: з месца (адной рукой ад пляча з сярэдняй і далёкай дыстанцыі; пасля перамяшчэнняў, паскарэнняў, скачкоў); у руху (кідок адной рукой знізу, дзвюма рукамі знізу; атака карзіны па дузе пасля вядзення і двух крокаў; атака пасля двух крокаў сходу); у скачку (пасля прыпынку скачком, крокам). Фінты і спалучэнні прыёмаў: фінт на праход – праход; вядзенне – паварот – кідок; фінт на праход – вядзенне – паварот – кідок; фінт на праход – фінт на кідок – праход – кідок. Накрывание мяча: у парах на месцы і ў руху. Перахоп мяча ў гульнявых заданнях. Дзеянні гульца без мяча: выхад на свабоднае

месца для атрымання мяча; выхад для адцягнення ўвагі. Індывідуальныя дзеянні гульца з мячом: выхад з атрыманнем мяча – перадача на кідок мяча; выхад з атрыманнем мяча – кідок мяча; выхад з атрыманнем мяча – праход з вядзеннем мяча.

ВАЛЕЙБОЛ

Вучэбны матэрыял

Тэхніка-тактычныя дзянні. Асаблівасці выканання гульнявых прыёмаў (стоек, перасоўванняў, перадач, падач, нападальнага ўдару). Індывідуальныя дзеянні ў нападзенні і абароне. Групавыя ўзаемадзеянні ў нападзе і абароне.

Аматарскі і прафесійны валейбол і яго відовішчнасць. Арганізацыя і правядзенне аматарскіх спаборніцтваў па валейболе. Прафесійныя падыходы да валейбола. Этыка гульца. Правілы паводзін на гульнях у якасці заўзятара. Лепшыя гульцы свету, краіны і рэгіёну і іх дасягненні.

Паўтарэнне вывучанага матэрыялу: стойкі; перамяшчэнні (хада, прыстаўныя крокі, двайны крок, скачок, бег, скачкі, прыпынкі пасля перамяшчэнняў); перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы і пасля перамяшчэнняў, са зменай напрамку; перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы і пасля перамяшчэнняў, са зменай напрамку; падача ніжняя прамая на дакладнасць; падача верхняя прамая на дакладнасць.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы: з розных зыходных палажэнняў (седзячы, з прыседу), пасля розных практыкаванняў (ўпор прысеўшы – упор лежачы – выскачыць), з ударам аб сцяну, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху пасля перамяшчэнняў: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі, у пары, у пары з адскокам ад падлогі, над сабой (з адскокам ад падлогі і без), групавыя практыкаванні: з пераменай месцаў.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы: з розных зыходных палажэнняў (седзячы, з прыседу), пасля розных практыкаванняў (паварот на 360), з ударам аб сцяну, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу пасля перамяшчэнняў: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі, у пары, у пары з адскокам ад падлогі, над сабой (з адскокам ад падлогі і без), групавыя практыкаванні: з пераменай месцаў. Перадача мяча дзвюма рукамі зверху са зменай напрамку: перадача ў тройках, чацвёрках, па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу, са зменай напрамку: перадача ў тройках, чацвёрках, па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху праз сетку (на месцы і пасля перамяшчэння): перадачы ў розных спалучэннях (пасля перадачы над сабой зверху (знізу) – партнёру, пасля павароту на 360, пасля дотыку да сеткі), з рознй адлегласці ад сеткі (кароткая, доўгая); перадача з перамяшчэннем у калоне (калоны размешчаны праз сетку), у парах выкананне перадачы з прасоўваннем ўздоўж сеткі.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу праз сетку (на месцы і пасля перамяшчэння): перадачы ў розных спалучэннях (пасля перадачы над сабой зверху (знізу) – партнёру, пасля павароту на 360, пасля дотыку да сеткі), з рознай адлегласці ад сеткі (кароткай, доўгай); перадача з перамяшчэннем у калоне (калоны размешчаны праз сетку), у парах выкананне перадачы з прасоўваннем ўздоўж сеткі.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху ў скачку: імітацыі, практыкавання з нерухомым мячом, з уласнага падкідвання, з накідвання партнёра.

Падача верхняя прамая: спаборніцтвы на выкананне ўстаноўленай выкладчыкам колькасці падач, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат, падачы ў блізкую частку пляцоўкі, падачы ў далёкую частку пляцоўкі, падачы ў левую частку пляцоўкі, падачы ў правую частку пляцоўкі, падачы на дакладнасць у зону.

Падача ніжняя прамая: спаборніцтвы на выкананне ўстаноўленай выкладчыкам колькасці падач, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат, падачы ў

блізкую частку пляцоўкі, падачы ў далёкую частку пляцоўкі, падачы ў левую частку пляцоўкі, падачы ў правую частку пляцоўкі, падачы на дакладнасць у зону.

Нападальны ўдар: практыкаванні для засваення разбегу, наскоку, практыкаванні для засваення ўдарнага руху, імітацыя прыёму, практыкаванні з нерухомым мячом, выкананне нападальнага ўдару з накідвання настаўніка і партнёра, практыкаванні з уласнага падкідвання.

Прыём мяча з падачы: у парах на бакавых лініях, прыём падачы, пары размешчаны праз сетку ў трох метрах ад сеткі, у шасці метрах ад сеткі, прыём мяча ў парах, адзін размешчаны на задняй лініі, насупраць выконваюцца падачы (сілавыя, якія плануюць, з рознай траекторыяй) з месца падачы.

Змена напрамку перадач: перадача ў тройках па зонах (напрыклад, з зоны 5 у зону 3, з 3 у 4, з 4 назад у 5).

Падача ва ўстаноўлены квадрат, у пэўную зону пляцоўкі: падачы на дакладнасць у зону, спаборніцтвы на дакладнасць траплення ў вызначаны квадрат.

Пры выкананні нападальных удараў: выбар спосабу адбівання мяча праз сетку, імітацыя атакавальнага ўдару і перадача («падман») на бок суперніка дзьвюма рукамі, імітацыя атакавальнага ўдару для адцягнення увагі суперніка.

Ўзаемадзеянне паміж гульцамі пярэдняй лініі: гулец зоны 3, выконвае перадачу ў зону 4 ці 2, калі злучны будзе знаходзіцца ў зоне 2.

Ўзаемадзеянне паміж гульцамі пярэдняй і задняй лініі: той, хто прымае падачу (нападальны ўдар), накіроўвае мяч гульцу ў зону 3, які выконвае перадачу ў зону 4 або 2.

Выбар месца пры прыёме падачы: выхад пад мяч у залежнасці ад кірунку палёту мяча.

Выбар спосабу прыёму падачы: у залежнасці ад траекторыі і хуткасці палёту мяча прыём падачы выконваць дзьвюма рукамі зверху, альбо дзьвюма рукамі знізу.

Ўзаемадзеянне гульцоў, якія прымаюць падачу, са «злучным» гульцом: які прымае падачу (нападальны ўдар) накіроўвае мяч гульцу ў зону 3, калі злучны будзе знаходзіцца ў зоне 2, то гулец, які прымае падачу (нападальнік ўдар), павінен выканаць даводку мяча ў зону 2. Прыём з падачы ў зону 3 для перадачы: той, хто займаецца, размяшчаецца ў зоне 6 (5, 1), падачай мяч накіроўваюць гульцу, які павінен выканаць даводку ў зону 3.

Страхоўка гульца, які прымае падачу: кожны гулец павінен быць гатовы падстрахаваць партнёра, які прымае падачу, асабліва каля бакавых ліній. Гулец, які не валодае прыёмам, у крытычныя моманты гульні выключаецца наогул. Пры гэтым зоны дзеянняў перараз мяркоўваюцца паміж іншымі гульцамі. Тры гульцы размешчаны на задняй лініі, адзін каля сеткі, падачу прымае адзін гулец, астатнія страхуюць (прыём гульца зоны 1 – страхуе гулец зоны 6, прымае гулец зоны 6 – страхуюць гульцы зон 1 і 5, прыём гульца зоны 5 – страхуе гулец зоны 6). Пры правядзенні навучальных гульняў ўжываць вывучаныя тэхніка-тактычныя дзеянні.

ГАНДБОЛ

Вучэбны матэрыял

Тэхніка бяспекі падчас заняткаў гандболам. Выкананне патрабаванняў пры падрыхтоўцы абсталявання і інвентара да факультатыўных заняткаў. Падрыхтоўка гульнявога поля і пляцовак да заняткаў. Прафілактыка траўматызму. Аказанне першай даўрачэбнай дапамогі пры ўдарах, ранках і іншых найбольш тыповых траўмах гандбалістаў. Медычны кантроль: рэгулярнасць праходжання медаглядаў, допуск да заняткаў і ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах.

Тэхніка-тактычныя дзянні гульцоў абароны і нападу.

Гульнявыя дзеянні ў гульні 2 на 3, 3 на 4, 3 на 2, 4 на 3 гульцы. Перадача мяча насуперак двух абаронцаў, у адрыў з выхадам адзін на адзін з варатаром.

Тэхніка-тактычныя дзеянні: фінт – абыход, адбор – фінт – кідок па варотах, стварэнне колькаснай перавагі, падманныя дзеянні без мяча і з мячом, гульня двух

нападальнікаў супраць трох абаронцаў, гульня трох нападальнікаў супраць двух абаронцаў, заслон, барацьба за выгадную пазіцыю.

Падманныя дзеянні (паскарэнні, развароты і да т. п.) без мяча і з мячом; жангліраванне мячамі, папераменна правай і левай рукой; вядзенне мяча з перадачамі ў парах папераменна правай і левай рукой у высокім тэмпе і з паскарэннямі; перадачы мяча правай і левай рукой, у скачку, з апоры пры паралельным і сустрэчным руху; у парах і тройках, спыненне мяча, які коціцца правай і левай рукой з наступнай перадачай; лоўля мяча левай рукой, правай рукой, дзьвюма рукамі, кідок па варотах у скачку з апоры; кідкі правай і левай рукой па нерухомым і мячы, што коціцца з трапленнем у вароты з сярэдняй і далёкай дыстанцыі; кідкі па варотах з лініі, з кута, сяміметровыя кідкі.

ФУТБОЛ

Вучэбны матэрыял

Тэхніка-тактычныя дзянні гульцоў абароны і нападу. Гульнявыя дзеянні ў гульні 2 на 3, 3 на 4, 3 на 2, 4 на 3 гульцы. Перадача мяча насуперак двух абаронцаў, у адрыў з выхадам адзін на адзін з варатаром. Тэхніка-тактычныя дзеянні: адбор – абводка – перадача, адбор – абводка – удар па варотах, стварэнне колькаснай перавагі, падманныя дзеянні без мяча і з мячом, гульня двух нападальнікаў супраць трох абаронцаў, гульня трох нападальнікаў супраць двух абаронцаў, заслон варатара, барацьба за выгадную пазіцыю.

Практыка судзейства гульні ў футбол. Судзейства гульні ў якасці сакратара, памочніка суддзі ў полі, бакавога суддзі, суддзі ў полі.

Гульня ў футбол, удзел у спаборніцтвах. Гульня на стандартным полі поўнымі складамі. Удзел у матчавых сустрэчах, першынствах ўстановы адукацыі, рэгіянальных турнірах.

Правілы гульні. Падманныя дзеянні (паскарэнні, развароты і да т. п.) без мяча і з мячом.

Жангліраванне мячом адной нагой, папераменна правай і левай нагамі, па чарзе нагой і галавой.

Вядзенне з перадачамі мяча ў парах папераменна правай і левай нагой у высокім тэмпе і з паскарэннямі.

Перадачы мяча правай і левай нагой, галавой пры паралельным і сустрэчным руху.

У парах і тройках спыненне мяча, які коціцца правай і левай нагой з наступнай перадачай.

Спыненне нагой і грудзьмі мяча, які ляціць з наступным ударам па варотах.

Удары правай і левай нагамі па нерухомым і мячы, што коціцца сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском з пападаннем у вароты з сярэдняй і далёкай дыстанцыі.

Удар па варотах галавой пасля падачы са штрафнога і вуглавога ўдару.

Тэхніка-тактычныя звязкі ў парах, тройках, чацвёрках: вядзенне-перадача, прыём-перадача, прыём-вядзенне-перадача, вядзенне-удар па варотах, прыём-удар па варотах, прыпынак-перадача.

Гульня варатара: лоўля і адбіванне мяча рукамі стоячы на месцы і ў руху, лоўля мяча рукамі ў падзенні, увядзенне мяча ў гульню кідком адной рукой, ударам нагой па нерухомым мячы і пасля накідвання.

Эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча ў максімальна хуткім тэмпе.

Увядзенне мяча ў гульню кідком дзвюма рукамі з-за бакавой лініі. Гульня ў футбол 6 на 6, 8 на 8 гульцоў і поўнымі складамі.